Уладзімір Казлоў

# РАДЗІМА




34 MAG. NET

# Уладзімір Казлоў. Радзіма

## Змест:

Бергман ____ 4
Вакацыі ____ 9
Свята строя і песні ____ 12
1987 ____ 22
Радзіма ____ 36
Вяртанне ____ 51
Паўднёвы Захад ____ 57
Матэматыка ____ 75
Лета дзевяць адзін ____ 91
Маёр ____ 100
Брэсцкая крэпасць ____ 110
Ламбада ____ 121
Напярэдадні іспытаў ____ 135
Палітыка–1997 ____ 141
Сустрэча ____ 147

## Бергман

Не ведаю, нашто мне патрэбен быў гэты Бергман. Тым больш ісці глядзець яго фільм у відэасалон. За тры дні да апошняга званка ў школе. У мяне няма сяброў, няма дзяўчыны, і я ў поўнай дупе.

У кіно я саромеўся хадзіць. Таму што заўсёды адзін. А калі прыйшоў, то сесці трэба бліжэй да выйсця, каб калі скончыцца – першым на вуліцу, пакуль ідуць канцавыя цітры і ў зале запальваецца цьмянае святло. Каб ніхто не бачыў, што я адзін.

Я прачытаў у газеце, што ў цэнтры адкрыўся відэасалон з кабінкамі. На чатыры чалавекі. Але можна і аднаму прыйсці. Заплаціў за фільм – і глядзі сабе ў кабінцы. Упершыню я зайшоў туды тыдзень таму. Проста праходзіў міма.

Шмат касет на паліцах. І цётка сядзіць. Дакладней, жанчына. Ці цёця. Але не цётка, не. Ёй гадоў трыццаць пяць, а, можа быць, трыццаць. Заўсміхалася. Што жадаеце паглядзець, малады чалавек?

А гэта… Бергман у вас ёсць? Ах, як прыемна, калі пытаюць Бергмана. Ці Феліні. Ці Таркоўскага. Ах, гэта бывае так рэдка. На жаль. Густы дэградуюць. Інтэлектуальная праслойка звужаецца. Пралетарскі горад – што з яго ўзяць? Гэта ж не Масква і не Піцер. Ах, як шкада – узяў хтосьці касету дахаты, няма яе. Можа быць, штосьці іншае паглядзіце? Феліні, Таркоўскага?

Не, дзякуй. Я лепш у наступны раз. Да сустрэчы. Усяго

добрага. Добрага. Усяго. З восьмым сакавіка вас і з новым годам, і з астатнімі святамі. Пляснулі дзверы – забыўся прытрымаць.

І зноў тая ж самая цёця. Пазнала. Адклала ўбок кнігу, загорнутую ў паперу. І заўсміхалася, і расплылася, і засвяцілася. Ах, вядома ж, памятаю – памятаю вас, малады чалавек. Як прыемна, калі пытаюць Бергмана, ах, як рэдка гэта бывае, ах, як прыемна. Так, вярнулі. Доўга трымалі – культурныя людзі: дырэктар трэцяй школы з жонкай. Збіраюцца ў Ізраіль, дарэчы. Зараз, хвілінку.

Афіша. На сцяне. Сёння ў відэазале. “Камандас” (у галоўнай ролі Арнольд Шварцнэгер). Яна вяртаецца. З касетай. Глядзіць на афішу. На жаль. Даводзіцца паказваць шырспажыў. Мы на дзяржразліку.

Дзверы. Адчыняюцца. Чацвёра пацаноў. Сінія спартовыя штаны з белымі лампасамі. Значыць – “піянеры”. У “піянераў” белыя лампасы, у “касманаўтаў” – чырвоныя. Я не нашу такіх, вядома ж, і яны не ведаюць, адкуль я. Можа, пранясе.

Глядзяць на мяне. На афішу. Шварц! Класна. Заябіся. Паглядзім Шварца.

Цёця моршчыцца і крывіць вусны ледзь-ледзь: ах, мярзота. Усміхаецца мне. Хмурна глядзіць на іх: пачакайце, хлопцы. І зноў на мяне. Зноў усміхаецца. Другая кабіна. Прыемнага прагляду.

Дзякуй. Іду па калідоры. Нумар два. Уваходжу. Зачыняю дзверы. Завешаныя вокны. Фатэлі, як у нас дома. Душна.

Пах пылу. Экран свеціцца, але на ім яшчэ нічога няма.

Крокі. Бягуць. Уваходзяць. З якога раёна? Ладна, не важна. Давай, паглядзім спачатку. Што гэта за халера? Ты што, пацан? Што гэта такое глядзіш? Думаеш – разумны, а мы дурні, так? Думаеш, ты адзін разумны? Грыша, ёбні яму. Яшчэ. Яшчэ раз. І капейкі. Сюды. Хутчэй. Пацаны, не трэба. Трэба, Федзя, трэба. Ну, пацаны, ну, калі ласка... Яшчэ яму. Усё забраў? Колькі? Трыццаць пяць. І ўсё? Так. Добра, яшчэ раз – і пайшлі, а то Шварц зараз пачнецца. Глядзі сваю парашу.

Самі сваю глядзіце, казлы. Мне ўжо не да фільма. Які тут можа быць Бергман? На хуй ён патрэбен? Ён памёр. Напэўна. Ці не? Адкуль я ведаю? Хутчэй за ўсё, памёр. А я жывы, і лепш бы я памёр, халера. Я кончаны чалавек. Няма сяброў, няма дзяўчыны. Бацькі не разумеюць. У школе маразм і нічаму не вучаць. Не паступлю нікуды. У войска. А там – гамон ад такіх вось, як гэтыя вылюдкі.

Раней я марыў. Я ўмеў марыць. Думаў, што скончу школу і з'еду на хер з нашага смярдзючага горада. Паступлю вучыцца ў Маскву. А цяпер разумею, што не. Што нікуды не паступлю. Нікуды не з'еду. Застануся назаўжды ў гэтай дупе. Паступлю ў мясцовы інстытут – у лепшым выпадку. Скончу. Стану інжынерам. На сотню рублёў. Піздзец. Што гэта за жыццё?

Пайшло ўсё ў дупу. Зараз ад нуды падрачу проста ў кабіне і сыйду. Скажу ёй – выбачайце, фігня атрымалася. Не патрэбен мне Бергман. Усё гэта панты былі, пазёрства. Быццам бы культурны. Быццам бы адукаваны. А сам сядзіць у ка-

бінцы і дрочыць, не гледзячы на экран і не слухаючы. Забіў на ўсё.

Дзверы. Адчыняюцца. Адхопліваю руку. Яна. Усміхаецца. Ну, як вам фільм? Цудоўна. Проста выдатна. Выдатна. Ашаламляльна. Афігіцельна. Лайно. Лайно поўнае, але гэта не праўда. Я не ведаю, як мне фільм, таму што я не гляджу яго. І не чую, што кажуць героі. Я выключыў рэцэптары. Я апускаюся ў сваё лайно. Я тану. Так што сыходзь адсюль, няма чаго табе тут рабіць, не замінай мне драчыць. І кайфаваць. І пырскаць малофьяй на вашыя пратухлыя фатэлі.

Блядзь! Край кашулі, які прыкрываў чэлес. Ссунуўся. Яна глядзіць. Усміхаецца. Становіцца на калені. Бярэ ў рот. Яна, напэўна, ахуела. А што, калі гэтыя прыдуркі, якія “Камандас”? Яны ж нас абаіх у дупу выебуць. А, добра, насраць...

Глядзіць на мяне. Усміхаецца сумна. Мне трыццаць сем гадоў. Не замужам. І не была. Падала дакументы ў Ізраіль. Спадзяюся, хутка. Сумна жыць. Да жудасці. Нічога цікавага. Толькі фільмы. Але гэта адно толькі фільмы. Не трэба баяцца. Расслабся. Ніхто не прыйдзе. Ніхто не перашкодзіць. Добра. Добра. Давай. Дзейнічай. Наперад.

Гляджу на экран. Там нічога. Шэрыя кропкі. Штосьці з касетай ці з тэлевізарам. Якая розніца? Пайшло ўсё ў дупу. Дзіўная яна. Напэўна, ебанутая. Занадта шмат фільмаў глядзела. А раптам яна ўсім так робіць? А раптам у яе трыпер? А калі гэтыя, якія “Каманда”? Добра. Усё ў дупу. Усё. У дупу. Усё. Усё. Усё...

Дзякуй. Калі ласка. Дзякуй. Калі ласка. І да пабачэння. А як жа фільм? Заўтра. Ці ў суботу. Ці не. У суботу – не. У суботу – апошні званок. Потым. Калі-небудзь. Дакладней, ніколі. Спадзяюся. Усё.

*

Вуліца. Ужо цямнее. Парачкі. Прыкідваюцца, што закаханыя. Хуй. Мяне не наябеш. Я ўсё пра вас ведаю. Цяпер я ўсё пра вас ведаю. Нейкі пацан – сапраўдны вырадак. А баба з ім – нічога. Вітаю, людзі. Цыгарэткай не пачастуеце? А запалкі? Так, можна запальніцу. Яшчэ лепш. Класна. Дзякуй. А вы дзяўчына, як наконт адсмактаць у мяне? Прама зараз. Вось у тым пад'ездзе. Не, не падалося. Усё правільна. Дык што? Добра, жартую. Дзякуй за запальніцу. Пакуль. Прыемных палюцый.

Мужык. Самотны. Такі ж, як я. Прывітанне, мужык. Ты куды? Так, гуляю. Малайчына. Выдатна. Пайшлі вып'ем гарэлкі. Пайшлі. За твае грошы. Пайшлі. А баб? Пайшлі. Усё нармуль. А адсмокчуць? Пайшлі. Кажу, пайшлі – значыць, пайшлі. У мяне ў суботу апошні званок. Ведаю. Да суботы вернешся. Усё будзе хакей.

## Вакацыі

Ура! Вакацыі! Тры месяцы! Учора быў апошні дзень заняткаў, але гэта нават і не заняткі былі. Проста прыходзілі два пляшывыя дзядзькі і тоўстая цётка адбіраць вучняў у школу для дэбілаў на наступны год. Пыталіся табліцу множання, шасцю восем шэсцьдзесят чатыры (ці не?), чым адрозніваецца бык ад трактара, і што цяжэй – кілаграм хлеба ці кілаграм цукру. Але каго абралі, яны не сказалі, скажуць потым. А пакуль можна гуляць у футбол і ў грошы, і дапальваць бычкі, і шпурляць камянямі ў цяг-нікі, каб разбіць шкло, і адлоўліваць і вешаць чорных катоў, і шмат-шмат-шмат усяго астатняга.

Заўтра ўстану позна-позна і выйду на гаўбец, і зірну ўгору на сіняе-сіняе неба, і плюну на лысіну суседа знізу, які робіць зарадку на сваім гаўбцы, і ён закрычыць што гэта за халера, дождж ці што?

А я пабягу ў прыбіральню сцаць, пажру на кухні – і на вуліцу, каб паспець залезці за яблыкамі ў сад да Вырадка, пакуль ён не вярнуўся з базара. Яблыкі яшчэ зялёныя і нясмачныя, але затое рваць іх у Вырадкавым садзе – кайф, а самы кайф – гэта бачыць яго морду потым, калі ён зразумеў, што яблыкаў няма: усё абарвалі.

А потым – на кар'ер купацца, хоць там вада і рыжа-бура-малінавая з-за хімкамбіната і клейзавода, на якім робяць з костак угнаенні, і там ёсць яшчэ пацукі па паўметра ростам, і іх можна біць палкамі, але цяпер неяк лянота. Якія яшчэ пацукі? Не да пацукоў тут.

Шкада, што баб на кар'еры амаль няма, а тыя, што ёсць, купацца не ходзяць – сцыкухі. Разаслалі коўдры і ляжаць дагары сракамі. І колькі ты да іх не падыходзь – маўляў, дзяўчынкі, хадзем купацца, – зробяць калгасныя рожы: мы не купаемся, і нам і тут добра, быццам такія прыстойныя і цэлкі. Але мяне вы наябеце, калі я сраць сяду. Я пра вас усё ўжо ведаю, хто з кім, і калі, і куды.

А пасля кар'ера пайду дахаты жэрці, пакуль яшчэ нікога няма, а то пачнуць мне маралі чытаць, што трэба дома па вечарах сядзець, а не швэндацца, дзе заўгодна, і што гэта ў цябе за кампанія і такія сябры ні да чаго добрага цябе не прывядуць, і сядзеў бы ты лепш дома і кніжкі чытаў – вунь колькі ў спісе літаратуры на лета, а ты?

Я? Што я? Я нічога, лепш бы вы мне паменш мазгі пярдолілі, а то я наогул тады дахаты жэрці не пайду, скраду што-небудзь з крамы. Галоўнае – не трапіцца прадавачкам, а то адпіздзяць швабрамі і здадуць мянтам, а мянты – наогул усе казлы і шакалы, ну пра іх і казаць няма чаго.

А ўвечары – праз плот і на дыскатэку, дзе ўсе свае і ніхто не будзе дакалупвацца, што, маўляў, скуль вы прыперліся, малыя.

Нас свае пацаны яшчэ ў тым годзе абяцалі пусціць на групавуху да Наташкі, але потым самі не пайшлі, перадумалі, а, можа, нас не захацелі браць – маўляў, малыя яшчэ, рана.

А мы нічога не малыя і задзіралі бабам спадніцы пасля дыскатэкі шмат разоў і мацалі іх, але бабы могуць

апынуцца не адны, а з пацанамі, і тады трэба ўёбываць, а то іхнія пацаны, асабліва калі бухія, так адчмыраць, што потым тыдзень будзе не да дыскатэк, нават драчыць і тое не захочацца. А ўсё з-за баб, сук паскудных.

Дыскатэка скончыцца, але дахаты ісці яшчэ рана - яшчэ толькі дванаццаць, - і значыць, можна яшчэ палазіць па парку, пашукаць, дзе цалуюцца і ябуцца, і спужаць, і камянямі закідаць, але крый божа нарвацца на пацаноў, якія адны і без баб, і таму сядзяць сумныя і бухаюць.

А перад сном забяжым яшчэ раз у сад да Вырадка – сказаць дабранач. Ён сад вартуе, ходзіць па ім са стрэльбай, і мы крыкнем яму дабранач, Сяргей Сцяпаныч, не засні, а то сад табе спалім, а ён закрычыць – сыходзьце адсюль, нягоднікі, я жартаваць не буду.

І ўсё, цяпер – дахаты, спаць. А заўтра – усё тое ж самае.

## Свята строя і песні

У канцы лютага, перад 23-м, у школе праводзілі “свята строя і песні”. Кожны клас, з першага па сёмы, рабіў сабе “вайсковую” форму і строем праходзіў па спартзале з крычалкай і песняй. За двума сталамі ў куце спартзалы сядзелі завуч, дырэктар, ваенрук і намстарш прафкама завода шын – нашых шэфаў. Яны размяркоўвалі месцы.

Класы з першага па трэці спаборнічалі асобна. У мінулым годзе наш клас, тады 2-гі “б”, заняў другое месца, а ў гэтым мы спадзяваліся стаць першымі: леташні пераможца, 3-ці “в” клас стаў цяпер 4-м “в” і ўдзельнічаў у конкурсе са старэйшымі. А летась яны занялі першае месца не толькі ў школе, але і на раённым конкурсе, а на агульнагарадскім – другое, і дырэктар заўсёды прыводзіў іх у прыклад іншым класам.

Наша настаўніца Валянціна Пятроўна – брыдкая, рана пастарэлая (яна была тады не старэйшая за трыццаць, але твар увесь ў зморшчынах) – вельмі хвалявалася: а раптам не атрымаецца, і мы не зоймем першае месца ў школе? Ці, яшчэ горш, зоймем, але потым зганьбімся на “раёне”?

Мы пачалі рыхтавацца да конкурсу ў канцы студзеня. Бацькі Веры Сапрыкінай дасталі праз знаёмых у тэатральным гуртку будзёнаўкі і чырвоныя палоскі, каб прышыць на кашулі. Вывучылі песню:

*Белая армия, черный барон*
*Снова готовят нам царский трон*
*Но от тайги до Британских морей*

Потым пачалі рэпетаваць. Кожны дзень пасля ўрокаў Валянціна Пятроўна ішла даведвацца, ці ёсць урок у спартзале, і калі ўроку не было, мы ўсім класам ішлі туды і маршавалі з крычалкай і песняй. Часам Валянціна Пятроўна запрашала настаўніцу фізкультуры, Ксенію Філімонаўну, пасачыць за тым, як мы маршуем.

Дзён за дзесяць да конкурсу Валянціна Пятроўна арганізавала "чыстку": прыбрала тых, хто мог сапсаваць выступ класа.

Цыганкоў, цябе на конкурс небяспечна браць: прыйдзеш яшчэ, чаго добрага, у бруднай кашулі ці палоскі забудзешся прышыць. І ты, Журавін, тое ж самае.

Цыганкоў быў маленькі худзенькі непрыкметны пацан. Ён быў самым малодшым у шматдзетнай сям'і, якая жыла ў прыватнай хаце за шынным заводам. Мянушка ў яго была Сцуль: ад Цыганкова па раніцах часта смярдзела мачой, і ўсе разумелі, што ён уначы сцаўся ў ложак. Акрамя таго, ён часта прыходзіў у школу ў бруднай кашулі. Звычайна гэтага не заўважалі, але калі мы распраналіся перад фізрой у вузенькай смярдзючай каморцы, і ён вешаў сваю кашулю на крук, бачная была брудная палоска на каўняры. Я не зваў Цыганкова "Сцуль" толькі таму, што сам перастаў сцацца ў ложак ужо ў другім класе.

Другі няўдачнік, Журавін, адседзеў па два гады ў першым і ў другім, і сядзеў цяпер другі год у трэцім. Яму ўжо было дванаццаць ці трынаццаць. Жура быў касавуры, і рот у яго заўсёды быў адкрыты, але ён лічыўся першым хуліганам, паліў і значыўся на ўліку ў дзіцячым пакоі міліцыі.

Апроч іх, Валянціна Пятроўна з падказкі Ксеніі Філімонаўны не ўзяла Каркунову – тоўстую непрыкметную троечніцу, якая ніяк не магла патрапіць у нагу – і мяне. Я быў высокі і нязграбны і маршаваў кепска. Валянціна Пятроўна доўга раілася з Ксеніяй Філімонаўнай – я чуў, як яны прамаўлялі маё прозвішча. Валянціну Пятроўну, відаць, бянтэжыла, што я добра вучыўся. Але, урэшце, яна, відаць, вырашыла, што інтарэсы ўсяго класа – а то і ўсёй школы, калі патрапім на "раён" – важнейшыя за мае інтарэсы.

Я расстроіўся і прыйшоў дахаты сумны. Калі я ўвечары распавёў пра ўсё бацькам, мама сказала:

– Давай, я пайду ў школу і пагавару з гэтай дурніцай.

Але тата яе пераканаў не ісці.

– Ты яе толькі супраць Сярожы настроіш, – сказаў ён. – За конкурс жа адзнака не ставіцца, а ўсе адзнакі залежаць ад яе.

Хутка я зразумеў, што нічога не страціў, а наадварот толькі выйграў. Пасля ўрокаў мне не трэба было больш перціся ў спартзалу і маршаваць, як дэбіл. Замест гэтага я ішоў дахаты, пераапранаўся, уключаў тэлевізар ці радыёлу, абедаў, потым сядаў рабіць урокі і стараўся зрабіць іх хутчэй, каб потым гуляць са сваім канструктарам ці маляваць у сшытках.

Калі да свята застаўся тыдзень, дзеля падрыхтоўкі ахвяравалі нават урокамі. Калі спартзала была вольная ўжо на першым уроку, Валянціна Пятроўна задавала заданне, і клас ішоў рэпетаваць. Мы – чацвёра "няўдачнікаў" –

таксама ішлі разам з усімі, а потым, пакуль астатнія маршавалі, сядзелі на доўгіх аблезлых драўляных лаўках ля сцяны і глядзелі, як яны маршуюць. Валянціна Пятроўна заўсёды псіхавала.

– Ну, што гэта такое? – раўла яна. – Як вы прайшлі? Як вы праспявалі? Гэта ж сорам. Хочаце мяне зганьбіць, настаўніцу сваю? Перад усёй школай? Мне іншым настаўнікам у вочы будзе сорамна глядзець, калі мы не зоймем першае месца.

*

– Сёння рэпетуем два ўрокі – другі і трэці. Спартзала будзе вольная, – сказала Валянціна Пятроўна адразу пасля званка.

Клас закрычаў:

– Ура!

Амаль усім падабалася, што замест урокаў клас рыхтаваўся да конкурсу. Мне было ўсё адно і нават трохі крыўдна: я сумленна вучыў урокі, а іх ніхто не правяраў.

– Пайшліце гуляць на другім уроку, – сказаў мне і Цыганкову Жура. – Хай яны ходзяць, хоць абасруцца.

Мы сядзелі ўтрох на лаўцы. Каркуновай не было – захварэла.

– А калі заўважыць, што нас няма? – спытаў я.

– Не сцы, не заўважыць.

Цыганкоў нічога не сказаў, проста пайшоў з намі. З ім ні-

хто не сябраваў і нікуды з сабой не клікаў, і ён, пэўна, быў рады, што Жура паклікаў і яго.

– Пайшліце спачатку паглядзім – можа, булачкі ў буфет прывезлі. Тады можна спіздзіць, – сказаў Жура.

Буфет быў побач са сталовай, на трэцім паверсе. Сталовую я ненавідзеў за тое, што там нас прымушалі есці ліпкую нясмачную размазню маннай кашы ці вадзяністае бульбяное пюрэ з друзлым салёным агурком. А аднойчы Іванькоў з "в"-класа знайшоў у катлеце прусака, і ўся сталовая збеглася глядзець на яго, а Ленку Выхіну з нашага класа званітавала – проста на стол.

Затое ў буфеце, акрамя выкладзеных на вітрыне засохлых бутэрбродаў з сырам, прадаваліся і ўсякія смачныя рэчы – напрыклад, піражкі з павідлам па пяць капеек. Праўда, іх завозілі рэдка, а, калі завозілі, выстрайвалася велізарная чарга, і піражкоў хапала не ўсім. Але нават калі піражкоў не даставалася, былі яшчэ булачкі з макам, коржыкі і цукровыя крэндзелі. І ўсё гэта неслі на трэці паверх ад чорнага ходу, да якога пад'язджала машына з хлебазавода, прама па лесвіцы, таму што грузавога ліфта ў школе не было. Буфетчыца Вольга Барысаўна – старая сухая цётка – звычайна клікала на дапамогу адну з пасудамыек, і яны ўдзвюх валаклі кош з піражкамі і коржыкамі на трэці паверх, імкнучыся зрабіць гэта падчас уроку, каб не спрабавалі выкрасці што-небудзь з кошыка.

Нам пашанцавала. Унізе толькі што разгрузілі машыну, і Барысаўна з пасудамыйкай у брудным фартуху неслі наверх кош з булачкамі.

– Падбягаем, хапаем па дзве – і ўніз, – закамандаваў Жура.

– Ах вы, ёб вашу, пазабіваю! – крыкнула пасудамыйка, але за намі не пагналася. Мы выскачылі на ганак, забеглі за кут і сталі, душачыся, есці булачкі.

– Паліць будзеце? – спытаў Жура, калі мы даелі.

– Я буду, – сказаў я.

– А ты, Сцуль?

– Я таксама.

Жура выцягнуў з кішэні мяты пачак "Прымы" і даў нам па цыгарэце, потым дастаў запальніцу і прыпаліў нам і сабе. Я трымаў цыгарэту ў роце, не ведаючы, што трэба з ёй рабіць.

– Ты давай, цягні, хулі яна ў цябе там сама гарыць? – Жура засмяяўся.

Я пацягнуў і закашляўся. Паглядзеў на Цыганкова – ён паліў, як Жура, зацягваючыся і выпускаючы дым. У мяне так не атрымлівалася.

– Пайшліце цяпер у краму, батон спіздзім, – сказаў Жура.

– А ты што, булачкамі не наеўся? – спытаў я.

– Не-а.

– Можа, апранемся ў гардэробе?

– Ну, вы апранайцеся, калі хочаце, а мне і так не халодна.

Мы таксама не пайшлі апранацца, засталіся, як былі – у касцюмах і тапках.

У краме Жура шапнуў нам:

– Вучыцеся, бля, дзеці.

Ён неўзаметку сунуў батон пад куртку і спакойна прайшоў міма касы і выйшаў на вуліцу. Мы выскачылі за ім.

– І часта ты гэта робіш? – спытаў я.

– Заўсёды, – Жура зарагатаў. – Зразумеў, Сцуль? Гэта табе не ў ложак сцацца.

Я падумаў, што Цыганкоў пакрыўдзіцца, але ён нічога не сказаў.

– Ну, што, цяпер – на ліфце катацца? – Жура адламаў кавалак батона і працягнуў рэшту нам.

Мы з Цыганковым адламалі па кавалку. Я заўважыў, што ў яго брудныя рукі – не толькі ў чарнілах, але і ў нейкай карычневай гадасці.

Мы пайшлі да дзевяціпавярховага дома, адзінага ва ўсім раёне, у якім быў ліфт. Жура ішоў троху паперадзе, мы з Цыганковым – за ім.

– Я буду толькі з табой катацца на ліфце, – сказаў Цыганкоў. – З Журай не буду.

Жура націснуў на чырвоную кнопку ліфта, і дзверы рассунуліся.

– Ты едзь, а мы за табой, – сказаў я.

– Добра, я чакаю наверсе.

Жура зайшоў у кабіну, націснуў на верхнюю кнопку.

Дзверы самкнуліся, ліфт з шумам паехаў наверх. Было чуваць, як дзесьці высока ён спыніўся і дзверы адчыніліся. Кнопка згасла, і я націснуў на яе.

Калі ліфт пад'ехаў, мы з Цыганковым улезлі ў кабіну. Пластыкавыя сцены кабіны былі закрэмзаныя асадкай, а лямпа на столі абмазаная сажай. Я націснуў на верхнюю кнопку.

– Ты нармальны пацан, – сказаў Цыганкоў. – Давай, ты будзеш мой сябар.

– Давай.

Ліфт прыехаў на дзявяты, мы выйшлі з кабіны. Жура чакаў нас ля жалезнай лесвіцы ў ліфтавую, з якой быў ход на дах.

– Каморка адчыненая. Палезлі, – сказаў ён.

Мы падняліся за ім па абадранай жалезнай лесвіцы ў ліфтавую, адтуль – на дах, засыпаны снегам. З даха быў бачны ўвесь наш раён: некалькі пяціпавярховак, школа, цэлыя вуліцы драўляных хат. Па вуліцах ехалі машыны, а ўдалечыні дымеў завод шын. Па краі даху праходзіў невысокі, каля метра ці троху ніжэйшы, бар'ер.

Жура падышоў да краю даха, перахіліўся праз бар'ер і зірнуў уніз. Потым ён сеў на бар'ер і звесіў ногі, як калі б там было нізка. У мяне занылі ад страху ногі: я баяўся вышыні.

Жура павярнуўся да нас.

– Хадзіце сюды. Што вы сцыце? Тут класна.

Ён дастаў цыгарэты, запаліў. Цыганкоў падышоў да яго,

і Жура перадаў яму пачак і запальніцу. Цыганкоў узяў цыгарэту і прыпаліў. Я не мог сябе прымусіць зварухнуцца з месца.

– Ну што, слабо сесці, як я? – сказаў Жура Цыганкову. – Я разумею: ты – Сцуль.

Цыганкоў моўчкі аддаў яму цыгарэты і запальніцу. Мае ногі занылі мацней, і я падумаў, што цяпер сам абасцуся ад страху.

Цыганкоў памацаў рукой бар'ер. Ён для яго быў занадта высокім, і ён не мог проста сесці на яго, як Жура. Цыганкоў закінуў на бар'ер адну нагу, адштурхнуўся другой, паслізнуўся і зваліўся ўніз.

Жура паглядзеў на мяне.

– Піздзец Сцулю. Але ён даказаў, што не сцуль. А ты – не.

Жура злез з бар'ера і падышоў да мяне.

– Сцуль ты, Ніканаў. Мамчын сынок.

Я баяўся, што ён стукне мяне, але ён не стукнуў.

– Пайшлі ўніз. Зараз мянты прыедуць. Будуць пытацца.

– А калі проста сысці? Як калі б нас тут не было?

– Ты што, дурань?

Мы спусціліся ўніз. На тым месцы, куды зваліўся Цыганкоў, тоўпіліся людзі. Пад'ехалі хуткая і машына міліцыі. Мне здавалася, што гэта ўсё сон, і я вось-вось павінен прачнуцца.

Міліцыянеры пасадзілі нас у машыну і прывезлі ў апорны пункт. Нас дапытвалі па адным у дзіцячым пакоі.

– Прызнавайся, сапхнуў яго з даху? – пытаўся мент, схапіўшы мяне за каўнер кашулі пад самым горлам. – Хутка прызнавайся, гадзянё.

Я моўчкі плакаў. Потым прыйшлі бацькі, і мент мяне адпусціў. Мы ўтраіх пайшлі дахаты. Усю дарогу мы маўчалі.

*

Свята строя і песні адклалі на дзень з-за пахавання Цыганкова. Мы хадзілі на пахаванне ўсім класам. Цыганкоў ляжаў у труне, а над ім галасіла яго мама. Яна была ўжо п'яная і час ад часу пачынала лаяцца матам. Валянціна Пятроўна шмат плакала. У класе казалі, што яе пасадзяць у турму, таму што Цыганкоў загінуў, калі ў нас павінен быў быць урок.

На святце строя і песні наш клас заняў першае месца, а потым, на "раёне" - толькі пятае. Валянціну Пятроўну не пасадзілі ў турму, але яна сышла працаваць у іншую школу, і ў чацвёртай чвэрці нас вучыла практыкантка з пед-інстытута, Ганна Сяргееўна.

## 1987

Дваццатага красавіка ў Магілёў прыехалі панкі, каб святкаваць дзень народзінаў Гітлера. Я нічога пра гэта не ведаў, проста ішоў па цэнтры і ўбачыў, што на праспекце Міра – бойка, акурат пасярод праспекта. Некаторыя з тых, што біліся, былі звычайнымі пацанамі, а некаторыя – з завушніцамі і выгаленымі скронямі.

Машыны на праспекце спыніліся і сігналілі, але ніхто на іх не звяртаў увагі. Пад'ехаў мянтоўскі "казёл", але тры мянты не маглі нічога зрабіць супраць сотні тых, што біліся.

Я спыніўся і назіраў за бойкай, і вакол мяне мінакі таксама спыніліся і глядзелі. Некаторыя казалі:

– Што гэта за бязладдзе ў цэнтры горада? Куды глядзіць міліцыя?

Потым прыехалі яшчэ мянты на трох машынах і сталі хапаць тых, хто біўся, а яны разбягаліся ў розныя бакі. Мінакі пачалі разыходзіцца, і я таксама пайшоў.

*

На наступны дзень аднакласнікі расказалі, што тыя, якія з завушніцамі і выгаленымі скронямі, гэта панкі. Яны прыехалі святкаваць дзень Гітлера, але мясцовыя пацаны сустрэлі іх, як след. Двое нашых, Бык і Люты, таксама ездзілі біцца з панкамі. Ленка, суседка па парце, сказала мне на ўроку гісторыі:

– Гэта былі несапраўдныя панкі. Сапраўдныя дзень Гітлера не святкуюць. Мне брат сказаў. Сапраўдныя не такія, яны –

нармальныя, не тое, што гэтыя гопнікі.

Яна заве гопнікамі Быка і Лютага, і ўсіх іншых пацаноў, якія ездзяць біцца за наш раён. А Ленкін брат вучыцца ў педінстытуце. Ён сышоў ад бацькоў у інтэрнат, таму што яны яго вечна даймалі за даўгія валасы і за музыку, якую ён слухаў. Яго і ў міліцыю некалькі разоў забіралі за буржуазныя каштоўнасці. Але гэта раней, цяпер за гэта не забіраюць.

Мы з Ленкай сядзім за адной партай амаль восем год, з першага класа. Нас раней заўсёды дражнілі "ціліціліцеста, жаніх і нявеста". На самай справе мы ўвогуле не сябравалі, часта сварыліся і маглі не размаўляць тыдзень і болей, хоць і сядзелі побач. А ў восьмым класе так атрымалася, што толькі я і яна вучымся добра і робім усе ўрокі. Тады мы сталі спісваць адно ў аднога, каб менш было хатняй працы. Дамаўляліся загадзя, хто будзе алгебру рабіць, а хто – хімію. А іншы раз Ленка прыносіла ў школу замежныя часопісы пра музыку, якія брат ёй даваў пачытаць. Мы з ёй глядзелі іх на геаграфіі ці на хіміі.

*

Дні праз два пасля "дня Гітлера" Ленка прынесла мне касету. Сказала, што гэта "панк-рок", а гурт называецца "Секс пісталз" – "сексуальныя пісталеты". Яна мне і раней давала паслухаць усялякі рок – і "Лед Зэпелін", і "Пінк Флоід", і "Бітлз". Але калі я прыйшоў дадому, уставіў касету ў сваю "Вясну" і ўключыў, мне яна спадабалася болей за ўсё астатняе. Я пачаў скакаць па пакоі і махаць рукамі, і суседка знізу, цётка Шура, загрукала па батарэі.

Назаўтра ў школе я сказаў Ленцы:

– Так, гэта класная музыка.

– Так, твая праўда. Гэта – клёва. Вось гэта сапраўдныя панкі. У нашых газетах пра іх пішуць, што яны, хоць і пратэстуюць супраць буржуазнай рэчаіснасці, але ўсё роўна дэгенераты і маральныя вырадкі. А мне брат распавёў, што гэта яны спецыяльна – апранаюцца так і стрыгуцца, каб усіх раздражняць, каб усе іх ненавідзелі. А нас з табой таксама ж ненавідзяць, за тое, што мы вучымся добра і за тое, што з нармальнай сям'і. І настаўнікі таксама нас ненавідзяць, таму што мы шмат плявузгаем такога, што ім непрыемна.

– Адкуль ты ведаеш?

– Усе ведаюць. Але гэта ўсё лухта. Калі хочаш, прыходзь сёння да мяне, паслухаем музыку – мне брат многа касет прынёс. Бацькі гэтую музыку ненавідзяць, але сёння іх дома не будзе.

Ленкін бацька – настаўнік матэматыкі і алкаголік. Пра яго кажуць, што ён шмат разоў трапляў у выцвярэзнік, і што за гэта яго выганялі з нармальнай працы. Цяпер ён працуе вартаўніком. А яшчэ, ён – былы паэт, і яго вершы гадоў дзесяць таму ці болей друкавалі ў гарадской газеце. Ленка ненавідзіць сваіх бацькоў, а яны ненавідзяць яе. Яны лаюць яе пастаянна за тое, што ў яе паводзіны "нездавальняюча". Ленка, хоць і выдатніца, але лаецца з настаўнікамі і задае ім пытанні з падколкай. У сёмым класе ёй не далі за паводзіны пахвальную грамату, хоць у яе і былі ўсе пяцёркі.

Класная кажа, што пасля дзясятага ёй напішуць такую характарыстыку, што ні ў адзін інстытут не возьмуць. Але Ленка заўсёды ёй адказвае:

– Ну і няхай. Мне ўсё роўна.

А я, наадварот, паводжу сябе ціха, і Класная часта прыводзіць мяне ў прыклад. Мне тады сорамна, прыкра і непрыемна.

*

Ленка пачаставала мяне віном. Мы пілі з вялікіх гранёных шклянак. Я ніколі раней не піў віно, толькі шампанскае часам, за сталом на сямейных святах.

Ленка сказала:

– Ты толькі не думай, мы цалавацца не будзем і нічога іншага. Нават не думай. Калі палезеш – адразу выганю і сябраваць з табой больш не буду і брату скажу, каб ён табе набіў морду. Але ты ўсё роўна лепей, чым усе гэтыя калгаснікі і крэціны.

Ленка ўключыла “Секс Пісталз” на ўсю моц.

Я запытаў:

– А суседзі не прыбягуць?

– Прыбягуць. Толькі мы ім не адчынім. Калі толькі міліцыю выклічуць – тады прыйдзецца адчыніць.

Мы выпілі яшчэ патрошку, потым Ленка сказала:

– Ты ж разумны, ты мусіш зразумець, што ўсё гэта лажа.

Толькі музыка – клас, такая, як гэта. І тыя, хто яе слухаюць, то бок, панкі, таксама класныя. Давай мы з табой будзем панкамі? Ці ты спалохаўся? А я не баюся. І ўвогуле, я мацнейшая за цябе. Можам з табой пазмагацца.

Ленка паставіла сваю шклянку, і мы злезлі з канапы на падлогу і сталі змагацца. Яна спрабавала палажыць мяне на лапаткі, і мне гэта было смешна, я рагатаў і не супраціўляўся, і яна палажыла мяне на лапаткі.

– Ну што, бачыш, якая я моцная?

Ленка ўзяла са стала бутэльку, разліла віно па шклянках. Я выпіў усё залпам, і мне стала лёгка, у галаве зашумела і закруцілася , і я вырашыў, што абавязкова стану панкам, а то Ленка скажа, што я сасцаў, і больш не будзе мяне ніколі паважаць, і ніколі больш я вось так не прыйду да яе дахаты і мы не будзем піць з ёй віно...

Дома я адразу пайшоў у ванну, адкруціў кран і падставіў галаву пад струмень, каб ад халоднай вады працверазець. Я не хацеў, каб мама заўважыла, што я п’яны. Але яна пачула, што я ў ваннай, і зазірнула.

– Што здарылася? Ты выпіў? З кім? Прызнавайся хутчэй.

Але я не прызнаўся. Проста лёг спаць.

*

Раніцой жудасна балела галава. Мама пайшла ўжо на працу, у кватэры не было нікога. Я знайшоў у шуфлядзе пад трэльяжам старую машынку для стрыжкі і выстрыг сабе скроні. Атрымалася не вельмі роўна, ну і пляваць. Я нача-

саў валасы над ілбом – атрымалася амаль, як на фатаграфіі ў газеце, дзе быў артыкул пра панкаў. Замест блакітнай школьнай кашулі я апрануў чорную, а замест школьных штаноў – джынсы, і гальштук не апранаў ўвогуле.

Пакуль я ішоў па калідоры, на мяне пазірала ўся школа. Я зайшоў у кабінет – першым урокам хімія. Усе павярнуліся і сталі глядзець на мяне. Многія рагаталі, некаторыя круцілі пальцам ля скроні. А Ленка ўхвальна ўсміхнулася, і на ўсё астатняе мне было насраць.

У кабінет зайшла Класная, спынілася.

– У чым справа, чаму ў цябе такі знешні выгляд?

– А які знешні выгляд? Усё, як звычайна, толькі гальштук забыўся апрануць...

– А кашуля? А штаны? А прычоска?

– Кашулі ўсе памытыя і штаны школьныя таксама. А чаму б у старэйшых класах не ўвесці вольную форму адзення?

– Вон з уроку.

– Тады і я таксама пайду, – кажа Ленка. – Чалавека ні за што выганяюць – ён нічога не парушаў.

Пакуль Ленка ідзе па праходзе, многія злараднічаюць і хіхікаюць.

Увечары мама лаяла мяне – Класная патэлефанавала ёй на працу і ўсё расказала.

– З-за гэтых сваіх фокусаў не атрымаеш медаль, – сказала мама.

– А мне медаль не патрэбны.

– А што табе патрэбна?

– Нічога.

Мама заплакала і сказала, што калі б з намі жыў тата, то я б не вырас такім ідыётам.

*

Ленка на наступны дзень таксама прыйшла ў школу апранутая ў новым стылі, і ў яе атрымалася значна лепш за мяне. У правым вуху сядзелі дзве завушніцы – яна сказала, што другую дзірку пракалола сама. А яшчэ яна выстрыгла скроні і прыйшла без фартуха, затое ў ярка-чырвоных калготках і кедах.

Але вучыцца мы мусім добра, як заўсёды, быццам нічога не адбылося, каб не было да чаго дакалупацца, – сказала яна. У краіне – перабудова і дэмакратыя, і яны не маюць права нам забараніць апранацца і выглядаць так, як хочам.

На перапынку нас выклікаў дырэктар. Я ўпершыню апынуўся ў яго кабінеце. Там стаялі два сталы літарай “Т”, у кутку – некалькі зашклёных шафаў, у іх – амаль нічога, толькі маленькі белы бюст Леніна і некалькі кніжак.

– Вы ж выдатнікі, маглі б быць гонарам школы, а замест гэтага!.. – зароў на нас дырэктар. – Што гэта за знешні выгляд, што за форма адзення? На каго вы падобныя? Вы павінны прыклад астатнім паказваць. Падумайце пра сваю будучыню. Вам жа такую характарыстыку напішуць, што ні ў адзін інстытут не возьмуць, ды й паводзіны – незда-

вальняюча, ніякага медаля не пабачыце.

– Нам медалі вашыя не патрэбныя, – адказала Ленка. – Гэта яны вам патрэбныя для справаздачнасці, для райана.

Дырэктар нават не здзівіўся Ленкінаму нахабству: прызвычаіўся ўжо.

– Калпакова, колькі з табой размаўляць можна? Ганьбіш сваю маці, яна тут працавала, мела добрую рэпутацыю, адна з лепшых настаўніц. Прыйдзецца яе выклікаць.

– Выклікайце. Гэта нічога не зменіць.

Мне стала сорамна, што я нічога не адказаў на лямант дырэктара, адна Ленка за дваіх атрымоўвала. І тады я ўсміхнуўся так непрыемна і паскудна, як толькі мог.

Дырэктар падляцеў да мяне і даў аплявуху.

– Няма чаго тут смяяцца. Сур’ёзныя справы абмяркоўваем. Не возьмем вось у дзявяты клас і пойдзеш у ПТВ, як міленькі. І напляваць, хто ты там, выдатнік ці двоечнік.

Дырэктар, напэўна, падумаў, што, калі я выдатнік, то здачы не дам, і мяне можна біць. Калі так, ён памыліўся.

Я размахнуўся і з усёй моцы стукнуў яму пад дых. Дырэктар склаўся папалам, потым выпраставўся, прыхіліўся да стала і паглядзеў на мяне здзіўлена, быццам не мог паверыць.

– Вучняў біць нельга, – сказала яму Ленка. – А вы яго першы стукнулі. Ён абараняўся, я сведка.

Дырэктар нічога не сказаў – яму траплялі і раней, і ўсе гэта ведаюць, але ад выдатніка – упершыню.

*

Мы з Ленкай сядзелі на заднім ганку і палілі. Яна навучыла мяне паліць, а сама пачала яшчэ год таму. Было цёпла, але шэра і пыльна, і лісце на дрэвах яшчэ не распусцілася.

– Малайчына, – сказала мне Ленка. – Я думала, ты засцыш і не даш яму. Так і трэба. І не бойся, ён нікому нічога не раскажа.

На наступным перапынку да мяне падышлі два здаровыя пацаны з дзясятага класа, Клешч і Гурон. Усе іх сябры звалілі пасля восьмага ў вучылішча, а яны вырашылі пайсці ў дзявяты і неяк умудрыліся дацягнуць да выпуску, хоць і раней вучыліся на тройкі.

– Э, хлопец, ты думаеш, што ты самы тут асноўны? – запытаў у мяне Гурон.

– Не.

– А хулі ты тады так вось у школу прыйшоў? Табе можна, а іншым – што, нельга?

– Усім можна, хто не баіцца.

– А ты  што, смелы такі? Адпіздзім – не будзеш выёбвацца.

Я нічога не сказаў. Падумаў, што наўрад ці яны будуць біць мяне проста зараз.

– Ты, карацей, глядзі, – сказаў Клешч. – Мы цябе чапаць не будзем – са свайго раёна, са сваёй школы. А ў цэнтр паедзеш – адразу атрымаеш пізды. Падумаюць – панк недабіты, яшчэ са дня Гітлера.

– А што з імі зрабілі?

– З кім?

– З панкамі.

– Нічога. Ну, амаль нічога. Так, адпідзілі некаторых, а астатніх мянты павязалі. Гэта і цябе чакае. Рыхтуйся.

*

Увечары мы сядзелі на даху Ленкінай пяціпавярхоўкі і палілі. У яе пад’ездзе быў люк на дах, і мы вылезлі праз яго.

– Лайно ўсё. Горад – лайно. Задрыпаная дзіра. – Ленка зацягнулася і паглядзела на заход сонца. Дах быў засраны галубамі, і паўсюль валяліся бычкі і аскепкі бутэлек. Мы ледзь знайшлі месца, дзе сесці.

– У Маскве ці ў Піцеры – вось там – так, панкі і металісты і іншыя ўсялякія нефармалы, а тут – адныя пралетарыі і былыя зэкі. Лайно, лайно, лайно. З’еду ў Маскву паступаць пасля восьмага класа.

– Куды?

– Не важна. У які-небудзь тэхнікум. Галоўнае – каб падалей адсюль.

– А калі паводзіны “нездавальняюча”?

– Не паставяць. Засцуць. Ведаюць, што я тады ў райана ліст напішу і ў аблана і яшчэ куды-небудзь. Думаеш, яны захочуць, каб у школу праверка прыйшла? Гэтыя казлы баяцца праверак.

*

Першага мая мы пайшлі з усёй школай на дэманстрацыю. Спачатку хацелі забіць, але потым Ленка сказала, што трэба схадзіць: няхай усе глядзяць на нас, няхай ведаюць, што і ў нашым раёне – не адныя толькі пралетарыі і вырадкі.

Калі сядалі каля школы ў тралейбусы – іх спецыяльна падалі, каб адвезці нас у цэнтр, – падбег дырэктар і залямантаваў:

– А вы куды?

– Як гэта – куды? – адказала Ленка. – На дэманстрацыю ў гонар Дня міжнароднай салідарнасці працоўных.

Яна сказала гэта самым сур’ёзным голасам, быццам верш пра камунізм расказала. Усе навокал зарагаталі. Дырэктар толькі рукой махнуў.

Як толькі тралейбусы давезлі нас да цэнтра, мы з Ленкай адкалоліся ад школьнага натоўпу і пайшлі шукаць яе брата. Ён быў у калоне свайго інстытута – валасаты і побач з ім такія ж усе валасатыя, у скураных куртках і джынсах. І яны вылучаліся з усяго калгаснага натоўпу, хоць і расквечанага лозунгамі і транспарантамі. Мы з імі пайшлі ў двары і там пілі партвейн.

Я мала ўрубаўся ў тое, пра што казаў Ленкін брат са сваімі сябрамі, але мне і не было патрэбна. Затое я класна выглядаў, і побач з імі мне было не сорамна. Перад дэманстрацыяй Ленка начасала мне валасы ў розныя бакі і заліла ла-

кам “Прелесть”, і сабе яна зрабіла тое ж самае. А яшчэ я абрэзаў рукавы ў старой джынсавай курткі і напісаў на спіне белай нітрафарбай для вокнаў “Sex Pistols” і “Fuck Off” – гэта “пайшоў нахуй” па-ангельску, мне Ленка растлумачыла.

Мы развіталіся з тусоўкай Ленкінага брата і пайшлі шукаць сваю школу. Насустрач нам пёрлі кудысьці тры короткастрыжаныя быкі.

– Э, малыя, што гэта такое? – зароў нам адзін. – Што за знешні выгляд? Ну-ка хадзіце сюды.

Ён схапіў мяне за каўнер і хацеў кудысьці цягнуць.

– Ну-ка ад’ябіся ад яго, – сказала яму Ленка, – А то атрымаеце зараз пізды.

– Ад каго гэта, бля?

– Ад брата і яго сяброў. Яны ў палітэху вучацца, вунь іх калона стаіць. Можа, падыйдзем, га?

– А каго ён там ведае?

– Зверабоя ведае і Рыжага. І яшчэ шмат каго.

Бык адпусціў мяне.

– Добра, можаш ісці, але аднаго сустрэнем – рыхтуйся. Лепей пастрыжыся нармальна і не хадзі ў гэтым лайне. Я табе па-добраму кажу.

Мы вярнуліся да школьнай калоны. Зноўку падбег дырэктар.

– Вы б лепей пагулялі. Не трэба з намі ісці.

– А чаму гэта не? – запытаў яго я.

Дырэктар запсіхаваў.

– Як табе не сорамна ганьбіць школу! А меў жа добрую рэпутацыю. Гэта ўсё Калпакова, гэта яна на цябе так уплывае. Ад цябе ж вінам смярдзіць... Вон з калоны! Каб я цябе больш не бачыў, і з маці будзе самая сур'ёзная размова.

Мы павярнуліся і пайшлі прэч.

*

Усе святы я тусаваўся з Ленкай у яе дома. Яе бацькі з'ехалі на лецішча, і нам ніхто не перашкаджаў. Мы выпілі віно, якое яе бацька прыхаваў, і выпалілі ўсе яго цыгарэты.

– Усё адно, яны ведаюць, што я п'ю і палю, – сказала мне Ленка. – І нічога ў гэтым няма дрэннага, калі дзяўчына п'е і паліць. Гэта не значыць, што яна блядзь, ты зразумеў? А цалавацца з табой я не буду. Ты мне не падабаешся як мужчына. Ну, карацей, падабаешся, але не вельмі.

*

У першы дзень пасля святаў Ленка ў школе не з'явілася. Я не ведаў, у чым тут справа, і вырашыў зайсці да яе пасля ўрокаў. На геаметрыі мяне выклікалі да дырэктара. У кабінеце сядзела мая мама. Яна плакала. Як толькі я падышоў, яна выдала мне аплявуху, потым яшчэ і яшчэ. Я захіліўся рукамі, а дырэктар чамусьці адцягнуў маму: яму, напэўна, было прыемна, што мяне б'юць.

Мама села ў крэсла і зноў заплакала, а дырэктар адправіў сакратарку за вадой у прыбіральню.

– Твая сяброўка ўжо дагулялася, – сказаў ён мне. – Псіхічныя адхіленні. Раніцай сёння забралі ў лякарню.

Я не паверыў у псіхічныя адхіленні. Бацькі Ленкі даўно пагражалі здаць яе ў дурку і вось цяпер здалі. Я выбег з кабінета, на вуліцу і далей – на прыпынак.

*

На прыпынку, дзе мне трэба было перасядаць на аўтобус, каб ехаць у дурдом, я ўбачыў тых самых быкоў, якія дакалупаліся да нас на дэманстрацыі. Яны мяне адразу пазналі, і я не паспеў схавацца.

– Якая сустрэча, – сказаў той, што хапаў мяне на дэманстрацыі.

Я пабег і адразу зразумеў, што дарма: на прыпынку было многа людзей, і пры іх мяне б не чапалі, а цяпер...

Яны дагналі мяне ў двары, каля бакаў са смеццем і пачалі біць. Я паваліўся ў бруд, захіліў рукамі галаву і твар. Яны білі мяне, а я роў:

– Усё роўна вы – сукі, гандоны, підарасы! Мне насраць на вас, я не баюся.

Яны яшчэ папіналі мяне, выграблі ўсе капейкі і сышлі.

У двары было пуста, ад сметніцы смярдзела нейкім гніллём. Я раптам заўважыў, што на дрэвах з’явілася свежае лісце і падумаў, што вучыцца засталося зусім няшмат, а потым пачнуцца канікулы, а зараз я прыйду да Ленкі ў лякарню і скажу ёй “прывітанне”.

## Радзіма

Галоўны рэдактар Сяргей Дудко зайшоў у офіс. Я сказала:

– Дзень добры, Сяргей Пятровіч.

– Прывітанне, Лена.

– Ну як мерапрыемства ўчора?

– Якое?

– Дэманстрацыя... Ну ўгодкі Чарнобыля...

– Як заўсёды. Кучу людзей павязалі. Не столькі, канечне, як летась, на дзесяцігоддзе, але таксама нямала. Рэферэндум развязаў дыктатару рукі. Цяпер робіць усё, што хоча...

*

Яго твар быў мне знаёмы – я бачыла яго ў “інязе”. Ён, напэўна, таксама там вучыўся. Невысокі, светлавалосы, коратка стрыжаны. Ён глядзеў на мяне ўважліва – магчыма, таксама ўспомніў.

– Вы па якім пытанні да Сяргея Пятровіча?

– Па кадравым.

– А імя ваша...

– Анатоль Сцяпанаў.

– Добра, зараз яму перадам.

Я ўстала, пагрукала ў дзверы Дудко, зазірнула.

– Сяргей Пятровіч, тут Анатоль. Па кадравым пытанні.

Дудко ўзняў галаву ад ноўтбука.

– Хай пачакае крыху.

Я вярнулася за свой стол.

– Ну вы самі чулі, – я ўсміхнулася. – Гарбату піць будзеце? Альбо каву?

– Ад кавы не адмовіўся б.

Я адчыніла электрачайнік – вады ў ім амаль што не было. Я ўзяла яго і выйшла на калідор.

– Так, я таксама скончыў "іняз", – сказаў Анатоль. Ён узяў кубак, размяшаў каву, зрабіў глыток, не вымаючы лыжкі. – Ангельскі факультэт. Але два гады таму.

– Цяпер зразумела, чаму твар знаёмы. І дзе вы цяпер – выбачайце, канечне, за цікаўнасць?

– Усюды патроху. Пераклады ў асноўным. Крыху журналістыка. Пішу часам у "Музыкальную газету". А яшчэ я займаюся фатаграфіяй – але выключна для сябе, можна сказаць, "некамерцыйны праект"...

– А на ўвесь час што, не атрымалася ўладкавацца?

– А я і сам не хачу. Навошта? Сядзець у офісе цэлы дзень за якія-небудзь 150 даляраў у месяц? Мне больш даспадобы быць вольным.

– І атрымоўваецца? Каб і вольным быць, і на жыццё хапала?

– Увогуле так. Не заўсёды аднолькава, але жыць можна.

Хоць ад новай працы не адмоўлюся. Нават, можна сказаць, шукаю. Таму і прыйшоў да вашага шэфа – мне сказалі, што ён плануе новы праект, з ангельцамі.

Я пацiснула плячыма.

– Чула пра гэта краем вуха, але падрабязнасцяў не ведаю.

– Хоча зрабіць ангельскую версію вашай газеты, – працягваў Анатоль. – Ёсць ужо адна газета на ангельскай у Менску, але ж такое лайно... Карыстаюцца тым, што яны адзіныя на рынку. Ангельская – дрэнная, артыкулы – лухта, выходзяць ці то раз на два тыдні, ці то радзей. Карацей, усё гэта несур’ёзна...

Дзверы шэфа адчыніліся, ён вызірнуў.

– Анатоль – гэта вы?

– Так.

– То заходзьце.

*

Я і Анатоль выйшлі вонкі. Было цёпла. На дрэвах набрынялі пупышкі.

– Ну як размова з рэдактарам? – спытала я.

– Нічога дакладнага. Ці то ў яго самога ўсё пад пытаннем, ці то не хоча анічога абяцаць. Сказаў, што ў лепшым выпадку – пасля лета. А мне гэта не вельмі цікава – скуль я ведаю, што я буду рабіць пасля лета і дзе я буду ўвогуле? Вам, дарэчы, куды ехаць? Магу правесці.

– Далёка. Ва Уруччa.

– Не праблема. У мяне аніякіх важных спраў на сёння.

– А дзе вы жывеце?

– Не вельмі далёка адсюль. У інтэрнаце на вуліцы Караля.

– Не ведаю, дзе гэта.

– Паміж Нямігай і Фрунзенскай. Вуліца пачынаецца за "Гандлевым домам на Нямізе" і ідзе наверх, да Фрунзенскай. З самага пачатку – высокі будынак. Гэта і ёсць мой інтэрнат.

– Шмат разоў хадзіла ці ездзіла міма, але не звяртала ўвагі… А можа пяройдзем на "ты"? Неяк нязручна "выкаць"…

– Так, натуральна. А ты жывеш з бацькамі?

– Не, здымаю пакой. Бацькі мае далёка. У Магілёве.

– А мае – у Гомелі.

– Як гаспадыня? Добрая?

– Там не гаспадыня, там сям'я. Муж, жонка і дачка. Трохпакаёвая кватэра.

– Дзіўна. Такія звычайна не здаюць пакоі…

– У іх вельмі дрэнна з грашыма. Абодва працуюць на гадзіннікавым заводзе, завод амаль што ўвесь час стаіць, грошы не плацяць. Ці працуе дачка, я не ведаю… Яна ў нейкай рэлігійнай секце. Мне гаспадыня казала, што яна раней паліла, піла, слухала хэві-метал, а потым раптам звярну-

лася да рэлігіі…

– Ну, здараецца і такое… Я таксама здымаў пакой аднойчы. На першым курсе. Тады інтэрнат першаму курсу амаль што не давалі. Жыў у старой-алкагалічкі. Весела было, канечне. Але – жыццёвы вопыт… – ён хмыкнуў.

Мы падышлі да Інстытута культуры, пачалі спускацца ў метро.

*

Я і Толік сядзелі на бетоным бардзюры падземнага перахода ля вакзала. Перад кожным стаяла бутэлька піва "Бурштын Беларусі". Народ спускаўся і падымаўся па прыступках перахода. Старухі гандлявалі кветкамі тут жа, на прыступках. Таксоўшчыкі – прыватнікі тапталіся ля сваіх машын. На дрэвах зелянела свежае лісце.

– Мяне напружваюць усе тыя, хто заўсёды скардзіцца: нам, маўляў, сумна жыць, – сказаў Толік.

– А вось мне не сумна, наадварот афігіцельна цікава…

– І весела?

– Не, нельга сказаць, што весела. У мяне розныя станы бываюць. Але што цікава – факт. Столькі ўсяго адбываецца навокал, столькі новых кніг, фільмаў, выставаў, новай музыкі. Тым, каму ўсё похер, хто нічым не цікавіцца, акрамя працы ды тэлевізара ў якасці забавы, тым, мабыць, сумна…

– А вось мне таксама часам бывае сумна, – сказала я. – У некаторыя моманты нічога не хочацца – ні музыкі, ні кіно,

ні кніг… Зусім нічога. І вось тады надыходзіць сапраўдная маркота.

– Ну тое ўжо не маркота, гэта нешта іншае. “Сусветная журба” нібы…

– Ты фатаграфаваў што-небудзь новае?

– Так, распачаў новую серыю. Фатаграфую “Запарожцы”. Гэта ж знікаючы від аўтамабіля. Хутка іх увогуле не застанецца…

– Наўрад ці. У такой беднай краіне, як наша.. У нас у горадзе яшчэ шмат хто ездзіць на іх…

– Я маю на ўвазе, што ў Менску не застанецца. А ў гарадах, што паменш, усё яшчэ доўга застанецца, як раней…

Будынак на рагу быў агароджаны плотам. На плоце вісеў плакат: “Капітальным рамонтам будынка займаецца будаўніча-мантажнае аб’яднанне “Мінскбуд”. Пачатак працы – сакавік 1997, заканчэнне – сакавік 1998”. Літары на плакаце былі выразаныя з самаклейнай рознакаляровай плёнкі.

– Гэта яны неабдумана зрабілі, – сказаў Толік. – Не падумалі, што іх можна адклеіць і зрабіць зусім іншыя надпісы.

– І ты прапаноўваеш?..

– Так, наперад, пакуль мянты не з’явіліся.

Мы вылепілі з літар надпісы “Лена і Толік” і “Жыве Беларусь” і пайшлі па Карла Маркса ў бок цэнтра.

Я запытала:

– Толік, а ты любіш Радзіму?

– Я не ведаю, што лічыць Радзімай. Фармальна мая Радзіма – СССР, але яго ўжо няма, і там не было анічога добрага, што я мог бы любіць. Незалежная Беларусь? Я толькі пачаў абвыкаць, як з'явіўся Лукашэнка... Вось такую Радзіму з Лукашэнкам на чале я адназначна не люблю.

– Халера з ім, з Лукашэнкам. А вось ці змог бы ты аддаць жыццё за Радзіму?

– Як – аддаць жыццё?

– Напрыклад, калі б раптам пачалася вайна....

– Ведаеш, мне падаецца, усё гэта тупа. Гучыць, канечне, прыгожа – "аддаць жыццё за Радзіму". Але час змяніўся. Цяпер можна і не аддаваць за яе жыццё. І некалькі пакаленняў пражылі, не аддаючы жыццё. Магчыма, я болей зраблю для сваёй краіны, калі якраз не аддам сваё жыццё...

– Ну а калі будзе сітуацыя, што нельга не аддаць жыццё?

– Нешта ты, Алена, сёння зашмат фантазуеш. Звычайна патрыятызм табе не ўласцівы, а зараз...

– Мне і зараз не ўласцівы, ты ведаш. Я проста хацела зразумець тваю пазіцыю...

– І што, зразумела?

– Зразумела. Ты таксама не патрыёт.

– Так, я – не патрыёт. Можна паведаміць пра гэта ў КДБ.

– А яно, што, дагэтуль так завецца?

– Не памятаю. Здаецца, так.

*

У “мыльніцы” Толіка грала касета “Морская”, песня “Скорость”. Гэты альбом “Мумій Троля” з’явіўся нядаўна. Мне адразу спадабалася музыка, хоць хлопец на фотаздымку – ніхто не ведаў тады, як яго завуць, касета была пірацкая, і на яе вокладцы анічога не было, акрамя двух фотаздымкаў і назваў песень – падаўся непрыгожым. Тым больш, што паліграфія была дрэнная.

Вакно было адчынена. Я глядзела на горад – з вакна інтэрната адкрываўся афігенны від.

Толік рэзаў агуркі і каўбасу.

– Файна, што твой сусед з’ехаў, – сказала я. – І доўга яго яшчэ не будзе?

– Да панядзелка. У яго ў панядзелак, здаецца, заняткі.

– А дзе ён вучыцца?

– На юрфаку. Чамусьці вялікая колькасьць ідыётаў вучыцца на юрфаках. Цікава, якія з іх потым атрымаюцца юрысты?

– Думаю, аніякія.

– Я таксама так лічу. У гэтага перца сувязі ў сваім горадзе чыста крымінальныя – нейкія школьныя яшчэ корышы. Ён мне неяк па п’яні прызнаўся, што хоча з імі “рабіць справы”. Вось вырадак, праўда?

– А што за справы?

– Крымінал нейкі, зразумела. У сэнсе – яны будуць рабіць, а ён – прыкрываць іх. “Юрыдычная падтрымка”...Добра, халера з ім... Можна пачынаць ужо.

Мы селі за маленькі стол – ён быў і пісьмовым, і абедзеным адначасова. Толік адкаркаваў бутэльку гарэлкі, наліў мне і сабе.

– Ты разбаўляць будзеш? – запытаў ён.

– Не. Праз газіроўку мацней п’янееш.

– Няхай так. А вось я разбаўляю – нібыта віскі з содавай.

– Дарэчы, а што значыць “содавая”? Што гэта за вада такая? Увесь час сустракаю ў кнігах...

– Любы ліманад, газіроўка. У ангельскай усе такія напоі завуцца “soda”. Ну і мабыць так пераклалі...

– Так, дакладна... Ніколі не звяртала на гэта ўвагу....

*

– Паедзеш са мной аўтастопам у Еўропу? – запытаў Толік. У бутэльцы заставалася менш за палову. Мы стаялі ля адчыненага вакна і палілі.

– У мяне не будзе адпачынку.

– Ну і што? Вазьмі за ўласны кошт.

– Не ведаю, неяк боязна... А ты ездзіў калі-небудзь раней?

– Не, ты ж ведаеш. І што тут такога? Заўсёды штосьці робіш упершыню. Паехалі – удваіх будзе круцей.

– А як ты зробіш візу?

– Звычайна. Праз турфірму. Мне абяцалі ў адной – я ім перакладаў часам, телефанаваў у Нямеччыну. Яны мне сказалі, што дадуць запрашэнне па сабекошце.

– Што значыць – па сабекошце?

– Каб адкрыць візу ў амбасадзе, нават турыстучную – трэба мець запрашэнне. Запрашэнні ў асноўным усе левыя… Ну, не, яны, канечне, сапраўдныя, але робяць іх фірмы, якія зарабляюць на гэтым – у асноўным былыя рускія. Прадаюць запрашэнні нашым фірмам, па 50 баксаў. А тыя ўжо прадаюць іх далей, па 80 ці 100.

– Ні фіга сабе…І што, амбасады не ведаюць пра гэта ўсё?

– Ведаюць, але ім напляваць. Ім галоўнае, каб усё было законна з выгляду. Думаеш, там на Захадзе яны ўсе такія шчырыя?

Толік вызірнуў у вакно.

– Дзіўна, – сказаў ён. – Вунь там, унізе, на “Валадарцы” сядзіць Віннікава. Былая старшыня Нацбанка. Усяго метраў 500 адсюль, максімум – кіламетр. А мы жывем тут сваім жыццём, і нам, шчыра кажучы, напляваць і на Віннікаву, і яшчэ на кучу ўсялякіх людзей…

Нават на бацькоў нам насамрэч напляваць, – сказала я.

– Ну… гэта цяжкае пытанне. Я б так не сказаў пра сваіх. Проста ў іх адно жыццё, у мяне – іншае. І калі мы зразумелі, што нам не трэба ўмешвацца ў жыццё адно аднога, стасункі адразу сталі вельмі добрымі, праблемы нібы

расталі. І ўвогуле я ўдзячны бацькам. Калі б не яны, мяне б не было ўвогуле, альбо не было б такім, які я цяпер.

– А я не ўдзячная бацькам…

– Чаму?

– Мне здаецца, яны дбалі только пра сябе. Нарадзілі мяне толькі таму, што ў кожнай сям'і павінны быць дзеці…

Я зрабіла апошнюю зацяжку і кінула бычок у вакно. Ён, мільгануўшы чырвонай кропкай, паляцеў уніз.

– А якія ў цябе ўвогуле планы? – спытала я.

– У сэнсе?

– У самым глабальным. Ну пасля падарожжа.

– Пакуль што аніякіх. Не магу сказаць, што мне вельмі падабаецца ў гэтым інтэрнаце – галоўным чынам, з-за суседа. Але ж гэта – дэталі. Тэарэтычна я мог бы зняць кватэру – калі б трошкі напружыцца. Але пакуль што напружвацца не хочацца… Паглядзім, як яно будзе далей…

Ён пасунуўся да мяне, мы пацалаваліся…

*

Мінуў амаль што год. Вясна 98-га пачалася "Гранатовым альбомом" гурта "Сплін". Спачатку была песня "Орбит без сахара", я яе ўпершыню пачула ў клубе "Рэзервацыя" на дыскатэцы пасля канцэрта "Короля и Шута". Я хадзіла на канцэрт з Толікам. Ён тады працаваў у нейкай фірме непадалёк ад плошчы Бангалор, у двух прыпынках ад "Рэзервацыі". Нават не столькі працаваў, колькі карыстаўся

халяўным інтэрнетам пад выглядам працы, якую рабіў загаддзя дома. Па суботах у офісе нікога не было, і ён заседжваўся да цемры – да пачатку начнога канцэрта ў "Рэзервацыі". Песня "Орбит без сахара" спадабалася нам абаім, хоць Толік потым казаў, што занадта яна папсовая. Наскакаўшыся пад яе і пад іншыя песні, мы дайшлі пешшу да Бангалор, селі ў ранні аўтобус і паехалі да Толіка ў інтэрнат. Усю дарогу я напявала, скажаючы словы: "Она жует свой «Орбит без сахара» и вспоминает тех, кого трахала".

Напрыканцы траўня "Сплін" прыехаў на гастролі і граў у канцертнай зале "Мінск". Мянты не дазвалялі танчыць у праходах, але мы з Толікам, напіўшыся піва "Лев", скакалі, узняўшыся на сядзенні сваіх фатэляў, і мянты анічога не маглі зрабіць – не прымусіш жа кожнага сесці.

Раніцой пасля канцэрта я і Толік у апошні раз прачнуліся ў адным ложку. Я ўжо збіралася замуж за Крыса, але Толік яшчэ пра тое не ведаў.

Мы праспалі. Я спехам апраналася, нацягвала калготкі, а Толік ляжаў, адвярнуўшыся да сцяны і накрыўшы галаву падушкай. У вакно інтэрната свяціла яркае траўнеўскае сонца. Потым я бегла міма мінэканомікі і "Кіпрыяна-піцы" да метро "Плошча Незалежнасці", насустрач хутка крочылі нейкія людзі. Я напявала:

*Скоро рассвет, выхода нет*

*Ключ поверну и улетели...*

У чэрвені “Гранатовый альбом” быў чутны з кожнага шапіка з касетамі і дыскамі. Мы з Толікам амаль што не бачыліся. У дваццатых числах ён патэлефанаваў мне ў офіс і сказаў, што з’язджае ў Маскву. Мы сустрэліся на “Інстытуце культуры” і пайшлі пешшу ў бок цэнтру.

– Паехалі са мной, калі хочаш, – сказаў Толік.

– І што я там буду рабіць?

– Уладкуешся на працу. І не сакратаркай, як тут, а знойдзеш нешта нармальнае, з ангельскай.

– А жыць дзе?

– Здымем кватэру. У крайнім выпадку – пакой. Але толькі напачатку, пакуль не абвыкнемся.

– А чаму ты вырашыў паехаць менавіта зараз?

– Зразумеў, што вычарпаў усе магчымасці ў Менску, што трэба рушыць далей, а то гэтая дрыгва засмокча – і ўсё.

Ля казіно, у чорным браніраваным джыпе сядзеў таўстаморды мужык – з выразам поўнай абыякавасці і агіды да ўсяго ўвогуле. Можа, ён быў ахоўнікам і чакаў свайго гаспадара, а можа, прыехаў з кампаніяй і чамусьці не пайшоў унутр і чакаў астатніх у машыне.

– Чым цябе трымае Менск? – спытаў Толік. – У цябе што, праца тут цікавая, з афігеннымі перспектывамі? Ці ў цябе ёсць, дзе жыць? А, прапіска... Ну, гэта, канечне, няблага, але сядзець у гэтай дупе з-за нейкай прапіскі неяк дзіўна...

Толік не ведаў пра Крыса. Не ведаў увогуле нічога. Я паду-

мала, што, мабыць, ад’езд Толіка быў дарэчы: мне не трэба нічога яму тлумачыць.

– Толік, зразумей, ты – гэта ты, а я – гэта я. Я не магу проста ўзяць і сарвацца, як ты. Я не такі вольны чалавек. Ты можаш казаць, што хочаш, але я ўсё роўна нікуды не паеду, не кіну ўсё, хай нават ты яшчэ мільён разоў мне паўторыш, што кідаць мне тут няма чаго...

Я несла лухту, і мне было сорамна. Я не магла сказаць яму, што калі б ён з’язджаў летась, я б, мабыць, паехала з ім, але не цяпер.

Мы выйшлі з перахода да паштамта. На прыступках тоўпіліся кампаніі моладзі. Хлопец з доўгімі валасамі ціснуў на кнопкі пэйджэра.

*

Да адпраўлення цягніка на Маскву заставалася 10 хвілін. Я і Толік стаялі на пероне – ён у чорных джынсах і старой пацёртай касухе, я – у доўгай зялёнай вельветавай спадніцы і такога ж колеру швэдары.

– Я паведамлю табе, калі зачаплюся там, – сказаў Толік. – Раптам ты яшчэ раздумаеш. А цяпер пара загружацца ў вагон.

Мы пацалаваліся. Толік узышоў па прыступках, павярнуўся, памахаў мне рукой і схаваўся за дзвярыма. Я не стала чакаць, пакуль цягнік рушыць, спусцілася ў пераход, выйшла на прывакзальную плошчу, падыйшла да кіёска.

– Піва “Аліварыя”. Адкаркуйце, калі ласка.

Я зрабіла доўгі глыток, потым яшчэ адзін. Я вырашыла, што буду піць павольна, купляючы па адной бутэльцы – зараз дап'ю вось гэтую, потым куплю яшчэ адну, каб піць яе ў метро, на "Усходзе"; яшчэ адну – для тралейбуса, а потым на сваім прыпынку – яшчэ адну. Альбо дзве.

# Вяртанне

Я стаяў на ўзбочыне шашы. Міма праляталі машыны. Ніхто і не думаў спыняцца, хоць на мапе ў хостэле, дзе я начаваў у першую ноч у Амстэрдаме, гэтае месца было пазначана як “hitch–hiking station”. Ці, можа, я памыліўся, калі ішоў ад метро, і патрапіў не туды. Адзіны чалавек, якога я сустрэў, быў мясцовы бомж. Я, прызвычаіўшыся да таго, што ў Галандыі ўсе размаўляюць па-ангельску, спытаў:

– Do you speak English?

– No, – адказаў ён.

На матацыкле пад'ехаў паліцэйскі – таўстаморды і вусаты, штосьці спытаў па-галандску. Я паматляў галавой. Тады ён сказаў па-ангельску: тут машыну не ловяць, “hitch–hiking station” наперадзе ў пяцістах метрах, а тут знаходзіцца наогул нельга, і калі я не сыду, ён мяне аштрафуе.

– А калі ў мяне няма грошай? – спытаў я.

– Тады ты пойдзеш у турму, – паліцэйскі выскаліўся.

Грошай у мяне насамрэч было мала – апошнія пяцьдзесят марак. А я яшчэ хацеў заехаць у Берлін. Каб зэканоміць, другую ноч у Амстэрдаме я вырашыў правесці на вакзале – і абламаўся. Як высветлілася, вакзал тут не кругласутачны, ён зачыняецца апоўначы і гадзін да чатырох раніцы. У гэта час цягнікі не прыбываюць і не адпраўляюцца. Ахоўнік пабудзіў мяне і растлумачыў, што трэба адсюль валіць. Разам са мной з вакзала выправадзілі некалькіх бамжоў. Я прагуляўся па навакольных вуліцах. На масце чувакі ка-

лолі сабе герaін. У святле ліхтароў блішчалі шпрыцы. Я вярнуўся да вакзала. Нейкія дзверы былі адчыненыя, і я прайшоў у іх – апынуўся ў аўтаматычнай камеры захоўвання. Дзверы замкнуліся. Я лёг на падлогу, паклаў галаву на заплечнік. Ну, лепш так, чым на вуліцы.

На вуліцы я таксама ўжо паспеў пераначаваць – у Парыжы. Да гэтага я доўга швэндаўся па горадзе, бачыў некалькіх чувакоў з задаволенымі тварамі, якія сцалі наўпрост на пляцы Зоркі, дзе Трыўмфальная арка. Тутака ж, побач з Трыўмфальнай аркай, негрыцянка ў джынсах і зялёнай саколцы звярнулася да мяне па-ангельску: “Say something to me”. Я сказаў “Hi”. Яна ўсміхнулася, села ў свой “Рэно” і з'ехала, а я пайшоў блукаць далей. Бліжэй да поўначы я апынуўся ў скверы побач з царквой. У царкве начавала моладзь, якая прыбыла на нейкую рэлігійную тусоўку. Адтуль чуліся галасы, але ісці да іх і прасіцца на начлег не хацелася – лепш ужо на лаўцы ў скверы. На суседняй лаўцы сядзеў доўгавалосы чувак. Я не ведаў, хто ён, але спытаў на ўсялякі выпадак:

– Puis je dormir ici? N'est – il pas interdit? – Я магу тут спаць? Гэта не забаронена?

Чувак здзіўлена зірнуў на мяне.

– Interdit? Par qui? – Забаронена? Кім?

Я паціснуў плячамі, паклаў заплечнік пад галаву і лёг, падціснуўшы ногі. Ляжаць на цвёрдай лаўцы было жудасна нязручна, але я вырубіўся амаль адразу – цэлы дзень блукаў па горадзе. Раніцай мяне абудзілі гудкі машын – царква

стаяла побач з ажыўленым пляцам. Але гадзін пяць я ўсё ж праспаў.

У камерах захоўвання ў Амстэрдаме -- значна менш. Там мяне ўсю ноч даставалі мухі, а пад раніцу прыперліся нейкія чувакі, пачалі грукаць, адчыняючы ячэйкі. Першая думка – гэта злодзеі, і мяне павяжуць з імі заадно. Потым я зразумеў, што яны – супрацоўнікі вакзала, правяраюць ячэйкі. Я паціху ўстаў і выйшаў у адчыненыя дзверы.

На “hitch–hiking station”, акрамя мяне, тусаваліся два панкі з аўчаркай на ланцугу. Яны размаўлялі паміж сабой на нейкай славянскай мове – можа, на чэшскай ці на славацкай. І я, і чувакі, стаялі, адтапырыўшы вялікія пальцы. Спыніўся зялёны “форд”. Я быў гатовы прапусціць чувакоў наперад – яны прыйшлі раней. Але мужык паказаў на сабаку і пакруціў галавой. Я падышоў да машыны і сеў. У кіроўцы на некалькіх зубах былі металічныя каронкі. Я думаў, такія ставяць толькі ў нас.

Ён правёз мяне кіламетраў дваццаць, потым падвозілі іншыя – увесь дзень і амаль усю ноч. Пад раніцу я апынуўся ў Берліне. Перадапошнім, хто мяне вёз, быў турак з паголенай галавой. Ён спытаў па-нямецку, куды я еду. Я сказаў, што ў Берлін. Сам ён сказаў, што едзе ў Польшчу – nach Polen. На задняй сядушцы машыны стаялі кардонныя скрынкі. Прымач быў наладжаны на рэп-станцыю. Турак выкінуў мяне на развязцы кальцавой, і мне прыйшлося перціся па ўзбочыне да бліжэйшага выезду. Міма, па аўтабане, ехала паліцэйская машына, паліцыянты штосьці крычалі ў рупар. Я падумаў, што, можа быць, мне – не

спадабалася, што іду па ўзбочыне аўтабана. Але машына праехала міма, а мяне падабраў мужык на грузавым “Мэрседэсе” і давёз да бліжэйшай станцыі метро.

Праз суткі з нечым я стаяў на выездзе з Берліна. Прыйшлося ехаць на метро праз увесь горад, каб устаць на патрэбным аўтабане. Мяне доўга ніхто не падбіраў – гадзіны дзве ці больш. Пераначаваў я ў хостэле, і ў кішэні заставалася дзесяць марак. Іх павінна было хапіць – да польскай мяжы заставалася кіламетраў сто. Мяне падабраў тоўсты бюргер на мінівэне – ён ехаў да сябе ў Франкфурт-на-Одэры, вёз з рынка ў Берліне непрададзеную рэшту кошыкаў. Ён распавёў мне, што спрабаваў прадаваць свой тавар і ў былым Саюзе – у Рызе, але там яго кошыкі ніхто не купіў. Яшчэ ён распавядаў, як ездзіць у Польшчу – дзе бензін таннейшы – запраўляцца. Ён высадзіў мяне на скрыжаванні, паказаўшы, як прайсці да грузавога пераходу. Пешшу я дайшоў за гадзіну. Горад апынуўся нечакана пустым і нудным. Пустым быў і пераход – ніводнай фуры, толькі смецце на ўзбочынах: пустыя цыгарэтныя пачакі, расплюшчаныя банкі ад колы, пакеты ад чыпсаў.

Праз гадзіну фуры нарэшце з'явіліся – можа, стаялі дзесьці ў адстойніку. Я памахаў “Мэрседэсу” з беларускімі нумарамі, ён тармазнуў. Я залез у кабіну. Худы малады чувак за рулём сказаў, што давязе мяне да адстойніка пасля мяжы, але праз Польшчу з сабой не возьме:

– Тут у кабіне і так дыхаць няма чым, а прыкінь, цэлы дзень яшчэ з табой… Не крыўдуй, карацей…

Мы развіталіся ў адстойніку, ён пайшоў афармляць

дакументы, я – шукаць, хто мяне падвязе па Польшчы. Тут жа мяне тармазнуў ахоўнік, спытаў, "кірувца" я ці не. Я сказаў, што не, і ён павёў мяне да свайго начальніка. Я паказаў пашпарт з шэнгенскай візай, растлумачыў, як мог, што падарожнічаю аўтастопам і шукаю машыну, каб вярнуцца дадому. Начальнік аховы пабубнеў наконт таго, што ў "адстойніку", акрамя кіроўцаў, нікому знаходзіцца нельга, і мяне адпусцілі. Я пайшоў да выезда з адстойніка і стаў так, каб бачыць нумары машын. Пасля некалькіх французскіх і галандскіх фур пад'ехаў "МАН" з беларускімі нумарамі. Я махнуў рукой, ён спыніўся. Невысокі вусаты мужык адчыніў дзверы.

– Выбачайце, не падвязеце?

– А табе куды?

– Мне наогул у Менск.

– А я ў Гародню еду. Ну, да Гародні давязу. Сядай...

*

Наперадзе стаяла чарга фур – кіламетр, можа, ці больш. Гена ўключыў рацыю, спытаў, якія перспектывы.

– Ніякіх, да раніцы, прынамсі, – адказаў нецвярозы голас.

– Ну вось, пачалося ўжо, – сказаў Гена, выключыўшы рацыю. – Зараз будуць бухаць паўночы. Дадому ж прыехалі, усё-ткі...

– Ну, я пайду, напэўна... Да мяжы пешшу, а там, можа, хтонебудзь перавязе...

– Як хочаш... А то – заставайся, паспіш, а да раніцы якраз будзем на пераходзе... Яшчэ гадзіна – і ў Гародні...

– Не, дзякуй.

Мы паціснулі рукі, я выскачыў з кабіны і пайшоў уздоўж фур. У некаторых чуліся галасы, у іншых, пэўна, ужо спалі. Паабапал шашы чарнеў лес. У небе свяціў месяц. Міма мяне на хуткасці пранеслася легкавая машына.

## Паўднёвы Захад

Я выйшаў з аўтобуса. «Ікарус» ад'ехаў, выпусціўшы смярдзючы чорны дым. Я перайшоў праз вуліцу да аблезлых панэльных дамоў. На першым паверсе аднаго, над жалезнымі дзвярыма, была чырвона-жоўтая шыльда з няроўнымі літарамі: «фірма сэйф – аўтамабільная сігналізацыя».

Кватэра была на другім паверсе. Я адамкнуў агульны калідор, пасля кватэру. Унутры было пуста, але яшчэ захаваўся затхлы пах чужога жылля. Рамонт тата не рабіў.

У пакоі каля сцяны валяўся паласаты матрац, паўпрыкрыты коўдрай без падкоўдранкі. На сцяне вісеў каляндар пяцігадовай даўніны – на дзевяносты год – з рэкламай матацыклаў “Мінск”. На чырвоным матацыкле сядзелі і ўсміхаліся хлопец і дзяўчына ў джынсах і скураных куртках.

На падлозе каля сцяны стаялі тры скрынкі ад бананаў. Я адчыніў адну. Зверху ляжалі некалькі пачакаў даляраў і беларускіх рублёў, пад імі – нататнікі, візітоўкі, рахункі, раздру-каваныя на друкарцы. Я падышоў да вакна. Яно выходзіла на вуліцу. Па ёй ехаў “восемдзесят першы”.

Тата купіў гэтую кватэру тыдзень таму. Ён, калі сышоў ад нас, два гады жыў на здымных. Перад ад'ездам мамы ў Аўстралію яны прадалі нашую старую кватэру ў Серабранцы, і тата набыў гэтую. Я павінен быў жыць з ім да лета – скончыць трэці курс, а потым таксама пераехаць у Мэльбурн – да мамы і яе новага мужа.

У другім пакоі зазваніў тэлефон. Ён стаяў на падлозе: стары зялёны апарат з надтрэснутым корпусам. Мабыць, ён застаўся ад былых гаспадароў. Я ўзяў слухаўку.

– Прывітанне, – сказаў тата. – Ну, як табе тваё новае жыллё?

– Нармальна. Я яшчэ, увогуле, толькі зайшоў...

– Ну, прызвычаішся паступова. Рэчы твае давай заўтра перавязем. Я заняты сёння да ночы. Добра?

– Добра.

– Калі трэба вызваліць кватэру?

– Трэба было ўчора.

– Нічога, пацерпяць. Днём болей, днём меней, як казаў філосаф Кант ... Так, жратвы там няма ніякай, і лядоўні таксама няма. Таму ты вазьмі грошай – знойдзеш там, у скрынках, – купі чаго-небудзь. Мяне можаш не чакаць сёння. Я буду позна. Або наогул не прыйду. Зашываемся наогул, проста нейкі піздзец... Добра, усё, прабач, больш размаўляць не магу... абдымаю.

– Пакуль.

Я нахіліўся, паклаў слухаўку на апарат. Усярэдзіне нешта дзынкнула. На сцяне былі налеплены фоташпалеры – бераг мора, пальмы і маленькі белы караблік на гарызонце.

*

– Васемнаццаць тысяч пяцьсот, – сказала прадавачка. Ёй было, напэўна, крыху за дваццаць. З доўгімі русымі валасамі, прыхопленымі па баках заколкамі – «матылькамі».

Я аддаў ёй дваццатку, сунуў хлеб, каўбасу і кетчуп у пакунак, згроб з талерачкі паперкі рэшты. Дзяўчына зірнула на мяне і адвярнулася да касы.

*

Мае рэчы змясціліся ў чатыры скрынкі ад бананаў – яны цяпер стаялі на заднім сядзенні татавай “Мазды”. Усё астатняе я выкінуў – шмоткі, якія больш не буду насіць, кнігі, якія прачытаў і чытаць ўжо больш не буду, касеты з гуртамі, якія даўно ўжо не слухаў.

Мы ехалі па маркотным прыватным сектары. Нізка над дамамі вісела пахмурнае неба.

– Не жадаеш адзначыць пераезд? – спытаў тата. – Можам заехаць ва ўніверсам – пляшку віскі, закускі нармальнай ... Ты як, віскі п'еш?

– П'ю.

– Ну і выдатна... Тады як? Адзначаем?

– Давай.

*

Мы сядзелі ў пакоі на падлозе, прыхінуўшыся спінамі да фоташпалераў. Тата ўзяў пляшку віскі з чорнай этыкеткай, наліў у дзве пластыкавыя шклянкі.

– Ну, давай за цябе, сын. За тое, каб у жыцці тваім усё было так, як ты хочаш сам. А гэта, павер мне, самае галоўнае.

Мы чокнуліся, спляскаўшы шклянкі. Тата выпіў адным глытком, узяў рукой кавалак мясной нарэзкі, праглынуў, павярнуўся, зірнуў на фоташпалеры.

– А на травеньскія, калі трохі разграбуся, з'ездзім адпачыць з табой, не супраць? Да мора… Ты калі апошні раз на моры быў?

– Гады тры таму… Так, тры… У дзевяноста другім… – язык злёгку заплятаўся, хоць я піў значна менш таты. – Ты што, не памятаеш, як мы ездзілі ўтраіх на базу адпачынку…

Тата хмыкнуў.

– Ну ты, брат, даеш… За тры гады гэтыя ведаеш, колькі ўсяго было? Я не памятаю часта, што было ўчора, а тры гады…

Ён узяў бутэльку, наліў сабе яшчэ. Я паказаў, што мне – крыху. Ён наліў трохі больш.

– А цяпер, давай, вып'ем ведаеш за каго? За маму… Ты, можа, думаеш, што калі мы ў канфлікце, і гэ дэ, ці сам ты, можа, крыўдуеш… Зразумей, я магу сказаць табе адно. Можа,

ты і сам пра гэта ведаў. А калі не, то, відаць, пара... Мы гадоў дзесяць ці больш жылі з ёй – ну, нібы кожны сам сабе. Яна сабе, а я – сабе. Не разводзіліся толькі таму, што ты... Каб не траўмаваць цябе... Цывілізаваныя людзі, адукаваныя... Кандыдаты навук усё-ткі. Гэта не якія-небудзь пралетарыі... Ты вось памятаеш хоць адзін скандал?

– Памятаю...

– Ну, адзін ці там два... І гэта за ўвесь час... Ты зразумей, табе тады ўжо было семнаццаць. Дарослы чалавек, усё разумееў. Далей сэнсу не было, зразумей. Саракоўнік мне, 38 ёй... Калі працягваць, то гэта – усё. А так яшчэ ёсць шанцы...

– У цябе зараз хто-небудзь ёсць?

– Не істотна. Нават калі ёсць, гэта на цябе ніяк не паўплывае... А яе я ўсё адно паважаю. І, спадзяюся, яна мяне таксама... Так, забыліся выпіць...

Ён чокнуўся са мной, выпіў, закусваць не стаў. Я зрабіў глыток.

– ...Ну дык вось. Я хачу, каб гэтыя месяцы, пакуль ты тут, табе было добра. Па максімуме. Заўтра ж паедзем і купім відзік з тэлевізарам. І скажы мне, што яшчэ – купім усё, што трэба... І яшчэ... Адчувай поўную свабоду. Прыводзь сюды, каго захочаш – дзяўчат, сяброў. Ты – дарослы чалавек, сам разумееш, каму можна давяраць, а каму не. Абмяжоўваць цябе не збіраюся – ведаю, што гэта такое. Сам та-

бе асаблівай увагі надаць не змагу – працы, блядзь, столькі... – тата прыхінуўся да сцяны, заплюшчыў вочы. – Бізнес ёсць бізнес. Яго трэба ру-хаць, рухаць... Гэта потым ужо, калі ўсё наладзіцца, можна будзе сядзець і пляваць, збіраць капусту. А да гэтага гады два яшчэ трэба ўкалваць. Ну, можа, год...

Я падняўся, трымаючыся за сцяну.

– Я выйду на вуліцу, паветрам падыхаю...

– Вядома, давай. Наперад!

*

На рагу дома, побач з крамай, стаялі мужчына і жанчына. Твараў не было відаць. Мужчына крычаў:

– Ты што, хуёва зразумела, што я табе сказаў? Хуёва зразумела?

Я падышоў бліжэй і пазнаў яе – прадавачку з крамы. Яна была ў кароткай сіняй куртцы і чорных джынсах. Ён – у скуранцы і спартовых штанах: стрыжаны нагала бык.

– Карацей, я табе сказаў...

Ён стукнуў яе кулаком у жывот – дакладней, ледзь вышэй, у «сонейка». Яна зморшчылася, ускрыкнула, адступіла, прытулілася да сцяны, з'ехала па ёй уніз. Я здрыгануўся – успомніў, як балюча, калі б'юць па «сонейку». Бык ударыў яе нагой, таксама ў жывот. Я падышоў.

– Э, а што…

Бык павярнуўся да мяне.

– Хулі ты хочаш? Піздуй адсюль!

– Не чапай яе…

– Што ты сказаў?

– Не чапай яе.

– Э, я не зразумеў, а хто ты ўвогуле такі, га? Ці ты з ім ябешся? – ён паглядзеў на дзяўчыну. Яна плакала. Па шчаках расцякалася туш.

Я паўтарыў:

– Не кранай яе.

– Я зараз цябе крану, бля! Я цябе крану, на хуй!

Ён зрабіў крок да мяне. Я ўдарыў, трапіў яму ў нос. Ён стукнуў у адказ. Кулаком, нагой, яшчэ кулаком – цэліўшы ў твар. Я ўпаў, прыкрыў далонямі галаву. Ён ударыў некалькі разоў па спіне, адышоў.

– Карацей, ты зразумеў. Ніколі не лезь, калі людзі базараць паміж сабой…

Ён павярнуўся да дзяўчыны. Яна паднялася, выцірала твар насоўкай.

*

Тата насыпаў тры лыжкі кавы ў кубак, выняў кіпяцільнік са слоіка, наліў кіпеню.

– Ты сапраўды не хочаш кавы?

– Не.

– Гэтае пытанне мы хутка вырашым. Я патэлефаную Сержыку – ён мае зносіны з кліентурай… Гэтага хуясоса выебуць ў дупу… Тэрмінова не выйдзе – Сярогі няма ў Менску, па справах з'ехаў у Маскву… Але маё слова – закон. Калі я сказаў, значыць зраблю. Ні адна сабака цябе тут не кране. Ты зразумеў?

– Зразумеў.

*

Я зайшоў у краму. Яна мяне пазнала адразу, усміхнулася. Я таксама ўсміхнуўся, падышоў.

– Прывітанне.

– Прывітанне. Прабач, што так…

– За што ты просіш прабачэння?

– Ну, гэта ж з-за мяне…

– А хто ён? І за што ён цябе?

Яна не адказала, насупіла бровы. Я спытаў:

– Як цябе завуць?

– Ларыса. А цябе?

– Алег.

– Ты жывеш тут дзесьці побач?

– Так, нядаўна пераехаў. А ты?

– Так, таксама тут блізка. У дзевяноста другім доме...

*

Мы дайшлі да гасцініцы “Зорка”. З праспекта “Известий” паварочваў “Ікарус”. На паверхні лужыны плавалі вясёлкавыя алейныя плямы.

Я сказаў:

– У гэтай гасцініцы тата хоча зняць офіс. Каб бліжэй да хаты...

Ларыса маўчала.

– Ён займаецца бізнэсам...

Яна зноў нічога не сказала. Я змоўк. На кучы пачарнелага снегу цвыркалі вераб'і.

*

Тата ляжаў на жалезным ложку, пад кропельніцай. На тумбачцы, недарэчна яркія сярод усяго чорна-белага, стаялі

два пакеты імпартнага соку, ляжалі апельсіны. Я прысеў на зэдлік, паглядзеў на тату. Ён зрабіў жэст рукой. Я яго не зразумеў. На маім халаце, на грудзях, пад кішэняй стаяла фіялетавая размазаная пячатка лякарні.

*

Я і Біл стаялі на прыпынку. З метро выходзіў пануры народ, які спяшаецца пасля працы дадому.

– Задрала ўжо чакаць аўтобуса, – сказаў Біл. – Можа, на маторы? У цябе павінны быць бабкі, ці не?

– Бабкі ёсць, сэнсу няма. Ты што, кудысьці спяшаешся? Ёсць, чым заняцца? Зараз падыйдзе восемдзесят першы..

– Добра, як ведаеш...

– Ты мог бы дастаць ствол? – спытаў я ціха, амаль шэптам.

– Што?

– Ствол. І глушак...

– Ты ебануўся?

– Я пажартаваў.

Побач стаялі два пацаны гадоў па пятнаццаць. Адзін казаў іншаму:

– Ну і дзе ён, твой спонсар?

– Не ведаю.

– Калі б мой спонсар быў тут, то даўно б ужо даехалі, узялі б бухла, касеты і сядзелі – адпачывалі. А так мерзнем тут...

*

Я і Ларыса падышлі да майго пад'езда. Спыніліся. На бруднай лужыне з'явілася тонкая скарынка лёду. У ёй адбіваўся ліхтар над дзвярыма пад'езда.

– Можа, зойдзеш? – спытаў я. – Гарбаты пап'ём. Таты няма, ён у лякарні.

– А што з ім?

– Інфаркт. На працы згарэў – так бы мовіць.

Я ўзяўся за ручку дзвярэй пад'езда. Адчыняючыся, дзверы рыпнулі. Святло на першым паверсе не гарэла. Ларыса ўзяла мяне пад руку – у першы раз. Мы падняліся на адзін пралёт – да ліфта. Я націснуў на чырвоную пластмасавую кнопку. Кнопка засвяцілася. Дзесьці наверсе загудзеў ліфт.

*

Тэлевізар працаваў без гуку. Ішоў футбол. Гульцы бегалі за чырвоным мячом па заснежаным полі. Тэлевізар стаяў на кардоннай скрынцы, у якой яго прывезлі – мэблі ўсё яшчэ не было. Я і Ларыса сядзелі на падлозе, прыхінуўшыся да фоташпалераў. Паміж намі стаялі два кубкі з гарбатай і ляжаў надарваны каляровы пачак імпартнага печыва.

– Я заб'ю – таго вырадка, – сказаў я. – Ён цябе больш не кране.

– Яго няма. Ён з'ехаў.

– А якое ён наогул меў права цябе біць? Хто ён? Што ў вас за адносіны?

– Я не магу цяпер пра гэта казаць. Я ўсё табе раскажу, але потым. Добра?

– Добра. Ты застанешся?

– Я магу. Але ты будзеш спаць у іншым пакоі, добра?

– Так, вядома. Ніякіх праблем.

– Зусім ніякіх? – яна ўсміхнулася.

– Зусім-зусім ніякіх.

Я ўстаў, падышоў да вакна. На другім баку праспекта "Известий" свяціліся вокны дзевяціпавярховых дамоў.

– Дзіўна, – сказаў я. – Што праспекты названыя ў гонар газет. Праспект "Известий", праспект "Праўды"... Цікава, хто гэта прыдумаў?

Ларыса паціснула плячыма. На экране гульцы абдымаліся – напэўна, забілі гол.

*

Я прычыніў дзверы. Ларыса спала, накрыўшыся коўдрай. Яна не зняла джынсы, толькі кофту, і засталася ў чорнай майцы. За вакном, ледзь прыкметны на фоне шэрага неба, сыпаўся снег.

*

– Гэта, вядома, справа твая, але неяк усё дзіўна... – Біл адпіў піва з бутэлькі. Мы сядзелі на лаўцы ў пустым скверы. – Яна пра цябе ўсё ведае, а ты пра яе – наогул нічога...

– Ну, не наогул. Ведаю, што яна з Расеі, са Свярдлоўскай вобласці. Што ў яе нейкія праблемы былі дома, бацькі працу страцілі, і потым штосьці здарылася... Але што дакладна, яна не кажа. А ў Менск прыехала, таму што ў яе тут цётка...

– Чаму тады яна жыве не ў цёткі?

– Не хоча яе абмяжоўваць. Таму здымае пакой.

– У прынцыпе, я магу папрасіць сваю маму... У аддзела кадраў – свае адносіны з мянтурай, яны любога чалавека могуць прабіць па базе...

– Яна ж з Расеі ...

– Ну і што, якая розніца? Хоць, можа, гэта і праблема ...

– Добра, забудзься. Усё роўна б я не стаў...

*

Я стаяў у краме, каля ўваходу. Ларыса сядзела за касай. Старая купляла чорны хлеб. Яна сунула Ларысе мятыя дробныя купюры. Ларыса пералічыла іх, паклала ў касу. Старая сунула хлеб у сваю торбу і выйшла. Я падышоў.

– Прывітанне.

Яна ўсміхнулася, кіўнула.

– Прывітанне.

– Як справы?

– Так, як звычайна... Алег, ты не мог бы мне сёння дапамагчы ў адной справе?

– Так, вядома.

– Там нічога такога. Трэба проста з'ездзіць са мной у адно месца. Я магу і сама, але мне неяк будзе спакайней, калі ты таксама.

– Так, добра, вядома.

*

Трамвай каціўся па вуліцы Пляханава, міма аднолькавых панэльных дамоў.

– Наступны прыпынак – крама «Хімрэактывы», – сказаў у мікрафон кіроўца.

– Вось у тым доме мы раней жылі, – я паказаў Ларысе дом.

Яна кіўнула.

– А нам – на наступнай.

Яна была ў цёмна-сініх джынсах і чорным паліто, валасы сабраныя ў хвост. На сядзенні ззаду ад нас, прыплюшчыўшы нос да шкла, спаў мужык.

Трамвай спыніўся. Я выйшаў першы і падаў Ларысе руку. Яна не адразу заўважыла, узялася за яе ў апошні момант – атрымалася, за кончыкі пальцаў.

– Мы зойдзем у пад'езд, падымемся ў ліфце, я пазваню ў кватэру, потым зайду. А ты застанешся на пляцоўцы, добра?

Я кіўнуў.

*

Я наліў гарэлкі сабе і Ларысе – пластыкавыя шклянкі засталіся ад нашай выпіўкі з татам. На паперы былі нарэзаная каўбаса і хлеб, побач стаяла адкрытая банка кансерваваных памідораў.

– Ты мне так і не распавядзеш нічога? – спытаў я. – Ну, хаця б пра тое, куды сёння ездзілі...

– Не, не цяпер... Потым.

– Але ўсё прайшло нармальна?

– Так. Нармальна. Нават добра, – Ларыса ўсміхнулася. – Ты прабач, што я вось так... Я раскажу табе потым, але не цяпер. Давай мы лепш вып'ем.

Мы чокнуліся і выпілі. Зазваніў тэлефон – званкі ішлі адзін за адным, значыць здалёк. Я дацягнуўся, зняў слухаўку.

– Прывітанне, сыночак, – сказала мама. – Ну, як там у вас справы?

– Усё нармальна. І ў мяне, і ў таты...

– Ну і добра. А ў мяне тут... Не, яно, з аднаго боку ўсё ў парадку, я табе і раней казала. Але неяк усё цяжка. Мова ізноў жа... Здаецца, і вучыла на курсах, але яны мяне не разумеюць, і я не разумею іх...

– Нічога, усё гэта з часам ...

– Так, з часам... Ну, пакуль, моцна абдымаю. Тату прывітанне перадавай.

– Пакуль. Я цябе таксама абдымаю.

Я паклаў слухаўку, пасунуўся да Ларысы. Яна паставіла шклянку на падлогу, павярнулася і пацалавала мяне ў вусны.

*

Я прачнуўся ад холаду. Было ўжо светла. Столь была такой жа цьмянай, як неба за вакном. Я нацягнуў коўдру на сябе і на Ларысу. Побач з матрацам ляжала на падлозе пустая

бутэлька, стаялі шклянкі і рэшткі ўчорашняй ежы. Я заплюшчыў вочы.

*

Я пазваніў у дзверы. Доўга за ёй было ціха, потым пачуліся крокі. Брыдкі старэчы голас спытаў:

– Хто там?

– Я да Ларысы, да вашай кватаранткі ...

– Няма яе ўжо. Паехала яшчэ ўчора.

– Як – з'ехала? Куды?

– Адкуль я ведаю? Яна адрас не пакінула. А чаго табе трэба ад яе? Можа, грошы павінна? Мне таксама павінна 3000. Брала мой цукар, муку, соль, а грошы не пакінула... Ты схадзі ў краму, дзе яна працуе...

– Хадзіў ужо. Яна звольнілася, і ніхто нічога не ведае.

Я павярнуўся і пачаў спускацца па лесвіцы. Насустрач ішлі два пацаны і дзяўчына, усім – гадоў па шаснаццаць. Адзін з пацаноў трымаў у руцэ касеты з відэапракату.

*

Я і Ларыса ішлі па двары. Я спытаў:

– Чаму ты працуеш прадавачкай? Ты ж зусім не падобная да гэтых прадавачак – цётак або маладых дзевак... А раней ты кім працавала?

– Я не працавала, я вучылася. Скончыла філфак.

– А чаму не пайшла па спецыяльнасці?

– Час такі... Якая тут спецыяльнасць? Плюс, столькі ўсяго навалілася... Я табе раскажу, абавязкова раскажу.

Ларыса павярнулася, паглядзела на мяне – і паслізнулася на брудным лёдзе. Я паспеў злавіць яе за руку. На галінках дрэў крычалі вароны. Па вуліцы Пляханава ехаў трамвай.

## Матэматыка

Класная падышла да Ніканенкі – яна сядзела праз шэраг ад мяне – нахілілася да яе.

– Якое заданне не ведаеш? – шэптам спытала яна.

Ніканенка – у белым карункавым фартуху паверх карычневай сукенкі і чорных калготак у сетачку – тупа глядзела на Класную.

– Што, ніводнага?

Ніканенка пакруціла галавой. Класная насупіла лоб.

– Гэта ж трэба, – зашыпела яна. – Давучыцца да канца дзясятага класа і не ведаць ніводнага задання ...

Яна пайшла да настаўніцкага стала. За ім матэматычка Коліна рашала заданні пад капірку – каб усе паспелі спісаць.

Я свае ўжо рашыў, прычым сам – яны былі лёгкія, – потым даў спісаць Кузьмянковай і цяпер маляваў ня чарнавіку матацыклістаў, музыкаў з гітарамі і дзяўчат, але не голых, а ў купальніках – раптам Класная або Коліна ўбачаць. Сысці было нельга: Коліна сказала ўсім «медалістам» – мне, сваёй дачцэ, Саўчанцы і Сямёнавай – дачакацца канца, а потым яна скажа, што нам рабіць з працамі, каб усё было ў парадку і ў райана не прычапіліся.

Класная шыпела на Ніканенку:

– ...І падпісаць не забудзься. «Экзаменацыйная работа па матэматыцы вучаніцы дзясятага “Б” класа сярэдняй школы нумар семнаццать горада Магілёва». І дату сённяшнюю – 1 чэрвеня тысяча дзевяцьсот восемдзесят дзявятага года.

*

Па двары школы, паміж ганкам і зялёным плотам, насіліся дзеці са школьнага летніка – клас, напэўна, трэці ці чацвёрты. Дзве іх настаўніцы стаялі каля плота, балбаталі.

Малы і Лапа чакалі мяне.

– Ты дарма да Кузьмянковай лез, – сказаў Малы.

– Я да яе не лез.

– Гэта значыць, яна ўсё спіздзела?

– Па-першае, я жартам. А па-другое – гэта наогул цябе не тычыцца, зразумеў?

Малы паглядзеў на Лапу. Лапа зрабіў тупы твар – быццам не разумее, пра што гаворка. Ён быў вышэйшы і мацнейшы за мяне, але ўсё роўна б не рыпнуўся, як бы Малы яго ні падбухторваў. Увесь дзявяты клас і палову дзясятага мы сябравалі – я, Малы, Лапа і Кеша, усе пацаны у класе. Потым я ад іх адкалоўся.

– Дарма ты так, Вова, – Малы скрывіўся, пакалупаў у зубах пальцам з абгрызеным пазногцем. – Ты што думаеш, што

калі там ёй дапамог, то яна зараз павінна табе даваць ці штосьці там такое?

– Я нічога не думаю. Гэта – нашы з ёй справы, ты зразумеў? Я наогул ні хера не разумею, пры чым тут ты?

– Як – пры чым? Я хаджу з яе сяброўкай, і яна мяне папрасіла ...

Адзін з малых падставіў іншаму падножку. Той зваліўся на асфальт, падраў у кроў калена, пачаў лямантаваць на ўвесь двор. Настаўніца з незадаволенай мордай падышла, схапіла крыўдзіцеля за руку, пачала лупіць далонню
па дупе.

– Я табе яшчэ раз кажу – скончым гэтую размову. – Я паглядзеў на Малога. – Ніхто нікому нічога не рабіў, ясна? А хто што кажа...

– За базар трэба адказваць...

– Добра, усё, пакуль.

Кузьмянкова сказала, што «дасць» мне, калі я дам ёй спісаць на іспыце па матэматыцы. Я не паверыў, але падкалоў яе наконт гэтага і толькі потым перадаў ёй сваю працу. У любым разе, ад мяне нічога не залежала, спісала б, як усе. Навошта толькі было скардзіцца Малому і Лапе?

*

Мы выйшлі з аўтобуса "плошча Арджанікідзэ – Сельгастэхніка" – я, Сямёнава і Саўчанка. Я быў у вараных джынсах за 120 рублёў з кааператыўнай крамы «Патэнт», Сямёнава і Саўчанка – у дэбільных савецкіх сукенках з прамтаварнай крамы. Мне было трохі сорамна ісці побач з імі, але ў Буйнічах мяне амаль ніхто не ведаў. Коліна з мамкай жыла ў дзевяціпавярховіку – адным на ўвесь пасёлак. Вакол яе стаялі тры пяціпавярховікі, потым пачынаўся прыватны сектар. За пераездам тырчалі шэрыя карпусы "сельгастэхнікі".

– А чаму яна паклікала нас да сябе? – спытаў я. – Можна ж было і ў школе ўсё перапісаць…

– Баялася, напэўна – раптам хто-небудзь з райана прыедзе, захоча праверыць, – адказала Саўчанка.

– А як Кузьмянкова напісала іспыт? – Сямёнава паглядзела на мяне, засмяялася. – Мабыць, на пяць, так?

– Адкуль я ведаю?

– Можна падумаць, ты ёй не даваў спісаць…

– А калі і даваў, што з таго?

– А яна што-небудзь табе паабяцала за гэта? – спытала Саўчанка і таксама пачала ўсміхацца.

– Гэта не ваша справа.

– Яна табе не дасць. У сябе на Ямніцкім усім дае, а табе не дасць. Яна сама сказала...

– Не лезьце не ў сваю справу, зразумелі?

Мы падышлі да пад'езда. На лаўцы сядзелі дзве старыя, утаропіліся на нас.

– А вы гэта да каго? – спытала адна.

– Да хера аднаго, – нягучна сказаў я.

Сямёнава і Саўчанка зашыкалі на мяне.

*

Саўчанка пазваніла. Адчыніла Коліна – у палінялых старых джынсах і чырвонай майцы.

– Заходзьце, – сказала яна. – Мама зараз прыйдзе, выйшла ў краму.

Мы разбуліся ў вузкай вітальні – там ледзь знайшлося на падлозе месца для ўсяго абутку – і прайшлі ў пакой.

Я ніколі не быў у кватэры ў Колінай – наогул не быў ні ў каго з нашых баб, а тым больш у дачкі настаўніцы. Пакой быў падобны на наш вялікі: «сценка», канапа, дыван на сцяне над канапай, два фатэлі, часопісны столік на колцах, на ім – прайгравальнік “Вега” з калонкамі. У кутку былі яшчэ адны дзверы – на кухню. На падваконні стаялі ў белых шклянычках з-пад смятаны парасткі памідораў.

Саўчанка з Сямёнавай селі на канапу, сталі разглядаць пласцінкі: “Модэрн токінг”, “Сікрэт сервіс”, “Навагодняя дыскатэка”, “Замежныя танцавальныя мелодыі”. Я падышоў да кніжнай паліцы “сценкі”. Кніг на ёй было мала. Пушкін і Гогаль з серыі “Класікі і сучаснікі” з пацёртымі карэньчыкамі, некалькі кніг па матэматыцы, старыя дзіцячыя кнігі – у мяне таксама такія былі: “Аліса ў краіне цудаў”, “Віця Малееў ў школе і дома”, “Карлсан, які жыве на даху».

– Ну як Кузмянкова? – спытала мяне Коліна. – Пяцёрку дакладна атрымае па матэматыцы?

– Вы, блін, змовіліся, ці што? Адкуль я ведаю, што яна атрымае? Усе заданні і так усім давалі...

– Не, не ўсім. Мама сказала – строга па адзнацы за год. Калі чацвёрка, то чатыры заданні, калі тройка, то тры. Каб не было так, што за чвэрць – тройка, а іспыт на пяць. У раймана тады прычэпяцца... А ці праўда, што Кузмянкова табе паабяцала, што калі ты ёй дасі спісаць, то...

У пярэднім пакоі шчоўкнуў ключ, адамкнуліся дзверы.

*

Я і Коліна перапісвалі працы, седзячы за часопісным столікам, Саўчанка і Сямёнава – на кухні. У заданнях па геаметрыі малюнкі размалёўвалі каляровымі алоўкамі з вялікай скрынкі «Мастацтва» – у мяне такая таксама была, класе ў першым ці ў другім.

Коліна-мамаша гартала мой чарнавік.

– Ну скажы мне, Вова, што гэта такое? Што гэта за малюнкі? Я што, не гаварыла, што чарнавікі райана таксама будзе глядзець?

– Навошта?

– Як – навошта? Раптам у чыставік ты зрабіў памылку, няправільна штосьці перапісаў, а на чарнавіку ўсё правільна? Карацей, чарнавік ты таксама перапішаш, зразумеў?

Я кіўнуў.

*

На вуліцы цямнела. Мы сядзелі на кухні і пілі гарбату. Кухня была маленькая, і мне месца за сталом не хапіла. Я стаяў з кубкам каля вакна, абапёршыся аб падваконне. На падваконні стаяў вялікі пыльны сталетнік. У вазоне, сярод камякоў сухой зямлі, валялася дохлая муха.

Коліна-мамаша – распавядала:

– ...Ну і, увогуле, думалі, што гэта хто-небудзь з вучняў – самі ведаеце, якія ў нас ёсць тут "кадры". Але потым я паглядзела – знікаюць грошы толькі ў дзень палучкі і авансу. А адкуль могуць ведаць вучні, у які дзень у настаўнікаў аванс ці заробак? Вось вы ведаеце?

– Я ведаю, – Коліна засмяялася.

– Ты маўчы, ты-та канечне ведаеш... Увогуле, я падумала, што гэта хто-небудзь з настаўнікаў. І дырэктару сказала – а давайце мы не будзем выклікаць міліцыю. Лепш самі высветлім, хто гэта робіць... Што нам міліцыя дапаможа? Карацей, я прыйшла дадому і стала думаць – хто б гэта мог быць? Раз – дваццаць рублёў з сумкі, потым дваццаць пяць, потым – пятнаццаць... Можа, яшчэ хто хоча гарбаты? Вова?

Я кіўнуў.

Коліна ўзяла мой кубак, зліла ў ракавіну рэшту, наліла заваркі і кіпню. Я сунуў чайную лыжку ў сподачак з вішнёвым варэннем.

– ...Ну і, увогуле, стала я думаць – хто б мог? Ну, вы ўжо ўсе дарослыя, акрамя таго, школу амаль скончылі... Увогуле, вам ужо можна ўсё расказаць. Карацей кажучы, Святлана Мікалаеўна выпівала. Усе гэта ведалі, але пакуль ні да чаго такога не даходзіла, то глядзелі на гэта, спусціўшы рукавы... Але вы ж разумееце – на гарэлку таксама грошы патрэбныя, і немалыя, асабліва пасля падаражання. А з настаўніцкай зарплаты... Тым больш у яе – у фізкультурніцы – ні сшыткаў, ні класнага кіраўніцтва... І акрамя таго, чалавек які п’е – сябе не кантралюе, ён ні перад чым не спыніцца, калі трэба выпіць. Пра яе я першую і падумала. Потым задаю сабе пытанне: хто ў нас яшчэ п'е ў школе?

– Ваенрук, – сказала Саўчанка. – У яго твар чырвоны, як у алкашоў.

Усе засмяяліся.

– Ну, гэта ўсе ведаюць, – Коліна-мамаша ўсміхнулася. – І я таксама пра яго падумала, што хаваць? Але яго ў дзень аванса ў школе не было наогул, у яго па чацвяргах няма гадзін. Значыць, адпадае. Я спецыяльна сядзела ў настаўніцкай, пакуль усе не сышлі па сваіх кабінетах, потым выйшла, зайшла ў геаграфію. Гэта ж насупраць, і ўрока там няма. Вызіраю з-за дзвярэй – прама, як шпік, – яна засмяялася. – І што вы думаеце? Лобчанка – тут як тут. І прама ў на-стаўніцкую. А ўрок ужо, можа, дзесяць хвілін, як ідзе. Што ёй там рабіць? Я троху пачакала – і туды. І сапраўды, яна.
І па сумках лазіць...

– І што потым? – спытала Саўчанка.

– Яна, вядома, паспрабавала адмаўляцца. Але я ж яе, што называецца, на месцы злачынства засякла. Увогуле, пайшлі з ёй да дырэктара... І Уладзімір Сяргеевіч адразу кажа: не трэба, маўляў, смецце з хаты выносіць, вы вернеце ўсе грошы, якія ўзялі і пойдзеце па ўласным жаданні.

– А яна?

– А куды ёй дзявацца? Мы ж маглі міліцыю выклікаць, пайшла б пад суд... Так і вырашылі. Тым больш, што якраз чвэрць канчалася... Вось так мне давялося пабыць шпікам...

*

Мама хадзіла па пакоі туды-сюды. Я і тата сядзелі на канапе. Тэлевізар працаваў без гуку. Ішоў «Пражэктар перабудовы».

– ...Не, ну я проста слоў не знаходжу... – казала мама. – Гэта ж трэба – закрэсліць “пяцёрку” і паставіць “чатыры”... Усім чатыром выдатнікам... Аб чым яны там наогул думаюць, у гэтым райана? Перакрэсліць усе дзесяць гадоў вучобы... І Коліна на што глядзела? Навошта было потым перапісваць гэтыя працы, калі толкам яна не праверыла...

– Якая розніца? – спытаў я. – Залаты медаль, срэбраны? Бо гэта не ўплывае на паступленне...

– Ну і што, што не ўплывае? Табе што – прыемна? Быць выдатнікам, а потым апынуцца з адной чацвёркай з-за нейкіх там ідыётаў у райана... З'ездзі, пагавары з імі! – яна паглядзела на тату.

– А сама чаму не хочаш? – спытаў ён.

– Я б паехала, але я не змагу стрымацца... Я там дакладна зладжу скандал, і ўсё будзе толькі горш... Едзьце заўтра. Удвух...

*

Тата пагрукаў у дзверы з таблічкай “намеснік начальніка райана Юрчанка В.Ф.”. Ён быў у сваім лепшым касцюме – шэрым, у тонкую клетку. Я таксама ў касцюме – яго купілі для выпускнога, але я ўжо быў у ім на апошнім званку.

– Заходзьце, – пачулася з-за дзвярэй.

Мы ўвайшлі. За сталом літарай “Т” сядзела тоўстая цётка.

– Добры дзень, праходзьце, калі ласка... Гэта вы з семнаццатай школы, так? – яе свіная морда расплылася ва ўсмешцы.

Мы селі на крэслы. За спіной Юрчанкі, паміж шклом “сценкі”, былі ўстаўленыя некалькі “ганаровых грамат” з партрэтам Леніна. Побач з імі стаяў сувенір – ракета на ўзлёце.

– Так, я ў курсе, вядома, вашай справы, і я яшчэ раз праглядзела працу... Так, праца вельмі добрая, толькі вось гэты адзіны маленькі недахоп...

– Там жа ўсё правільна, я проста забыўся ў формуле мінус адзін у эннай ступені... Проста не напісаў... Але ўсё роўна ж усё правільна...

– Вы ведаеце, я, шчыра кажучы, не эксперт у трыганаметрыі... У мяне гуманітарная адукацыя, і я выкладала гісторыю... Але мае калегі яшчэ раз зірнулі і сказалі, што гэта – сур'ёзная памылка...

– А можа, штосьці ўсё-ткі можна зрабіць? – спытаў тата.

– Баюся, што ўжо нічога. Але вы не хвалюйцеся, і малады чалавек няхай не хвалюецца... Вы ж усё роўна атрымаеце медаль, толькі крыху іншай вартасці... А на льготы пры

паступленні гэта ніяк не паўплывае... Куды вы будзеце паступаць? – яна зноў засмяялася.

– У СПТВ нумар адзін. На трактарыста.

Я падняўся і выйшаў з кабінета, тата – следам за мной.

– Навошта ты так? – спытаў ён у калідоры. – Раптам, гэтая падла што-небудзь зробіць цяпер?

– А што яна можа зрабіць?

– Ну, не ведаю... – ён паціснуў плячыма.

– Нічога яна не зробіць. Што хацела, ужо зрабіла.

Мы выйшлі на ганак.

– Ну, я на працу, – сказаў тата. – Ты дадому?

– Так. Добра, давай ...

*

Я сядзеў на заднім сядзенні тралейбуса, спіной па ходу руху. Тралейбус праехаў дом культуры завода Куйбышава з калонамі, стадыён – мы здавалі на ім залік па фізкультуры, шэры двухпавярховы будынак сямідзесятага “вучыла” і дзевяціпавярховы інтэрнат побач з ім, плот таксапарку. У задняга шкла стаяў мужык з чырвонай мордай і шнарамі на носе, у сінім спартовым касцюме. Ён паглядзеў на мяне, падышоў.

– Ты, я бачу, нармальны пацан. Карацей, слухай, “дело есть”...

– ...Хуй зварыўся, будзеш есці?

– Ну, ты малайчына... – мужык заржаў. – Трымай пяць!

Ён сунуў мне далонь з перабінтаваным вялікім пальцам. На бінце была засохлая кроў.

– Карацей, слухай сюды. Ідзем цяпер у піўбар, ёбнем па трыццаць кропель... Што скажаш, га? Ты дзе выходзіш, на Працоўным?

Я кіўнуў.

– А грошы ёсць?

– Ёсць. Толькі дома.

– Ну і нармальна. Пайшлі цяпер да цябе зойдзем, ты возьмеш грошы ... А хто ў цябе дома?

Я не адказаў. Мужык працягваў.

– А ты ведаеш, хто я? Я – шафёр, аўтагонкі там, хуё-маё... Ралі. Я наогул сам з Эстоніі. “Вайя кууми нуутаме”. Ведаеш, што гэта такое? Гэта – пайшоў на хуй па-эстонску, зразумеў?

Тралейбус пад'ехаў да Маторнага. Я падняўся.

– Э, пачакай, – сказаў мужык. – Ты ж казаў – на Працоўным...

Стоячы, я быў вышэйшы за мужыка на паўгалавы. Ён узяў мяне за рукаў. Я вырваў руку і выйшаў з тралейбуса.

*

Да прыпынку пад'ехаў аранжавы "Ікарус". "Плошча Арджанікідзэ – Сельгастэхніка". Я зайшоў у заднія дзверы. Аўтобус крануўся. Людзей было няшмат. На другім сядзенні ззаду, да мяне спіной, сядзела Коліна. У джынсах – "пірамідах" і белай польскай кофце. Я падышоў.

– Прывітанне.

– Прывітанне, – яна ўсміхнулася, паглядзела на мяне знізу ўверх. – Як справы?

– Нармальна. З вучобы?

– Так. Ты, напэўна, таксама?

Я кіўнуў.

– І як табе?

– Нармальна. Застаўся апошні залік, праз тыдзень – першы іспыт. А ў цябе?

Яна пацiснула плячыма.

– У мяне ўжо сесія ідзе. Адзін экзамен здала. “Тэхналогію машынабудавання”. Потым – практыка два месяцы. На заводзе…

– А паступаць ты зноў не будзеш? На фізмат…

– Не ведаю. Мама кажа, што тузацца не трэба, раз паступіла ў тэхнікум – то трэба скончыць… Няхай будзе хоць нейкая спецыяльнасць…

– А табе яна падабаецца – спецыяльнасць?

Яна пахітала галавой.

– Навошта тады заканчваць?

Коліна не адказала. Аўтобус праязджаў “Менжынку”. На пяціпавярховым доме вісеў вялікі аблезлы плакат. Чырвоныя літары “Партыя – наш рулявы” і морда Леніна.

– Як Кузьмянкова пажывае? – спытала Коліна.

– Адкуль я ведаю?

– Я нічога такога не маю на ўвазе… Можа, думала, проста бачыў яе…

– Бачыў месяцы два назад… У тралейбусе разам ехалі – я з інстытута, яна са свайго «вучылa»…

– А ў якім яна?

– Не памятаю… Здаецца, у сто трыццаць восьмым…

Тоўстая цётка каля вакна, побач з Колінай заварушылася на сядзенні, падняла з падлогі торбы. Коліна паднялася, прапусціла яе, села да вакна. Я сеў побач.

– Ты ведаеш, а гэта нам з-за Лобчанкі закрэслілі «пяцёркі» ...

– Як – з-за Лобчанкі? Прычым тут яна?

– У яе брат працуе ў районе... Нейкі начальнік. Мне мама распавяла па сакрэце, а ёй таксама хтосьці... Ну, і ён за яе адпомсціў. Тым больш, Класная сама няправільна зрабіла – навошта было з семнаццаці чалавек чатырох залатых медалістаў? Тым больш, школа на дрэнным рахунку, і раён дрэнны... Трэба было, каб толькі ты і я. А Сямёнаву і Саўчанку дарма на пяцёркі цягнулі... Калі б усяго двое, то тады б, можа, і не прычапіліся б...

У “пірамідах” і польскай кофце Коліна глядзелася нядрэнна. Не параўнаць, як у школе. Яшчэ і нафарбавалася, і начос зрабіла. У пачатку дзявятага класа яна за мной “бегала”, але я зрабіў выгляд, што нічога не заўважыў. Вядома ж, з-за яе мамашы.

Аўтобус пад'ехаў да Маторнага. Я ўстаў.

– Пакуль.

– Пакуль, – Коліна кіўнула.

Я пайшоў да дзвярэй.

## Лета дзевяць адзін

Мы пазнаёміліся на дзень горада, калі на пляцоўцы каля ДК “Хімвалакно” ішоў канцэрт. Мясцовыя гурты гралі паныла і без настрою, гук быў каравым. Іх і не слухалі – на лаўках перад пляцоўкай сядзелі два дзясяткі выпадковых людзей – пенсіянеры, дзеці з бацькамі, алкашы.

Я прыйшоў на канцэрт ад няма чаго рабіць. Заканчваліся вакацыі ў інстытуце, і большую частку іх я прасядзеў дома, часам выбіраючыся ў відэасалон на які-небудзь фільм. Часцей за ўсё фільм аказваўся тупым. На другой песні гурта “Дзень і ноч” паміж сцэнай і лаўкамі пачалася бойка. Некалькі гопнікаў аддубасілі валасатага чувака. На выгляд яму было за трыццаць. Я не ведаў, за што, і хто быў вінаваты. Я толькі бачыў, як чырвонатвары вялізны гопнік, пасміхаючыся, надаваў валасатаму кулакамі па мордзе. Валасаты паваліўся, астатнія злёгку пабілі яго нагамі і звалілі:

канцэрт іх не цікавіў. Хлопец падняўся, выцягнуў насоўку, выцер кроў. Музыкі зрабілі выгляд, што нічога не здарылася.

– Яны павінны былі спыніць канцэрт, – сказала дзяўчына на суседняй лаўцы, у джынсавай куртцы, з рудымі валасамі. Яна сядзела адна, і я не заўважыў, калі яна з'явілася.

– Так, вядома, – адказаў я. – А я цябе памятаю. Ты ж была ў красавіку ў «Хімвалакно» на «Року чыстай вады»?

– Так, была. Давай пойдзем нафіг адсюль.

І мы пайшлі гуляць па вуліцах. З дрэваў абсыпалася першае жоўтае лісце. З трубаў завода Куйбышава ў неба валіў дым. Насустрач нам ішла моладзь у джынсах-"мальвінах" і майках "Chanel", прывезеных з Польшчы.

Яна распавяла, што вучыцца ў педінстытуце, на фізмаце, перайшла на другі курс, што ходзіць на ўсе рэдкія рок-канцэрты ў нашым горадзе, што яе любімы гурт – "Кіно", і калі год назад Цой загінуў, яна некалькі дзён не магла прыйсці ў сябе, а потым зайздросціла тым хлопцам і дзяўчатам, якія жылі ў намётах на ягонай магіле, і сама хацела б так, але бацькі ніколі б не адпусцілі яе. Яны таксама не адпусцілі яе на канцэрт да ўгодкаў Чарнобыля ў Менску, у канцы красавіка.

І я распавёў, што ездзіў на той канцэрт, ездзіў адзін, таму што былыя школьныя прыяцелі і цяперашнія аднагрупнікі слухаюць, у асноўным, іншую музыку, альбо не слухаюць увогуле ніякай. А на канцэрце ў Менску – на стадыёне

“Дынама” – было шмат усялякага, і добрага, і не вельмі. Недарэчна ўперліся туды папсовыя “Машина времени” і гурт Ігара Талькова, а тым, каго чакалі больш за ўсё – ДДТ і Грэбеншчыкова – толкам адыграць не далі: у пачатку выступу ДДТ на стадыёне вырубілі святло, а БГ наогул не паспеў выйсці. А потым я ехаў на аўтобусе да “Менска – Паўднёвага”, на электрычцы – да Асіповічаў, сядзеў дзве гадзіны да дызеля на Магілёў у цеснай зале станцыі, а побач хроп мужык у ватоўцы...

Я правёдзіў яе дахаты на вуліцы Народнага Апалчэння – такой жа пяціпавярхоўкі, як наша. І мы дамовіліся сустрэцца заўтра.

*

Мы вырашылі, што паедзем разам у Піцер – ні я, ні яна там ні разу не былі, а потым паедзем на мора. Пляваць, што вакацый засталося зусім троху. Пляваць, што бацькі будуць ныць і адгаворваць, і прыводзіць аргументы наконт вучобы і наконт таго, навошта гэта нам наогул трэба. Яны нас ніколі не зразумеюць, і мы ніколі не зможам ім нічога растлумачыць. І не будзем. Мы дарослыя людзі і ад іх не залежым. Нават грошы на гэтую паездку мы самі знойдзем – рэшткі стыпендый і мая калекцыя марак, якую можна прадаць праз краму “Букініст” – я бачыў там аб’яву.

*

У дзень, калі мы пайшлі купляць квіткі, здарыўся ГКЧП. Па тэлевізары паказвалі “Лебядзінае возера”, альбо сядзелі маркотныя дзядзькі з сумнымі тварамі, казалі бессэнсоў-

ную лухту. Нам было на іх напляваць.

У касах насупраць «кітайскай сцяны» стаяла звычайная чарга, таксама людзі з сумнымі тварамі. Мы не хацелі быць такімі, як яны, і мы ведалі, што ніколі такімі не будзем. Мы купілі квіткі на дваццаць першае - паслязаўтра. Дома - і ў мяне, і ў яе – былі скандалы: куды ты паедзеш, тым больш, што такое здарылася – раптам наогул пачнецца невядома што, грамадзянская вайна? Яе бацькам падтаквала сястра, маладзейшая на два гады, і ў выніку сёстры трохі пацягалі адна адну за валасы – яна распавяла потым, смеючыся.

Маім падтакваць было няма каму, але ў іх быў іншы аргумент: вучоба. На другім курсе я ледзь не вылецеў з "машынкі" з-за прадмета пад назвай ТАЭ – тэарэтычныя асновы электрычных ланцугоў. Я ненавідзеў пачвару-выкладчыка і асабліва гэтага не хаваў. Ён лічыў сябе "шасцідзясятнікам", я лічыў яго мудаком. І прадмет я наогул не вучыў - прынцыпова, - спадзяваўся спісаць на іспыце. Выкладчык перашкаджаў мне спісаць – таксама прынцыпова. Вынік – тры пераздачы іспыту ў зімовую сесію, якія расцягнуліся да канца лютага. І цяпер бацькі казалі пустыя словы пра вучобу, пра тое, што нельга прапускаць ніводнага дня, тым больш, у самым пачатку навучальнага года. Я слухаў і не супярэчыў, ведаючы, што ўсё роўна зраблю, як хачу.

*

Калі мы садзіліся ў цягнік, было вядома, што ГКЧП прайграў, што ўсё будзе, як раней, а можа быць – лепш, таму што цяпер камунізм сябе канчаткова дыскрэдытаваў.

Але мы пра гэта не думалі.

У Піцеры мы спачатку паехалі на магілу Цоя. Там ужо не было ніякіх намётаў, толькі шмат букетаў і цыгарэт, і тусаваліся хлопцы, якія прыехалі з розных гарадоў і рэспублік. Нас пачаставалі партвейнам, я падладзіў сваю гітару і праспяваў пару песень – "Видели ночь" і "Группу крови". Спяваў дрэнна, саромеўся – я вельмі рэдка спяваў нешта пры людзях. Але ніхто мяне не лажаў, усе слухалі і падпявалі.

А потым мы паехалі на Рубінштэйна, трынаццаць – у рокклуб. У двары тоўпіліся хлопцы і дзеўкі, за металічнымі дзвярамі было маленькае памяшканне. У адной яго палове сядзеў валасаты барадаты мужык, які кіраваў гуказапісам. Побач віселі спісы гуртоў і альбомаў, якія можна было запісаць на касеты. Многія назвы мы раней не чулі – напрыклад, "Хуй забей". Чыстых касет у нас не было, і мы проста стаялі каля спісаў і чыталі іх. А потым нейкі чувак ў пальчатках без пальцаў сеў за раяль у куце і пачаў граць. Ні я, ні яна не ведалі яго ў твар, але, магчыма, ён граў у якім-небудзь з вядомых гуртоў.

На Неўскім праходзілі палітычныя мітынгі, а ў пераходзе купка пацаноў гадоў па шаснаццаць грала рок-н-рол. Мы іх паслухалі, кінулі рубель у шапку, потым пайшлі да Нявы і селі на каменных прыступках ля вады, глядзелі на прагулачныя кацеры і Петрапаўлаўскую крэпасць на іншым беразе.

Мы начавалі ў бабулькі, якая прапануе начлег ля Маскоўскага вакзала, у старой кватэры з высокімі столямі, у па-

коі з відам на двор-калодзеж. Пакуль мы ішлі ад вакзала да хаты, бабулька без супыну паўтарала, што яе не цікавіць, хто мы, муж і жонка альбо не, галоўнае, што мы рускія, а то суседзі па пляцоўцы не любяць, калі на начлег да яе прыходзяць армяне і азербайджанцы.

Увесь наступны дзень мы бадзяліся па Піцеры. Мы купілі і выпілі банку імпартнага піва за пятнаццаць рублёў – хлопцы са скрынямі гэтых бляшанак стаялі паўсюль. Піва здалося звычайным, такім жа, як наша. Мы ездзілі на Васільеўскі востраў, дзе няма вуліц, а толькі “лініі”. Мы шукалі “Сайгон”, але не памяталі нумар дома і не ведалі, ён яшчэ там ці зачыніўся. Мы хацелі схадзіць куды-небудзь на канцэрт, але афішаў канцэртаў не было, нават у рок-клубе. Мы сядзелі на лавачках у скверы ля Віцебскага вакзала, і на лавачцы побач дзве дзяўчыны ў чыгуначнай форме цалаваліся ўпрысмок.

Тым жа вечарам мы селі ў плацкартны вагон цягніка “Ленінград – Адэса”. З намі на верхніх паліцах ехалі хлопцы з Вінніцы – яны прывозілі сюды на продаж яблыкі, а на зробленыя грошы купілі шмат блокаў цыгарэт. Іх торбы з цыгарэтамі стаялі на трэціх паліцах.

Раніцай цягнік спыніўся насупраць вакзалу ў Магілёве. Нязвыкла было прыехаць у свой горад, але не выходзіць з вагона, а заставацца і ехаць далей. Ішоў дождж. Па пероне ехаў электракар, цягнуў за сабой прычэп з пасылкамі. Старая з парасонам прадавала семкі ў скрутках з газеты.

*

Мы выйшлі з вагона ў чатыры гадзіны раніцы. Было цёпла і цёмна, пахла паўднёвымі раслінамі, людзі цягнулі па пероне валізкі і торбы, а над вакзалам свяціліся літары “Горад-герой Адэса”. Мы пайшлі шукаць мора. У скверы побач з вакзалам, на лаўцы спаў мужык у майтках. Мы вырашылі, што яго, напэўна, абрабавалі, але нам было ўсё роўна.

Світала. Мы выйшлі да Пацёмкінскай лесвіцы, спусціліся па ёй да марскога вакзала, селі на лаўцы, прыціснуўшыся адно да аднога, і глядзелі, як з мора выплывае чырвоны шар сонца. Потым я наладзіў гітару і спяваў песню “Звезда по имени Солнце”, яна падпявала, і мне здавалася, што я спяваю лепш, чым тады, у Ленінградзе, на могілках. Па Пацёмкінскай лесвіцы спускаліся і падымаліся людзі, а па вуліцы перад ёй праязджалі, сігналячы, тралейбусы і машыны.

У нас не было планаў, нам не было куды спяшацца. Мы спыталі, як праехаць на пляж, селі ў трамвай на Аркадыю. Усю другую палову дарогі зялёныя галінкі дрэў білі па шыбах трамвая.

Мора было прахалодным, але мы доўга не хацелі вылазіць з вады, і нам было пляваць, што пакуль мы купаемся, нехта можа скрасці нашыя шмоткі, грошы ці гітару. І ніхто нічога не скраў. Мы былі на пляжы да самага вечара, потым елі шашлыкі ў кафэ побач з пляжам і глядзелі на белыя параходы на гарызонце.

Ля Пацёмкінскай лесвіцы, наверсе, спяваў пад гітару высокі барадаты мужык. Каля ног яго ляжаў пластыкавы

пакет для грошай. Нехта кінуў манеткі, не патрапіў, і яны бразнулі аб асфальт. Мужык, не спыняючы граць, сказаў:

– Просьба грошы не раскідаць. Прыбіраць няма каму...

Мы прыйшлі на чыгуначны вакзал. Было позна, і бабулькі, якія прапаноўвалі пакоі, разышліся. Мы селі на лаўцы ў зале чакання. У кутку інвалід ў вазку еў недаедкі, расклаўшы іх на газеце. У відэасалоне ўсю ноч ішлі фільмы, але мы не пайшлі іх глядзець, спалі на лаўцы, а раніцай знялі пакой у бабулькі. У яе была хата і вінаграднікі, і яна рабіла вінаграднае віно. Нам яна прадавала яго зусім танна, па 3 рублі за бутэльку.

*

Праз некалькі дзён пахаладала. Купацца стала ўжо не ў кайф. Позна ўвечары мы развіталіся з бабуляй і паехалі на вакзал.

– Давай з’ездзім куды-небудзь яшчэ, –сказала яна. – Я пакуль не хачу дадому.

Бліжэйшы цягнік быў на Кішынёў – у два-дванаццаць. Мы набылі квіткі, селі ў агульны вагон: грошай заставалася няшмат.

Раніцай, калі мы прачнуліся, цягнік каціўся міма зялёных пагоркаў з вінаграднікамі. Праваднiца, праходзячы па вагоне, абвясціла: у Цiраспалі людзі перакрылі дарогу, патрабуюць аддзялення ад Малдавіі, таму цягнік паедзе ў абыход – з-за гэтага спозніцца гадзін на сем.

У Кішынёў прыехалі амаль увечары. Не разумеючы, што

мы хочам убачыць і куды патрапіць, проста хадзілі па вуліцах. Харчовыя крамы называліся Alimentari. На адной вуліцы мы ўбачылі дакладна такую ж пяціпавярхоўку, як тыя, у якіх жылі мы.

Бадзяліся да ночы, натыкнуліся на аўтавакзал і селі ў аўтобус назад у Адэсу.

*

У Адэсе пайшлі на «Прывоз», купілі вінаграду, мылі яго ў кранах на задворках рынка і тут жа елі. Калі выходзілі з брамы, хлопец у спартыўным касцюме “Мантана” спытаў у мяне:

– Прадаеш гітару?

Я падумаў, што нам, напэўна, не хопіць грошай на квіткі дадому, і сказаў:

– Прадаю.

Ён заплаціў сто рублёў.

*

Было пахмурна, але без дажджу. Мы стаялі на пероне. Да адыходу нашага цягніка заставалася гадзіна. Міма нас дзве выхавацелькі вялі групу дзяцей з чарнобыльскай зоны. Дзеці выбіваліся з калоны, дурэлі і ганяліся адзін за адным. Выхавацелькі крычалі на іх.

# Маёр

Іра зайшла ў кабінет – вузкі і цесны. Падраны пісьмовы стол. Партрэт Дзяржынскага ў кепцы на сцяне. Секцыя “сценкі”, у ёй – кардонныя тэчкі з нумарамі на карэньчыках, стосы паперы. На стале – чорны тэлефонны апарат, таксама паперы, тэчкі.

Маёр узняў вочы, паглядзеў на яе.

– Дзень добры, – сказала Іра.

– Добры дзень.

Ён быў у шэрым танным пінжаку, лінялай блакітнай кашулі – амаль як “школьныя”. Светла-русыя валасы радзелі на макушцы, хаця яму было, напэўна, троху за трыццаць. Пад носам, ля самых ноздраў, тырчалі некалькі непаголеных валаскоў.

– Сядайце.

Іра зрабіла два крокі да стала, адсунула крэсла, села. Маёр выцягнуў са стоса паперы чысты аркуш, нешта накарабаў на ім белай шарыкавай асадкай з абгрызеным каўпачком. У яго былі маленькія рукі з доўгімі, даўно не стрыжанымі, але не бруднымі пазногцямі. Маёр паглядзеў на Іру, тут жа адвёў вочы ўбок, запытаў:

– Прозвішча, імя, імя па бацьку?

– Сакалова Ірына Сяргееўна.

– Дата нараджэння?

– 15 верасня 1964 года.

– Род заняткаў?

– Студэнтка. Гістарычны факультэт Магілёўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута.

– Курс?

– Чацвёрты.

Ён запісаў усё гэта, паклаў асадку. Асадка пакацілася да края стала. Ён злавіў яе, пакорпаўся ў паперах, выняў ружаваты аркуш з капіравальнага апарата. Ён быў падзелены на некалькі роўных частак, і на кожнай быў невялікі малюнак. Маёр павярнуў аркуш да Іры. На кожным малюнку быў поўны сівы дзядзька ў чорным пінжаку і з гальштукам, побач з ім – такія ж дзядзькі менш і танчэй. Да рота ў іх былі прымаляваныя “бурбалкі”, у іх – неразборлівы тэкст.

– Вам знаёмае гэта?

Іра паматляла галавой.

– Паглядзіце ўважліва.

– Не, я бачу ўпершыню.

– А ў мяне ёсць сведчанні аб тым, што вы гэта бачыце не толькі не ўпершыню, але і прымалі непасрэдны ўдзел. Ведаеце, як гэта называецца?

– Комікс, здаецца...

– Гэта завецца “Распасюджванне свядома ілжывых думак, якія ганьбяць савецкі дзяржаўны і грамадскі лад”. Артыкул семдзесят другі УК БССР. А можа пацягнуць і на артукул

58 – 10 “Антысавецкая агітацыя і прапаганда”.

Маёр паглядзеў на Іру – доўга, не адводзячы вачэй.

*

– Гэта дупа, – сказаў Стас. – Нехта нас заклаў.

– А я табе казаў, што не трэба паказваць гэтую фігню, калі там былі левыя людзі… – Ігар узяў са стала, засыпанага дробкамі, кубак з кавай, зрабіў глыток, паставіў назад.

Ігар, Іра і Стас сядзелі за столікам на другім паверсе кафэ “Пінгвін”. Народу было не шмат, за суседнімі столікамі не сядзеў ніхто.

– Левых людзей там не было, – Стас паглядзеў на Ігара. – Я іх усіх ведаю.

– Ну і хто ў такім разе нас заклаў, калі ты ўсіх ведаеш?

– А можа, гэта ты?

– Ты што – зусім з глузду з’ехаў? З чаго мне такое рабіць?

– Не ведаю. Раптам ты перасцаў… Ці прачнулася камуністычная свядомасць…

– Ты кажаш усякую лухту.

– Тады ты скажы што-небудзь добрае. Мяне тузанулі, Ірку тузанулі… А вось цябе пакуль не тузалі. І галоўнае, што ў іх ёсць копія адной старонкі комікса… Можа, ёсць і болей, але паказалі толькі адну – і Ірцы, і мне. Слухай, а ты можаш паразмаўляць са сваімі старымі…

– І што я ім скажу? Мама, тата, мы вось узялі і намалявалі

комікс пра Чарненку, і цяпер за гэта нас цягаюць у КДБ… Зрабіце што-небудзь, каб яны ад нас адчапіліся… Гэта ты прапануеш?

– Ну я не ведаю… Што-небудзь, прынамсі. Проста яны нешта могуць зрабіць, у іх жа ёсць сувязі, знаёмствы. Не тое, што ў маіх.. Да каго яны пойдуць – настаўнікі? Да дырэктара школы?

– Не ведаю.

– А я што – ведаю? І рыхтуйся да таго, што цябе таксама тузануць… Калі толькі гэта не ты…

– Слухай, ты задзяўбаў ужо. Колькі можна? Гэта не я нас здаў, зразумела? Не я! Гэта нехта з тых ёлупняў, якія тады…

– Хопіць вам лаяцца, – сказала Іра. – Трэба лепей падумаць, што цяпер рабіць.

– Добрая тэма для развag… – Стас узяў свой кубак і дапіў каву.

– Добра, не істотна, хто здаў, – сказаў Ігар. – Трэба, каб усе казалі адно і тое ж: нічога не бачылі, нічога не ведаем. Зразумела?

*

Маёр адамкнуў ключом дзверы, зайшоў у вітальню, паставіў на падлогу чорны “дыпламат”, падраны ў кутках, зняў футра са штучнай поўсцю, павесіў на крук. Жонка рэзала на кухні пячонку. Яна ўзняла вочы, кіўнула маёру. Ён кіўнуў ёй у адказ, расшпіліў маланкі на ботах, сцягнуў іх з ног. На адной шкарпэтцы ля вялікага пальца, была дзірка.

Жонка працягвала рэзаць пячонку. На яе тоўстых белых нагах дзе-нідзе сінелі варыкозныя вены. Маёр прайшоў у пакой. На падлозе гуляў з пластыкавымі кубікамі хлопчык гадкоў трох.

– Тата, а сто ты мне плінёс? – прашапялявіў ён, усміхнуўся бяззубым ротам.

Маёр вынуў з кішэні карамельку “Взлетные”, даў яму. Хлопчык пачаў разгортваць цукерку. Маёр падышоў да тэлевізара “Электрон”, уключыў. З’явіўся гук, потым – выява. Ішоў хакей. Маёр сеў у фатэль. Па экране пайшла перашкода, выява скрывілася.

*

Іра і Стас ляжалі на раскладзенай канапе, накрыўшыся коўдрай. Круціліся бабіны магнітафона “Алімп”. У калонках грала музыка Pink Floyd, альбом Animals. На падлозе ляжала бутэлька з-пад партвейну, стаялі два куфлі, валялася ўперамешку адзенне і бялізна.

Уся сцяна над канапай была абклееная фотаздымкамі з савецкіх і замежных часопісаў – Джордж Харысан, Элтан Джон, Pink Floyd, Led Zeppelin, Beatles.

Стас прыўзняўся на канапе, дацягнуўся да пачака цыгарэт Opal і запальніцы.

– Будзеш? – спытаў ён.

Іра кіўнула. Ён запаліў ёй і сабе. Іра ўзяла ў яго цыгарэту, села, прыхіліўшыся да сцяны. Абое зацягнуліся.

– А якое ў цябе ўвогуле засталося ўражанне? – запытаў

Стас. – Ну, ад яго...

– Ад каго?

– Навошта прыкідваешся, што не разумееш? Ад маёра.

– Аніякага. Тыповы кадэбэшнік – такім сабе і ўяўляла. Як мужчына – нічога асаблівага – калі ты гэта хацеў пачуць...

Стас зацягнуўся, зірнуў на Іру.

– Ну, а ты выклікала ў яго якія-небудзь пачуцці, га? Як думаеш?

Іра паглядзела на Стаса.

– Што ты гэтым хочаш сказаць?

– Нічога.

– Што значыць – нічога? Патлумач...

– Я сказаў ужо – нічога...

– Ты што мне прапануеш?

– Нічога не прапаную... Проста думаю... У такой сітуацыі трэба разглядаць усе варыянты...

Іра рэзка ўзнялася з канапы, скінуўшы коўдру, нахілілася, кінула цыгарэту ў попельніцу, падняла з падлогі майткі, надзела, узяла калготы.

– Ты мяне не зразумела, я нічога такога не меў на ўвазе... Проста... – Стас узяў яе за руку. Іра вырвалася, нацягнула калготы, нахілілася, падняла станік.

– Калі ты мне гэта прапануеш, ведаеш, што я магу зрабіць?

Я магу распавесці яму, што гэта ты і Ігар усё намалявалі, а я ўвогуле тут ні пры чым.

*

На прыпынку тоўпіліся людзі, дыхалі парай. На іншым баку вуліцы дзяўчыны гадоў па семнаццаць беглі – у ботах, але без куртак – з інтэрната ў корпус ПТВ 98.

Пад’ехаў тралейбус – стары, шэрага колеру, з сінім номерам на баку: семдзесят два. Іра зайшла ў заднія дзверы, забілася ў куток, да вакна. Тралейбус пакаціўся міма “шэрага дома”, паварота да ваеннай часткі, аўтастанцыі, за якой быў кірмаш, а яшчэ далей, на ўзгорку – царква. Дзядзька, што стаяў побач, дыхаў на яе перагарам і гнілымі зубамі. Іра паспрабавала адсунуцца ад яго, але не змагла: тралейбус быў набіты людзьмі.

*

Маёр паглядзеў на Іру. Ён быў у тым жа самым шэрым пінжаку, але ў іншай кашулі – белай у чорную вузкую паласку, з вялікім каўнерам – цяпер такіх ужо не насілі.

– Значыць, вы працягваеце сцвярджаць, што ніколі не бачылі гэтых малюнкаў і нічога пра іх не ведаеце?

– Скажыце, а калі, напрыклад, я даведалася б пра нешта такое, што вам магчыма было б цікава, маглі б мы сустрэцца з вамі ў іншым месцы?

*

Першы “дарослы” сеанс, адзінаццаць-дзесяць, пачаўся дзесяць хвілін таму. Маёр таптаўся ля ўвахода ў “Кастрычнік”

у сваім футры са штучнай поўсцю, рудой трусінай шапцы, з “дыпламатам”. З-за рога выйшла Іра – у доўгім цёмнашэрам паліто, без шапкі.

– Вам не халодна? – спытаў маёр. – Мароз жа нібы…

Іра паціснула плячыма. Яны прайшлі ў фае, маёр выцягнуў з кішэні дзве бледна-зялёныя паперкі квіткоў, працягнуў квітарцы.

– Што ж вы так спазніліся? Часопіс ужо скончыўся… – сказала квітарка. Іра і маёр прайшлі міма яе да ўвахода ў залу. Іра кіўнула на лесвіцу ўніз, пачала спускацца. Маёр ішоў за ёй. Яны прайшлі праз пустую курылку. Іра зайшла ў мужчынскую прыбіральню, маёр – за ёй следам. Іра зачыніла дзверы, узяла ў куце швабру, засунула тронак у ручку.

– Цяпер сюды ніхто не зойдзе, – сказала Іра і расшпіліла гузікі на сваім паліто.

Яна падышла да маёра, расшпіліла яго футра, пінжак, пас, гузікі прарэха. Яна прысела на кукішкі. Крысо паліто церлася аб брудныя пліткі.

Маёр рэзка адступіў.

– Не трэба, – ціха сказаў ён.

Іра выпрасталася, паглядзела на сябе ў люстэрка над рукамыйнікам, што ўсё было ў плямах ад засохлых кропель. З крана капала вада.

Маёр зашпільваў прарэх. Гузік не пралязаў у пятлю. Ён пакінуў яго незашпіленым, захінуў футра.

*

У курылцы стаялі два хлопцы-пэвэтэшнікі гадоў па шаснаццаць, дымілі цыгарэтамі без фільтра.

– Секані, га? – сказаў адзін другому.

Іра і маёр узняліся па прыступках.

*

Маёр сядзеў у кабінеце палкоўніка – значна больш прасторным, чым у яго. На стале стаялі тры тэлефонныя апараты – два чорныя і адзін салатавага колеру. Паперы былі акуратна раскладзеныя на стале ў стосы.

– Значыць, кажаш, гэтая парачка да малюнкаў аніякіх адносінаў не мае? – запытаў палкоўнік – сівы вялікі дзядзька з ордэнскімі планкамі на пінжаку.

– Не, абсалютна ніякіх, – сказаў маёр.

– А чаму тады ён паказаў менавіта на іх?

– Хто яго ведае? Можа, яна яму не дала, вось ён і вырашыў заадно і яе хлопца закласці. Ці яшчэ нешта паміж імі здарылася...

– А адкуль увогуле гэтыя малюнкі ўзяліся? Нехта ж іх намаляваў – не сам жа ён...

– А можа і сам. Тып ён слізкі. Я б яго ўзяў у распрацоўку, але улічваючы, што бацька...

– Так, канечне...

– З гэтых падпіску аб нявыездзе зняць? Яны там нібыта на

вакацыі ў Ленінград збіраліся…

– Здымай.

*

Іра і Стас выйшлі з таксоўкі і пайшлі да будынка аэрапорта. У яго – невялікая валіза, у яе на плячы – торба. Пачыналася завіруха. Ля аэрапорта былі прыпаркаваныя некалькі машын, з іх палова – таксоўкі: салатавыя і жаўтаватыя “Волгі”.

Маёр узяў з сядзення пачак “Арбіты”, выцягнуў адну цыгарэту, сунуў руку ў кішэню.

– Бляха, – прамармытаў ён, адчыніў бардачок, пачаў корпацца там. Кавалак старой газеты “Знамя юности”, адна замшавая пальчатка, карамелька без абгорткі з наліплым смеццем.

Маёр зноўку перамацаў свае кішэні, знайшоў карабок запалак. “Борисовская спичечная фабрика. 40 лет освобождения БССР”. Ён чыркануў, запаліў, выпусціў дым, узяў пальцамі цыгарэту, патрымаў, апусціў шкло і кінуў цыгарэту ў гурбу.

Пад’ехала таксоўка. З яе выйшлі поўныя дзядзька і цётка, выцягнулі акуратна захутанага ў футра дзіцёнка. Маёр крутануў ключ у замку запальвання, выціснуў счапленне, даў газу. “Масквіч” занесла метры на два. Ён развярнуўся. У люстэрку мільганула шэрая скрыня аэрапорту.

“Масквіч” ехаў міма засыпаных снегам вясковых хат. З комінаў ішоў дым. Ля адной хаты брахаў дварняга.

## Брэсцкая крэпасць

За вакном аўтобуса мільгаюць палі, драўляныя хаткі, кароўнікі і сіласныя вежы.

Класная бярэ мікрафон, стукае па ім, дзьме.

– Чуеце мяне?

– Так!

– Хачу яшчэ раз нагадаць наш план на сёння. Едзем, пакуль не стане цёмна, спыняемся ў лесе на начлег, ставім намёты, вячэраем і кладземся. А заўтра з раніцы выязджаем, каб дзесьці а дванаццатай прыбыць у Брэст.

– А бульбу пячы будзем? – пытаецца Сініцына.

– Так, вядома, і бульбу пячы, і сала смажыць... А вось вы памятаеце колькі гадоў таму была абарона Брэсцкай крэпасці?

– У сорак першым, значыць 46 гадоў таму! – крычыць выскачка Куцепава.

Аністанка кажа мне:

– Пацаны ўзялі «смагу». Будзеш піць?

– Не, я не п'ю.

– Што, не курыш і не п'еш? Здаровенькі памрэш, так? А паябацца хочаш? Мы не курым і не п'ем, толькі дзевак мы...

Несцярэнка паварочваецца да нас.

– Анішчанка – ты такі ўжо пустаслоў...

– Чаго гэта я пустаслоў?

– Сам ведаеш.

– А хочаш, дакажу, што не пустаслоў? – ён усміхаецца. – Хочаш паспрабаваць?

Несцярэнка пырхае, адварочваецца.

Анішчанка нахіляецца мне да вуха, шэпча:

– Ведаеш, з кім можна з нашых баб паябацца? З Калтаковай. Яна ўжо не цэлка. Яе летам у вёсцы пацаны апрацавалі.

– Адкуль ты ведаеш?

– Яна сама распавяла. Што, паверыў? Адзін нуль на маю карысць. Не, вядома ж, – пацаны казалі. Карацей, адзін пацан, быццам яна з ім хадзіла, завёў да сябе дадому, а потым яшчэ і сябры ягоныя прыйшлі – наканчалі ёй на пуза, на сукенку. А яна – заяву мянтам.

– І што?

– Селі пацаны. Па пятнаццаць гадоў – уяўляеш? За тое, што групавая. Слухай анекдот. Судзяць мужыка. За групавое згвалтаванне буйной рагатай жывёлы... Падымаецца ён. У яго пытаюцца: а дзе астатнія, дзе – група? Я быў адзін.

Анішчанка рагоча, я ўсміхаюся. Ён пытаецца:

– Што, зразумеў?

Я ківаю.

Стаім на паляне – я, Анішчанка, Курыловіч, Малееў і Усачонак. Усе паляць, акрамя мяне.

Малееў кажа:

– А я там, ведаеце, што бачыў? Затычкі. Бабы нашыя мянялі затычкі і старыя выкінулі.

– Піздзіш, – кажа Усачонак.

– Пайшлі – пакажу, калі не верыш.

Анішчанка пытаецца:

– А дзе, у якім баку?

– У тым, – Малееў паказвае ў бок лесу. Анішчанка паварочваецца да мяне.

– Пайшлі паглядзім, Вова.

– Ай, неахвота.

– Пайшлі, што ты ламаешся, як цэлка? – пацаны рагочуць. – Мы зараз прыйдзем, без нас не пачынайце.

– Яшчэ спачатку прынесці трэба, – Курыловіч ідзе да намётаў.

Выходзім з Анішчанкам на паляну. Курыловіч трымае ў руцэ зялёную бутэльку з-пад гарэлкі.

– Ну што, знайшлі?

– Не-а. Дай-ка жахнуць, – кажа Анішчанка.

– Значыць, дрэнна шукалі. Трымай.

Анішчанка адпівае, глядзіць на мяне.

– Што, можа ёбнеш, Вова? А то...

Я бяру бутэльку, падношу да рота. У ёй – каламутная самагонка. Горлышка мокрае, у сліне. Я раблю глыток, працягваю бутэльку Курыловічу. Анішчанка перахапляе, робіць вялікі глыток.

– Малы, ты што – ахуеў? – крычыць Малееў. – Хочаш адзін ўсё выжраць?

– Ты казаў – яшчэ другая ёсць...

– Ну і што, што ёсць? А на заўтра?

– Заўтра возьмем піва.

– Дзе ты яго возьмеш?

– У Брэсце. Я табе кажу. Ідзі за другой, пакуль класуха не прасякла, што нас няма.

Ідзем да вогнішча. Анішчанка дэбільна ўсміхаецца, хістаецца, чапляецца за дрэвы. Па астатніх нічога не заўважна. Курыловіч хапае Анішчанку за плечы.

– Малы, канчай выёбвацца. Класная зауважыць – усім піздзюлёў уваліць, не толькі табе.

– Класная... З піздой зубастай...

– Зараз дажартуешся... Будзе табе і з зубастай, і з бяззубай.

Бабы і Класная сядзяць ля вогнішча, пякуць на дубчыках сала. Класная кажа:

– А вось і нашыя хлопчыкі… Дзе гэта вы ходзіце? Мы ўжо засумавалі…

Малееў кажа:

– Мы спаць пойдзем… Заўтра ўставаць рана…

– Як хочаце. А то пасядзелі б з намі…

Несцярэнка глядзіць на Саніну, з’едліва ўсміхаецца. Яна – самая прыгожая ў класе, лепш за ўсіх апранаецца. Зараз яна ў карычневых штроксах «Rifle» з заклёпкамі і ў шэрай югаслаўскай вятроўцы.

Анішчанка ціхенька спявае мне ў вуха:

*Два футбалісты знялі буцы,*
*Ляглі на поле і ябуцца.*

Наш намёт – за аўтобусам. Анішчанка расшпільвае прарэх, сцыць на кола. Малееў раве:

– Ты што – ад вадзілаў хочаш атрымаць?

– Вадзілы – підарасы, я іх завафлю…

– Глядзі, каб цябе не завафлілі, зразумеў?

Анішчанка зашпільвае прарэх, лезе ў намёт. Курыловіч кажа:

– Думаеце, яму так дала? Ён проста выёбваецца. Бачылі – перад класнай нічога такога не казаў. Ну што, кладземся?

– Ну а хулі яшчэ рабіць? – Малееў плюе пад ногі. – Бухла больш няма…

Малееў і Курыловіч лезуць у намёт. Усачонак кажа мне:

– Пайшлі са мной – я папалю.

– Добра.

Усачонак дастае з пачака «Сталічных» цыгарэту.

– Ты дакладна не будзеш?

– Дакладна.

– Так, ты ж узорны. Добра...

Ён чыркае запалкай, прыпальвае, зацягваецца. З боку вогнішча чутныя крокі. Усачонак выкідае цыгарэту.

На паляну выходзяць Калтакова і Куцепава. Калтакова кажа:

– А што гэта вы тут робіце?

– Дзе Класная? – пытаецца Усачонак.

– Мабыць, у аўтобус пайшла, спаць...

Усачонак падымае з зямлі цыгарэту, дастае запалкі.

– Яна што, у аўтобусе будзе спаць?

– Так.

– А чаму не з вамі, не ў намёце?

– Гэта ты ў яе спытай. Дай лепш цыгарэту.

– Ты хіба курыш?

– Так, трошкі балуюся.

Я таксама цягнуся да пачака.

– І ты, Ваван? Ну вы даеце, узорныя... Хадзем, можа,

пагуляем? Не сцыце, не да вогнішча. Тут дарога ёсць проста да шашы.

Усачонак з Куцепавай ідуць паперадзе, я і Калтакова адстаем ад іх метры на тры. Па шашы едуць фуры і легкавыя. Я кажу Калтаковай:

– Я хацеў у цябе спытаць… Мне пра цябе казалі…

– І хто гэта казаў, калі не сакрэт?

– Сакрэт.

– І што яны такое гаварылі?

– Ну, што ты… Летам, у вёсцы…

– Ну і што з таго?

– Проста хацеў спытаць, праўда гэта ці не?

– Цікаўнай Амілі нос прышчамілі…

Яна дакранаецца да майго жывата, апускае руку ніжэй і адхоплівае – у мяне ўстаў. Калтакова рагоча.

– Нікога не слухай, ясна? Адна я ведаю, што там было на самай справе, але нікому не скажу, калі не захачу, зразумеў?

– Зразумеў.

– Давай лепш пра што-небудзь іншае пагаворым. Ты пасля восьмага куды пойдзеш, у дзявяты?

– Ну так, а куды яшчэ? – я абдымаю яе рукой за талію. – А ты?

– Не ведаю пакуль. Час ёсць.

– Колькі таго часу? Май канчаецца…

– У крайнім выпадку, у дзявяты мяне заўсёды возьмуць, так?

Я павольна прасоўваю руку да яе грудзей. Яна рэзка спыняецца, скідае маю руку.

– А вось гэтага не трэба, добра? А то я зараз пайду спаць.

Падыходзім да аўтобуса. Вогнішча згасла. Кіроўца Міша паліць каля задняга кола.

– Дзе вы ходзіце? Ведаеце, колькі часу? Дзве гадзіны ночы.

– Але вы Алене Сямёнаўна не скажаце? – кажа Куцепава. – Калі ласка...

– Не сцыце, не скажу.

*

Класная кажа ў мікрафон:

– Цяпер усе выходзім і ідзем у крэпасць...

Я кажу:

– Алена Сямёнаўна, а можна мне застацца? Я ўжо быў у крэпасці... І ў мяне штосьці галава баліць.

– Ну, калі галава баліць... Увогуле адколвацца ад калектыву кепска, але заставайся...

Я адкідваюся на спінку сядзення, заплюшчваю вочы.

Стаім ля фантанчыка. Праз дарогу – двухпавярховы ўніверсам. Малееў дае Анішчанку рубель.

– Табе дзве?

– Ага.

– А ты, Вова, будзеш?

– Адну.

Я даю яму дзве «пятнашкі» і «дваццарык».

– Значыць, вам тром – па дзве, Вову – адну, ну і сабе я дзве. Карацей, пайшоў я.

Анішчанка падыходзіць да двух пацаноў. Ім гадоў па сямнаццаць–васемнаццаць. У аднаго на куртцы – круглы значок, што на ім – адсюль не бачна.

Курыловіч кажа:

– Дарма Малога паслалі – трэба было ісці ўсім. А то насуюць яму і бабкі забяруць.

Анішчанка ідзе з мясцовымі пацанамі за краму. Курыловіч крычыць:

– Малы!

Ён не паварочваецца.

– Ну што? – пытаецца Малееў. – Дзе піва?

– Няма. Яны як даведаліся, што мы з Магілёва – хацелі адпіздіць. Паклікаць яшчэ здаровых пацаноў... я нас ледзь адмазаў. Прыйшлося аддаць грошы.

– Ты што, ахуеў – усе грошы?

– Яны абшуквалі, павялі за краму і абшуквалі.

– Малы, я цябе зараз заб'ю, на хуй. Трэба было самім

браць – раптам бы прадалі?

Сяджу ля намёта, чытаю кнігу – “Туманность Андромеды”. Падыходзіць Малееў.

– Вова, ідзі-ка сюды. Трэба пагаварыць.

Кладу паміж старонак закладку, зачыняю кнігу, падымаюся.

Выходзім на паляну. Там – Анішчанка, Усачонак, Курыловіч і Калтакова. Малееў хапае Калтакову за руку.

– Ну што, ябаў ён цябе ці не?

Яна выхоплівае руку.

– Не твая справа, зразумеў? І толькі кранi мяне, не дай бог...

– А ты мяне не палохай...

– А я цябе не палохаю. Пасля сам пабачыш...

Калтакова ідзе да аўтобуса. Усе глядзяць на мяне. Анішчанка агідна ўсміхаецца. Малееў кажа:

– Ты што, думаеш – самы разумны, так? А мы ўсе – дурныя?

– А што такое?

– Нічога.

Ён рэзка ўзнімае руку, я ўздрыгваю.

– Не бойся, мы цябе біць не будзем. Мы цябе крыху правучым.

Курыловіч крычыць:

 – Валі яго! Цёмную!

Стукаю па дзвярах аўтобуса. Адчыняе Класная.

 – Алена Сямёнаўна, можна я ў аўтобусе буду спаць? Мне штосьці ў намёце халодна…

 – А чаму ў цябе куртка мокрая? І ўся ў траве?

 – Гэта я паслізнуўся…

 – Добра, заходзь…

На пярэднім сядзенні разасланая газета, на ёй – нарэзанае сала, вараныя яйкі, хлеб, салёныя агуркі.

Праз праход сядзяць Міша, другі кіроўца Валера і геаграфічка Пруднікава.

Я кладуся на задняе, шырокае сядзенне.

Класная нягучна кажа Мішу:

 – Добры вучань… Маці ў бацькоўскім камітэце… Нельга…

Міша нешта бурчыць, шамаціць паперай. Звіняць шклянкі.

Нацягваю красоўкі. Ногі за ноч распухлі, ледзь залазяць. Міша і Класная спяць на пярэднім сядзенні, абняўшыся. Валера і Пруднікава – таксама разам, праз праход. На падлозе валяюцца дзве пустыя бутэлькі ад гарэлкі.

Я асцярожна, каб іх не пабудзіць, зачыняю дзверы аўтобуса. Халодна. Я зашпільваю куртку.

Каля намёта паліць Анішчанка.

– Прывітанне! – ён суе мне руку, я цісну яе. – Ты дзе спаў, у аўтобусе? Добра, ты не крыўдуй за гэта. Пайшлі, нешта пакажу...

– Затычкі?

– Якія, бля, затычкі? Ты што, дурны? – ён смяецца.

Ідзем па лесе ў бок шашы. Анішчанка спыняецца.

– Дай слова пацана, што нікому не скажаш.

– Слова пацана.

– Дай зуб.

Я чапляю пазногцем пярэдні зуб.

Ён суе руку ў кішэню, дастае значок. На ім – Томас Андэрс з Дзітэрам Боленам і надпіс «Modern Talking».

– Я ўчора ў пацана купіў.

– За колькі?

– За чатыры.

– Значыць, яны не забралі ў цябе грошы?

– Не. Але ты мне зуб даў, што нікому не скажаш. Усё, пайшлі назад.

## Ламбада

Багачоў, інстытуцкі камсорг, націскае на кнопку "play" магнітафона "Toshiba". Грае Ламбада. Каця ўстае і, калышучы бюстам, пачынае танчыць. Яна, як і я, вучыцца на "тэхналогіі матэрыялаў", толькі на курс старэйшая: перайшла на трэці. Апроч яе і мяне, на паездку ў Германію прэтэндуюць аднагрупніца Каці Ірка Давыдава і хлопец са "зварачнай вытворчасці" – яго прозвішча я не ведаю. Нас рэкамендавалі выкладчыкі нямецкай – мы адзіныя, хто штосьці вучыў, астатнія проста дурэлі. Багачоў сказаў, што канцлер Коль асабіста паабяцаў Гарбачову кожны месяц запрашаць пяцьсот чалавек у Германію – узрост ад шаснаццаці да дваццаці пяці, – і мы будзем першай такой групай: па пяцьдзесят чалавек ад кожнай рэспублікі, дзесяць ад нашай вобласці.

Каця набліжаецца да Багачова і рукамі заваблівае яго: устань і патанчы са мной. Той кладзе ёй рукі на пояс, і яны рухаюцца ўзад-уперад па чырвонай дарожцы сакратарскага кабінета. Ламбада сканчаецца, наступная песня на касеце – "Есаул" Газманава.

Багачоў памяншае гук амаль да нуля, сядае за свой стол.

– Усё, цяпер – рэкамендацыі, а то ў райкаме прыкалупаюцца – і ні ў якую Германію не патрапіце. Крыўдна будзе, так?

*

Вакол вялікага стала сядзяць усе пяцьдзесят чалавек беларускай групы, у тым ліку я, Каця і Ірка. Хлопца са "зваркі"

не ўзялі – апынулася, што ў яго ў Геманіі працуе тата, і ён там быў ужо некалькі разоў.

Другі сакратар камітэта камсамола БССР абводзіць нас поглядам, пачынае гаварыць:

– Карацей, я без прадмоў. Галоўнае – цяміць у нямецкай. Хто не цяміць – купіце які-небудзь размоўнік, а то самім будзе горш потым. Памятаю, ездзіў калісьці даўно, яшчэ ў інстытуце, у Англію. А я ў школе гішпанскую вучыў і ў ангельскай не цяміў наогул. І са мной хлопец адзін пасяліўся – сказаў, што ведае ангельскую нармальна. Апынулася – не ведаў ні фіга. “Рашын, рашын” – і ўсё. Прыходзіць гаспадыня, кажа, што абедаць пара – а мы наогул не кемім, што яна хоча. Гэта першы момант. Другі – наконт падарункаў. Самі нічога не прасіце. Усё вам падораць – джынсы, красоўкі там, іншую дробязь. Але прасіць нічога не трэба. Сем'і павінны быць нармальныя, за гэтым там строгі кантроль. Праўда, праколы здараюцца. У нас ездзіла група летась – там быў такі Саша, ціхі хлопец, спакойны. І патрапіў ён да нейкай немкі рэлігійнай. Яна яго ў царкву вадзіла ўвесь час, а калі з'язджаць – усім іншым джынсы падарылі, плэер камусьці, магнітафон, а яна яму – пачак печыва. Ну, усе, вядома, з разуменнем паставіліся, падзяліліся, хто чым мог.

І трэці момант. Вас там будуць распытваць, ясная рэч, пра тое, што ў нас адбываецца, як людзі жывуць, і іншае. Дык вось, каб дурасці не казалі, накшталт таго, што ездзіце ў Менск за каўбасой і гэтак далей. Усё зразумела? Суправаджаць вас будзе Пятрэнка Ігар Сяргеевіч.

Барадаты дзядзька ўстае, ківае.

– Толькі будзе ён без барады – як на фота ў замежпашпарце. Ну, удала вам з'ездзіць.

*

Самалёт зніжаецца. Бачныя хаткі, крытыя чарапіцай, машыны, што едуць па аўтабане. Усё – маленькае, быццам цацачнае. Воля, не адрываючыся, глядзіць у вакно. Я, каб больш убачыць, прыціскаюся да яе надта блізка. Яна не звяртае ўвагі.

Воля вучыцца на філфаку нашага педінстытута, старэйшая за мяне на год. Я прыкмеціў яе яшчэ ў Менску, калі яна імкнулася адшчапіцца ад магілёўскай групы, паказаць, што не з імі. Я яе разумею – зашмат калгаснікаў і ідыётаў.

*

Аўтобус вязе нас у Гамбург на мюзікл “Кэтс”. З некаторымі едуць “гасцявыя бацькі”, мая Дорыс і Волін Хельмут. Мы з Воляй сядзім на адной сядушцы, Хельмут і Дорыс – таксама разам, праз праход.

Напачатку салона Каця забаўляе народ:

– А зараз я выканаю вам песню голасам нэпманскай шлюхі...

Яна пачынае спрабаваць спяваць. Хельмут, нахіліўшыся да нас з Воляй, штосьці кажа. З невялікай затрымкай я разумею:

– Гэтая дзяўчына што, п'яная?

Воля пацiскае плячамі і ўсміхаецца. Яна казала, што Хельмут – добры сем'янін і бацька, што яны ўтраіх, з яго трохгадовым сынам гуляюць ва ўсялякія гульні.

*

Вяртаемся з Гамбурга. “Кэтс” не ўразіў мяне зусім. Дзядзькі і цёткі ў каціных шкурах танчылі і спявалі на незразумелай нямецкай, было падобна да савецкіх мюзіклаў па тэлевізары. А Волі спадабалася, яна нават падыходзіла ў антракце да сцэны, дзе акцёры давалі аўтографы, і галоўны кот распісаўся ёй на квітку.

За вокнамі кавалкі леса чаргуюцца з адзінокімі хатамі. Выязджаем на раўніну. На небе – амаль поўня і шматкі шэрых аблокаў.

Воля кажа:

– Уяві сабе, што ўсё гэта адбываецца шмат гадоў таму, і дзесьці там, за тымі ўзгоркамі, жывуць першабытныя людзі, якія палююць на мамантаў...

Гэта першая дурасць, якую яна кажа за ўвесь час паездкі. Я не слухаю, проста гляджу ў вакно. Па іншым баку аўтабана, рухаючыся нам насустрач, пралятаюць машыны з запаленымі фарамі.

Воля кранае маю руку, павольна праводзіць па ёй сваёй далонню, потым бярэ сярэдні палец і пачынае сціскаць. Я прысоўваюся бліжэй, цягнуся вуснамі да яе твару. Яна адхіляецца.

– Я не хачу тут, пры ўсіх...

– Ну а дзе?

– Не ведаю.

Яна паціскае плячамі.

– Прыдумай што–небудзь.

*

Пагрукаўшы, Дорыс заходзіць у пакой.

– Вова, цябе да тэлефона.

Я падыходжу да апарата ў вітальні.

– Алё?

– Алё. Гэта Воля. Мне трэба пагаварыць. Тэрмінова. Зможаш выйсці цяпер?

– Так, вядома.

– Гэта літаральна на паўгадзіны. Яшчэ паспееш сабрацца. На плошчы каля ратушы, добра?

– Добра.

На плошчы – агародніннны рынак. Нямецкія сяляне, стоячы ў кузавах сваіх грузавікоў, прадаюць зеляніну, бульбу і памідоры. Уначы рэзка пахаладала, у мяне мерзнуць вушы.

– Ты прабач, – кажа Воля. – Мне проста няма з кім больш пагаварыць, ты ж ведаеш... Карацей, Хельмут прапанаваў мне ўчора сем тысяч марак за тое, каб я з ім спала.

– Што, сур'ёзна?

– Ну, а як – жартам, ці што? Інгрыд з Рудзі кудысьці сышлі,

і ён пагрукаўся да мяне ў пакой. Прасіў, маліў... А потым прапанаваў сем тысяч марак... Вось у колькі мяне ацаніў...

– Сука ён бюргерская. Хочаш, я разаб'ю яму морду?

– Ты што? Ні ў якім разе. І наогул нікому – ні слова. Я табе давяраю, таму і распавяла... Я не магла трымаць гэта ў сабе, трэба было камусьці сказаць.

– Не бойся, я нікому не скажу.

Воля прыціскаецца да маёй курткі, я гладжу яе па спіне. Сёння ў чатыры гадзіны мы ляцім дадому.

*

– Хлопцы, памажыце там нашым! Ігару з іняза падарылі тры тэлевізары, трэба дапамагчы данесці, – кажа Пятрэнка. У Германіі ён жыў з менскай групай.

Антон з Віцебску зацягваецца цыгарэтай, пагардліва ўхмыляецца.

– Не, я чагосьці не зразумеў. Яму падарылі тры тэлевізары, а мы іх павінны цягаць? Ці, можа, ён адзін нам аддасць – на ўсіх, па запчастках?

Я іду ўслед за Пятрэнкам.

Ігар – высокі, у акулярах, з доўгімі валасамі – стаіць у пачатку перона. Ля ног – тры вялікія торбы і велізарны заплечнік. Я хапаю адну торбу, Пятрэнка – другую. Ігар бярэ астатняе.

У расшпіленай торбе – сапраўды тэлевізар, праўда, мяркуючы па выглядзе, не новы.

*

У купэ – Ігар, Антон, я і Воля. Ігар распавядае:

– Мы з гаспадарамі ездзілі ў Дортмунд, на запіс “Петэрс Поп Шоў” – яго нават у нас на Новы год пакажуць. Квіткі – па семдзесят марак.

– І хто там выступаў сёлета? – перабівае Антон.

– Шмат хто. Для мяне галоўнае  – “Дэпеш Мод”.

– Што, сур'ёзна?

– Так.

– І што яны спявалі?

– Некалькі песень з апошняга альбома, потым прайшліся па старых хітах.

– Не, ну гэта ўвогуле... Я б некалькі гадоў жыцця аддаў за тое, каб туды патрапіць...

– Я стамілася, – кажа Воля. – Можа, давайце класціся?

– Добра, мы выйдзем, – кажа Ігар. – І хвілін праз пяць вернемся. А ты пакуль размяшчайся.

Стаім у тамбуры. Ігар з Антонам паляць.

– Я, канечне, фігею, – кажа Ігар. – Вось гэта – сапраўднае жыццё, не тая дупа, у якой мы існуем. У мяне там галава ніколі не балела, жывот ніколі не балеў, вы прыкідваеце?

– Так, Германія – гэта крута, – кажа Антон, зацягваючыся цыгарэтай. – А з пласцінак вязеш што-небудзь?

– Так, вядома, набыў Violator “дэпешаў”.

– Яго я таксама набыў. А што яшчэ?

*

“Ікарус” едзе па Маскве. Цёмна, амаль ноч. Вулічныя ліхтары свецяць праз адзін. У шыльдзе “Булачная” гарадь толькі тры першыя літары.

Ззаду Ігар балбоча:

– Не, я проста ў трансе... Я цяпер разумею, калі Грэбеншчыкоў кажа ў інтэрв'ю, што прыязджае з-за мяжы і тыдзень п'е беспрабудна... Я таксама прыеду дахаты і буду піць, таму што проста зусім...

Я бяру руку Волі, сціскаю, паварочваюся да вакна і гляджу на вокны хат, завешаныя фіранкамі. Воля забірае руку.

*

Раніца. Менскі вакзал. Смярдзіць гарам і мазутам. Па засраным пероне лянiва коціць каляску самотны носчык у замасленай целагрэйцы. Я выходжу з вагона, падаю руку Волі. Яна спускаецца па прыступках, моцна трымаецца за мяне. Да яе падскоквае невысокі чувак з рэдкімі вусікамі. Яны абдымаюцца і цалуюцца.

Адчапіўшыся ад чувака, Воля кажа:

– Знаёмцеся. Гэта – Вова, а гэта – Вадзім.

Мы ціснем рукі. Вадзім ніжэйшы за мяне, апрануты ў саўковую шэрую куртку і карычневыя штаны.

– Ну што, на аўтавакзал? – пытаецца Вадзім.

– Не, нам спачатку ў камітэт камсамола – забраць пашпарты, – кажа Воля. Мы здавалі савецкія, калі ехалі, і цяпер нам павінны іх вярнуць. А замежныя трэба здаць.

Ідзем да метро. Вадзім цягне Воліну торбу, я – сваю. Яна кажа яму:

– Ну, я потым ужо ўсё распавяду – дома. Каб не паўтараць адно і тое ж сто разоў, добра?

*

Аддзіраю фатаграфіі ад паліраваных пласцінаў электраглянцавальніка. На адной – Воля, яна ў адной сукенцы: у той дзень было вельмі цёпла, мы ездзілі ў парк атракцыёнаў на ўскрайку Брэмена. Я катаўся на нейкай штуцы, дзе кабіна з людзьмі круцілася вакол сваёй восі, і ў нейкі момант мы завіслі дагары нагамі. Я баяўся, што з кішэні пасыплецца дробязь. Потым я фатаграфаваў Волю на фоне ззяючых балаганаў.

На іншай фатаграфіі мы ўчатырох – я, Каця, Воля і Клаўс, сын маіх “гасцявых бацькоў”. Ён брыдкі, са скабой на зубах і малпавай сківіцай.

Я бяру слухаўку, набіраю нумар Волі.

– Алё, добры дзень, а Волю можна?

– Прывітанне, гэта Воля.

– А... Я цябе не пазнаў. Гэта Вова. Я надрукаваў вось фатаграфіі, мог бы неяк табе перадаць... Можна заўтра сустрэц-

ца ў цэнтры...

– Не, заўтра не выйдзе. Заўтра я выходжу замуж...

– Прабач, не ведаў. Ну, я цябе віншую.

– Дзякуй. Ты тэлефануй потым, абавязкова, добра?

– Так, добра.

*

У аўдыторыю заходзіць Ілля Мікалаевіч Літвінюк – прэпад філасофіі. За вакном тырчыць гмах Дома саветаў. Імжыць. Літвінюк нявесела ўсміхаецца.

– Так, такое ўражанне, што мы павольна, але дакладна рухаемся да дыктатуры.

– Чаго гэта вы так думаеце? – пытаецца крэцін Фалькоўскі, залаты медаліст вясковай школы, дырэктар якой – яго бацька.

– Ну, не адзін я так думаю... Вунь па тэлевізары ўсялякія людзі пра гэта ўжо гавораць. Так што не здзіўлюся, калі да канца навучальнага года ваш стараста будзе ўставаць і дакладаць у напаўвайсковай форме пра тое, што група гатовая да занятку.

Стараста, "армеец" Вальковіч, няпэўна хмыкае.

– А ўвогуле, у мяне да вас такая аб'ява, – кажа Літвінюк. – У інстытуце вырашылі рабіць газету. Называцца будзе "Інжынер", друкавацца ў нас жа на ратапрынце, і распаўсюджвацца сярод, па-казённаму кажучы, прафесарска-выкладчыцкага складу і студэнтаў. І мяне прызначылі галоўным

рэдактарам. Таму прапаную тым, хто хоча паспрабаваць сябе на ніве журналістыкі, не саромецца і падысці да мяне пасля пары. Дамовіліся?

Некаторыя ківаюць.

– А цяпер чым хочаце заняцца? Старажытнагрэцкай філасофіяй ці абмеркаваннем актуальных тэмаў?

– Абмеркаваннем! – раздаюцца некалькі галасоў.

У нас з Літвінюком не было яшчэ ніводнай “звычайнай” пары – мы ўвесь час размаўляем з ім “за жыццё”.

*

На паліцы камерцыйнага аддзела ва ўніверсаме “Габрава” – бутэлькі гарэлкі “Сталічная” і цэннік: “пятнаццаць рублёў, без талонаў”.

– Ну што, бярэм адну “банку”? – пытаецца Рыжоў.

– А ты што прапануеш – адразу дзве? – Рацкевіч рагоча.

Я аддаю яму пяцёрку, ён совае грошы прадавачцы.

Стаім у двары шэрай сталінскай пяціпавярхоўкі. Бутэлька ў руках у Рыжова – ён толькі што зрабіў глыток.

– Пятнаццаць – гэта яшчэ нічога, – кажа Рацкевіч. – Хутка зробяць трыццаць, а можа і больш. Усё будзе даражэць разы ў тры, хутчэй за ўсё, з новага года.

Я пытаю:

– Адкуль ты ведаеш?

– Мне маці гаварыла – ім у райкаме нядаўна сказалі. Але

па сакрэце, каб усім не балбаталі, а то старыя ўсю муку павыкупляюць і цукар – наогул у крамах будзе пусцец.

*

Вочы намдэкана Дымковіча бегаюць. Ён глядзіць то на мяне, то ў вакно.

– Значыць, вырашыў заняцца журналістыкай?

– Так.

– І што за тэма? Навошта трэба браць у мяне інтэрв'ю?

– Ну, рэдактар сказаў – Ілля Мікалаевіч – што цікава было б зрабіць два інтэрв'ю – з чалавекам, які ўступае ў КПСС, і з тым, хто выйшаў з партыі...

– І якія да мяне пытанні?

– Ну... Карацей, асноўнае пытанне, чаму вы вырашылі цяпер вось уступіць у партыю?

– Таму што ідзе барацьба, можна сказаць, за КПСС у абноўленым складзе, за тое, каб у партыю прыйшлі новыя энергічныя людзі, якія будуць прымаць рашэнні... Скажам так, не толькі праводзіць у жыццё лінію Палітбюро, але і высоўваць ініцыятывы...

У Дымковіча нос з гарбінкай і даволі доўгія валасы ззаду. У інстытут ён прыязджае на новай “васьмёрцы” кававага колеру – на такой жа ездзіць дэкан і другі яго нам, Курчанка.

Апошні раз я прыходзіў да Дымковіча летам, за дазволам на паездку ў Германію. Ён паглядзеў на мяне і сказаў:

– Ну, ты, здаецца, і зараз нядрэнна апрануты, нашто табе

яшчэ ехаць?

На мне былі танныя польскія джынсы – “мальвіны” і чорная майка з надпісам чырвонымі літарамі “Chanel”, таксама з Польшчы. Дымковіч паўсміхаўся і падпісаў заяву.

*

Хтосьці пляскае мяне па плячы ззаду. Гэта – Вадзім.

– Што, таксама ў чацвёрты корпус?

Я ківаю.

– А што за пары?

– Электроніка.

– “Капялюш” вядзе? Ну, Акуленка?

– Так.

– Памятаю вырадка. Ён у нас таксама вёў. Дакалупаўся нешта да мяне, курсавую разы тры перапісваў. Ну, здаў урэшце, і па іспыце ён упісаў мне трайбан – і выдатна, мне больш не трэба. Дзяржадзнака! Затое цяпер ніколі не вітаюся з ім.

Мы падыходзім да чацвёртага корпуса. Ён новы, пабудавалі толькі летась, але тынкоўка на фасадзе ўжо абвалілася.

– Ну, давай, –  кажа Вадзім.

Мы цiснем рукі.

– Давай. Волі – прывітанне!

– Абавязкова.

## Напярэдадні іспытаў

Я вырашыў, што абавязкова яе выебу. Нападу нечакана ззаду, павалю на траву і выебу, і ніхто нас не ўбачыць - тут заўсёды пуста. Побач толькі чыгунка, сцежка ад аўтобуснага прыпынку, па якой у такі час амаль ніхто не ходзіць, потым – лесапаласа, а яшчэ далей – нафтабаза.

Хутка ў мяне іспыты за восьмы клас. Два дні таму заняткі скончыліся – на некалькі дзён раней, чым заўсёды, каб мы маглі пачаць рыхтавацца да іспытаў. Пасля апошняга ўроку я пайшоў да шапіка "Саюздрук" і набыў першы ў жыцці пачак цыгарэт – "Столичные" за 40 капеек. Раней у мяне ніколі не было сваіх цыгарэт, я паліў, толькі калі хто-небудзь частаваў. Цётка ў шапіку паглядзела на мяне, але нічога не сказала, узяла капейкі і дала пачак. Потым я набыў у гастраноме запалкі, сеў на лаўку ў двары 171-га дома – у якім кнігарня – і запаліў. Гэты пачак "Столичных" у мяне і цяпер з сабой, але ў ім засталося толькі тры цыгарэты.

Кожны дзень я бяру на гаўбцы ровар, спускаю яго з трэцяга паверха на плячы, саджуся, праязджаю некалькі вуліц – і горад сканчаецца. Пачынаюцца палі, чыгунка, лесапаласа і сцежкі, па якіх я гадзінамі ганяю – проста ад няма чаго рабіць. Часам спыняюся, дастаю цыгарэты, кідаю ровар у траву, саджуся і палю.

Учора яна ішла па сцежцы наперадзе ў бок "Абіссініі" – гэта некалькі вясковых хатак, што тырчаць немаведама чаму паміж ускраінай горада і самай блізкай вёскай Закураўка, да якой кіламетры два. Транспарта туды ніякага няма, і ту-

ды дабіраюцца пешшу ад аўтобуснага прыпынка.

Я сказаў ёй: “Прабачце, у вас запаліць не будзе?” – проста, каб нешта сказаць. Каб пазнаёміцца. Мне было пляваць, што яна на год ці два старэйшая, а на мне – бруднаватая блакітная цішотка, кеды і “спартыўныя” ваўняныя штаны – троху выцвілыя, з выцягнутымі каленямі, а пад імі вылучаюцца доўгія “сямейныя” майткі.

– Не, я не палю.

– Дрэнна, што не паліш.

– А мы што, ужо на “ты”?

– Ну, так, напэўна.

– Ну вось, хлопча, што я табе скажу: садзіўся б ты лепей на свой ровар і валіў адсюль, а то мяне сустракае мой хлопец, і ён з табой разбярэцца.

– Ніякі хлопец цябе не сустракае.

– Адкуль ведаеш?

– Адтуль.

– Ну вось – ужо грубім.

– Ніхто табе не грубіць.

– А як гэта ў такім разе завецца?

– Ніяк не завецца.

– Ну добра, хлопча, табе насамрэч трэба ехаць.

І я з’ехаў.

Але сёння, калі яна зноўку будзе тут праходзіць, я пакажу ёй і “хлопчу”, і “хлопца”, і ўсё астатняе. Я схаваўся і чакаю яе пад мастом: там у чыгуначным насыпе дзірка, і сцяжынка на “Абіссінію” ідзе адразу пад рэйкамі. Накінуся нечакана, каб яна не паспела анічога зразумець, адразу вывалаку з-пад маста – не на каменні ж яе ябаць, павалю на насып – там трава, задзяру сукенку, сарву майткі – і яна будзе ведаць, як з мяне смяяцца, зразумее, што я таксама штосьці магу.

Летась мы каталіся на роварах удвух з Быком, толькі не за горадам, а ля вуліцы Будаўнікоў, дзе шмат аднапавярховых драўляных хат і спуск да ракі. Там жывуць аднакласніцы, Зелянова і Байко, і мы іх там сустрэлі аднойчы, і Бык прыёбваўся да Зеляновай, і яна абазвала яго “тлушчам” і пабегла, а ён яе дагнаў, злавіў і стукнуў некалькі разоў кулаком – не моцна, але так, каб паставіць на плячы сіняк “на памяць”. А Байко на мяне не абзывалася і ўвогуле нічога не казала, толькі ўсміхалася, нібыта ў мяне твар смешны ці смаркач з носу тырчыць. І я ёй кажу:

– Чаго смяешся?

– Нічога, проста.

А аднойчы мы з Быком паехалі ўніз, да Смярдзючкі – так называюць рэчку, таму што ў яе зліваюць усякую брыдоту з хімзавода – і там да нас падыйшла нейкая цётка і сказала:

– Хлопчыкі, падвязіце да ракі.

Села да мяне на багажнік, і я яе павёз, а Бык ехаў побач і ўхмыляўся. Яна цяжкая была, з тоўстай дупай – я яе ледзь

давёз. Скокнула з багажніка – “Дзякуй”. І ўсё. А Бык кажа:

– Гэта ж Нінка, блядота. Ты што, не ведаеш яе? Трэ было сказаць: давезці – давязу, толькі плаці давай натурай.

– А сам чаму так не сказаў?

– Ладна, жартую. Яе там, напэўна, ёбар у кустах чакае.

А напрыканцы лета – мяне тады ў горадзе не было, мы з бацькамі ездзілі адпачываць на Азоўскае мора – Бык на ровары трапіў пад машыну, і яму зламала хрыбетнік ці нешта там яшчэ – я не ведаю дакладна. Але ён зараз не можа хадзіць, толькі ляжыць на ложку. Настаўнікі ходзяць да яго дахаты, і я таксама часам прыходжу. Ён вучыцца граць на гітары і спявае мне ўсялякія блатныя песні. Некаторыя мне падабаюцца, а некаторыя не. Бык кажа, што яму зробяць у Маскве аперацыю, і ён зноў зможа хадзіць і нават ездзіць на ровары.

Я вызіраю з-за насыпа, чакаю, калі яна з’явіцца, але яе ўсё няма. Удалечыні па полі бяжыць дурны мужык у чорным спартыўным касцюме і кедах. Я яго ведаю, ён жыве ў нашым раёне. Ён шызафрэнік і атрымоўвае пенсію, і ў яго “белы білет”: ён можа каго-небудзь забіць, і яму анічога не будзе. Ён можа і мяне зараз забіць, але я не дамся: лупану па яйцах, сяду на ровар і з’еду – хуй ён мяне дагоніць, хаця і бегае кожны дзень.

У мяне пацеюць далоні і ў жываце нешта торгаецца, і хочацца сраць. Я хвалююся, нібы хлапец, што прыйшоў на стрэлку і не ведае, прыйдзе яна ці не. У мяне аніводнага разу не было нармальнай стрэлкі, то бок увогуле не было

ніякай. Некаторыя хлопцы ў класе ўжо даўно хадзілі на стрэлкі і ўсё такое, напрыклад, Юшчанка. Ён нават у класе часу не марнуе. Яго пасадзілі з Хмяльніцкай, на апошнюю парту, і як ні паглядзіш, ён усё шчыкае яе пад партай, а яна не пішчыць, а толькі ўсміхаецца, нібы ёй падабаецца.

А летась мы з Быком часта ездзілі туды, дзе Зелянова з Байко жывуць, і аднойчы зноўку іх сустрэлі, і Бык сказаў ім – пайшлі на Смярдзючку загараць, маўляў, мы вас падвязём – на багажніку альбо на раме, як сабе хочаце. І яны пераглядаліся і шапталіся і сказалі потым: “Не, неахвота”. Байко была ў светлай сукенцы, якая так абліпала, што былі бачныя яе грудзі – сапраўдныя, круглыя, як у дарослай бабы. А ў Зелянковай яшчэ амаль нічога не было, але Бык усё роўна да яе заляцаўся чамусьці.

Бляць, яе ўсё няма. Дзе ж яна падзелася? Сёння быў дождж, і зараз не вельмі горача. Я ў адной цішотцы, і ўжо пачынаю мерзнуць. Можа, яна ўвогуле сёння не пойдзе тут. Ці ўжо прайшла? І чаму я ўвогуле вырашыў, што яна кожны дзень у гэты час тут ходзіць?

Я саджуся на ровар і еду да лесапаласы. Пад коламі хрумсцяць смаўжы – яны пасля дажджу немаведама чаму павыпаўзалі на дарогу. Звычайна на ўскрайку лесапаласы на траве сядзяць мужыкі з нафтабазы і бухаюць пасля працы, але сёння іх няма, мабыць, з-за дажджу.

Я злажу з ровара, кідаю яго на мокрую траву і адыходжу на некалькі крокаў ад сцежкі. Сцу, потым пачынаю драчыць. З галін дрэва мне на шыю і галаву падаюць кроплі вады. Я канчаю і малафья пырскае на чорную мокрую кару

дрэва і вісне на ёй, нібы смаркач. Я іду назад да ровара, дастаю з “кабуры” цыгарэты і запалкі, запальваю. У пачаку застаюцца дзве цыгарэты.

## Палітыка–1997

Я выходжу з інтэрната – чорныя джынсы, скураная куртка, бел-чырвона-белая хустка на шыі. Сёння – дэманстрацыя супраць Лукашэнкі. Іду адзін – суседзі па пакоі дынамяць мерапрыемства. Валяюцца на ложках і плююць у столь, таму што грошай на гарэлку няма. Казлы.

Насустрач – сумны задрочаны народ. Ім няма ніякай справы ні да палітыкі, ні да ўсяго астатняга. Толькі б купіць кавалак каўбасы, зжэрці і засесці на ўвесь вечар каля тэлевізара, глядзець тупыя серыялы. Мне іх не шкада.

Збор на плошчы Якуба Коласа. Здалёк бачу натоўп і бел-чырвона-белыя сцягі. Пазнаю чувакоў з факультэта МА, вітаюся. Мы стаім, курым, чакаем, пакуль падцягнуцца яшчэ людзі.

Наперадзе хтосьці дае каманду – наперад. Ідзем па тратуары да опернага тэатру – там дазволена правесці мітынг. Па праезнай частцы нельга – уздоўж тратуара стаяць амапаўцы, чакаюць, каб хто-небудзь адбіўся ад калоны. Не дай бог – адвалакуць у двары і адаб'юць ныркі.

Са мной у калоне – чувакі з іншых факультэтаў, нашых сёння няма наогул. Мы крычым: «Ганьба» і «Жыве Беларусь». Мінакі коса глядзяць на нас: мы ім перашкаджаем ісці па сваіх паганых справах, ім даводзіцца прыціскацца да дамоў, прапускаць нас.

Народу мала – максімум тысяча. Падыйдуць яшчэ на сам мітынг, але мала. Такой калонай асабліва не пагудзіш. Сабраць бы тысяч дзесяць – пятнаццаць, тады ні АМАП, ні

мянты нічога б не зрабілі. Хоць на Адміністрацыю прэзідэнта ідзі.

Падыходзім да опернага. Там каля сотні нашых са сцягамі і плакатамі «Жыве Беларусь», але яшчэ больш мянтоў і амапаўцаў. Адкуль яны толькі бяруцца? Як з мафіяй ваяваць, так іх няма, а як апазіцыю ціснуць – усе тут як тут. У аўтобусах – таксама АМАПаўцы. Сядзяць, чакаюць, гуляюць у карты, глядзяць на нас у вокны.

Мітынг пачынаецца. Каля нас бегае журналістка – яна была на мінулым мітынгу, і я яе разы два па «целіку» бачыў. Крычала нешта пра дэмакратыю і свабоду слова. Гадоў трыццаць, апранутая па фірме.

Два мянты, маёр і старлей, глядзяць на журналістку. Маёр кажа:

– І гэтая зноў тут... Чмошная, бля, вафлямі закіданая. Кожны раз чакае момант, каб залупнуцца. Думае, сука, што калі журналюга, то не кранем. Неяк завалаклі ў аўтобус, далі піздзы. Потым, праўда, смуроду столькі было – свабода слова, прэса, хуе-маё. Ледзь адбрахаліся.

– Яна замужам?

– Якое там замужам? Развялася. З такой сукай ні адзін мужык жыць не будзе.

– Так, і не кажы.

Журналістка падыходзіць да мяне.

– Добры дзень. Святлана Рабава, газета «Мінскі кур'ер». Можна задаць некалькі пытанняў?

– Так, вядома.

Яна дастае з сумкі дыктафон, суе мне пад нос, цісне на кнопку.

– Спачатку прадстаўся. Як цябе завуць, дзе ты вучышся або працуеш?

– Антановіч Сяргей. Вучуся на трэцім курсе БДУ, факультэт псіхалогіі.

– Скажы, чаму ты прыйшоў на сённяшнюю акцыю?

– Ну, як чаму? Каб выказаць свой пратэст супраць палітыкі кіруючага рэжыму. Ідзе збядненне народу, эканоміка загнівае, а чыноўнікі ўзбагачаюцца.

– А наколькі, па-твойму, такія вулічныя акцыі могуць быць эфектыўнымі ў барацьбе з рэжымам?

– Не вельмі эфектыўныя, таму што ходзіць мала людзей. Калі б хадзіла больш, то ўлада б нас баялася і што-небудзь рабіла. А так – прыслалі міліцыю і АМАП і могуць ні за што не хвалявацца.

– А як ты лічыш, чым тлумачыцца нізкая палітычная актыўнасць моладзі, студэнтаў?

– Ну, людзей цяпер мала цікавіць палітыка. Большасці трэба толькі грошай пабольш і забаўляцца, а на палітыку ім як бы... пакласці.

– А яны што, не бачаць сувязі паміж палітычнай сітуацыяй у краіне і ўзроўнем жыцця?

– Напэўна, не бачаць. Не ведаю.

– Добра, дзякуй.

Яна выключае дыктафон і сыходзіць. Я, здаецца, усё правільна сказаў. Хай бы ўставіла ў артыкул. Але калі газета трапіць да дэкана... Год таму выгналі траіх з МА за мітынгі – дык іх зараз у Прагу запрасілі вучыцца. Бясплатна. Пашанцавала хлопцам. Чэлы з іх патоку казалі – ім там яшчэ і бабкі плацяць, нармальныя прытым: на піва хапае.

Мітынг сканчаецца. Галоўныя апазіцыйныя палітыкі бачком выбіраюцца з натоўпу і сядаюць ў свае тачкі, каб зваліць, пакуль не пачалася якая-небудзь фігня. Частка народу таксама звальвае, акрамя самых актыўных, у тым ліку нас, студэнтаў. Хтосьці прапануе ісці на праспект і да плошчы Незалежнасці. Народ пабойваецца: па праспекце ісці не дазвалялі, а значыць, мянты маюць права ўсіх забраць. Ці адразу не забяруць, а пачакаюць, пакуль разыйдземся, і павяжуць па адным. Але гэта фігня. Гуляць так гуляць. Нас застаецца сотні дзве. Мы бярэмся за рукі, каб мянты не выдзіралі па адным, і ідзем да праспекта.

Мянты ідуць за намі і па баках, але маўчаць і нікога не чапаюць – значыць, не было загаду. Непадалёк – тыя самыя маёр і старлей. Аднекуль вылазіць Рабава, падвальвае да маёра.

– Добры дзень. Святлана Рабава, газета «Мінскі кур'ер». Дазвольце задаць некалькі пытанняў?

Мент адмахваецца.

– Адыдзі, не да цябе тут.

– Як гэта адыдзі? Як гэта не да мяне? Як ты размаўляеш, па-першае, з жанчынай, а, па-другое, з журналістам, асёл?

Некалькі нашых спыняюцца паглядзець, што будзе. Я таксама. Мы падыходзім бліжэй. Астатнія прытармож-ваюць, паварочваюць галовы.

– Ідзі лепш адсюль, а то зараз у машыну зацягнем – даведаешся, як правы качаць.

– Ды ты – вырадак, ведаеш ты гэта? – лямантуе журна-лістка. – Ты – бруд, абадранец, з табой ні адна нармальная жанчына не ляжа, ясна?

Маёр замахваецца на яе кулаком. Я падскокваю і б'ю яму нагой па яйцах. Ён прысядае, астатнія мянты кідаюцца на нас. Адбівацца няма чым – кіёў няма, і выламаць таксама няма чаго – ні пліткі, ні плота. Мы рвем ў двары. З аўто-бусаў ўжо выскокваюць амапаўцы з дубінкамі: дачакаліся, нарэшце, свайго часу. Сядзелі, сумавалі ў аўтобусах, а ця-пер можна памахаць дубінкай, зламаць каму-небудзь пару рэбраў.

На хаду бачу, як двое мянтоў схапілі Рабаву і цягнуць да аў-тобуса. Яна маша нагамі і рукамі, стараецца ў каго-небудзь трапіць. Так, не пашанцавала цётцы. Але ёй усё роўна нічога не будзе – пратрымаюць паўгадзіны і адпусцяць. А вось калі мяне павяжуць, то гэта дупа: адаб'юць ныркі і дадуць пяць сутак “за ўдзел у несанкцыянаваным мітынгу і супраціў міліцыі”.

Забягаю ў арку. Двор, машыны, гаражы. За мной – яшчэ некалькі нашых, ззаду – амапаўцы. Хаваюся за гаражамі.

Жудасна хочацца сраць – ад страху, зразумела. За гаражом ужо ляжаць дзве высахлыя кучы лайна. Я прыстрайваюся, каб у іх не наступіць, здымаю штаны. Будзе, вядома, прыкол, калі амапаўцы зазірнуць за гаражы і заўважаць мяне ў такім выглядзе.

У двары – шум, крыкі. Кагосьці малоцяць, ён лямантуе. Ад маёй кучы лайна падымаецца пара. Я выцягваю з кішэні ўлётку. Мы бралі іх у Саковіча з пятага курса і потым раскідвалі ў аўдыторыях. У мяне засталося штук дзесяць. Выціраю ўлёткай дупу, падцягваю штаны і ціхенька вызіраю з-за гаража.

Два амапаўцы накінуліся на лысага дзядзьку ў акулярах, са скуранай сумкай на плячы і лупяць дубінкамі па нырках. Дзядзька лямантуе, як рэзаны. Торба павольна саслізгвае з пляча на зямлю. Амапаўцы адцягваюць мужыка.

Больш у двары нікога. Чакаю яшчэ хвілін пяць і выходжу з-за гаражоў. Цямнее. Я падыходжу да торбы, зазіраю ўнутр. Дзве бутэлькі гарэлкі. І ўсё. Ніякіх дакументаў або папер, нічога. Можна забіраць і несці да чувака ў інтэрнат. Мы перамаглі!

## Сустрэча

Яна сядзіць насупраць мяне за столікам кавярні. Мы не бачыліся адзінаццаць гадоў – з лета 2000-га года. Яна бярэ кубак з кавай, падносіць да рота, робіць глыток. Ставіць кубак на столік. Пытаецца:

– Чаму ты вырашыў мяне знайсці?

Я пацепваю плячыма.

– Не, ну ўсё ж… Праз столькі гадоў… А калі б я была “вконтакте” не пад дзявочым прозвішчам?

– Ну, гэта злёгку спрасціла задачу. У цябе рэдкае прозвішча. Калі б на прозвішчы мужа – заняло б троху больш часу.

– А калі б я наогул не рэгістравалася там?

Я зноў пацепваю плячыма.

За суседнім столікам – два хлопцы і дзяўчына. Дзяўчына кажа:

– …Ён – сапраўдны кітаец, вучыўся тут і потым застаўся. І таму мы яго ўзялі мэнеджэрам па продажах – працаваць з Кітаем…

Я адпіваю каву, гляджу на яе. Кажу:

– Распавядзі пра сябе.

– Распавядаю. Нарадзілася ў горадзе Менску ў 1979-м годзе. Скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, журфак. Працую ў дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання канала АНТ. Замужам. Дачцэ дзевяць гадоў. Задавальняе? Ці ёсць па-

трэба ў дадатковай інфармацыі?

– Задавальняе.

– Ладна, выбачай… Ну, ты разумееш…

– Разумею.

Я паварочваю галаву. За шкляной перагародкай людзі ходзяць па гандлёвым цэнтры. У вітрыне абутковай крамы – стыкер: “распродаж 20% 30% 40%”.

Яна пытаецца:

– Колькі гадоў ты не быў у Менску?

– Гадоў шэсць таму быў праездам. А да гэтага не быў з самага выпуску. У мяне тут сваякоў няма, бацькі – у Гомелі. Сябры таксама ўсе раз'ехаліся. З нашага выпуску, дзевяноста дзявятага года мала, хто затрымаўся. Час быў змрочны, нікому заставацца не хацелася. Хто – у Амерыцы, хто – у Германіі, хто – у Маскве…

– У нас таксама некаторыя з'ехалі. Але многія і засталіся…

– Тут жыць увогуле таксама можна?

– Ну так… Ці гэта пытанне са шпількай?

– Проста пытаюся.

– А я адказваю: так, тут можна жыць. Гэта толькі з боку так здаецца: дыктатура, аўтарытарызм, і гэтак далей, і да таго падобнае. Ёсць, вядома, непрыемныя моманты, але дзе іх няма? Цябе што, у Маскве ўсё задавальняе?

– Не, шмат што не задавальняе.

– Ну вось. А жывеш жа? Так і тут. Не трэба толькі думаць, што тут засталіся адныя падонкі і дупалізы.

– Я так не думаю.

– Увогуле калі тут не жывеш, усё па-іншаму здаецца...

– Ну так. Што тут – рай зямны, а Лукашэнка – самы лепшы прэзідэнт...

– Ладна, хопіць кпіць. Я сур'ёзна табе кажу. У Расіі многія перакананыя, што ў Беларусі ўсё выдатна, што тут такі вось выбітны прэзідэнт, клапоціцца пра свой народ. Тут няма карупцыі, няма крыміналу ў такім маштабе, няма алігархаў. Затое звычайныя людзі жывуць добра... Калі б я не бываў у бацькоў у Гомелі часта, то, можа быць, сам бы ў гэта паверыў.

Яна глядзіць на мяне, усміхаецца, бярэ кубак, дапівае каву. Пытаецца:

– Ты не шкадуеш, што з'ехаў?

– Абсалютна. Хоць мне і не было чаго губляць. Дыплом псіхфака, ніякіх перспектыў, няма нават менскай прапіскі, ды яшчэ поўны “савок” ва ўсім. Так, спачатку ўсё было жорстка. Флаеры раздаваў, аб'явы расклейваў. Пакуль не трапіў у часопіс – спачатку кур'ерам, потым журналістам. Дарэчы, ніколі не думаў, што мы з табой калі-небудзь будзем калегамі, так бы мовіць...

– Ты ў Менск проста так прыехаў?

– Афіцыйна – працаваць над артыкулам пра эканамічны крызіс. Неафіцыйна – каб убачыць цябе.

– Хопіць, перастань... Ты, як і раней, спрабуеш мяне шакаваць. Толькі цяпер у гэтым няма ніякага сэнсу, – яна перасоўвае па стале пусты кубак. – Ну і што, пабачыў прыкметы крызісу?

– Не-а. Суцэльная “тишь, гладь и благодать”. Усе ўсім задаволеныя, усміхаюцца. Па вуліцах катаюцца дарагія тачкі...

– Усе, хто мог, стараліся купіць новую машыну, пакуль мыты не павялічыліся... Мы таксама...

– Ну, я ж кажу – у вас тут сапраўдны сацыялізм. Быў, прынамсі, да нядаўняга часу. Кватэры можна было набыць у іпатэку па нейкай смешнай стаўцы... Вы набылі? Ці не было неабходнасці?

– Так, набылі.

– Малайцы, віншую.

– А ў цябе жыллё сваё ёсць у Маскве?

– Хата ў вёсцы. У Цвярской вобласці.

– Навошта яна табе?

– Як – навошта? Я там прапісаны. Прапіска ж дагэтуль патрэбная, ніхто яе не адмяняў, нягледзячы на ўсе размовы. А ў Маскве здымаю кватэру.

– Дорага плаціш?

– Дорага.

Я дапіваю каву, падношу кубак да твару, гляджу на яе праз

ручку. Пытаюся:

– У цябе яшчэ ёсць час? Можам прагуляцца…

– Па старых месцах?

– Па старых месцах.

*

Мы выходзім з падземнага перахода на плошчу.

– Як цяпер гэтая плошча называецца? З гэтымі ўсімі перайменаваннямі я заблытаўся…

– Так і называецца. Незалежнасці.

– А праспект?

– Таксама Незалежнасці.

– Выдатна. Адна суцэльная незалежнасць. Самая незалежная краіна ў свеце.

Ідзем у бок паштамта. Яна пытаецца:

– Як табе цяперашні Менск?

– Змяніўся. У лепшы бок. Цэнтральная частка – проста цукерка. Разумею масквічоў і іншых расіянаў, якія прыедуць на ўікэнд, патусуюцца ў цэнтры і больш нічога не бачаць. Дадатковыя ачкі на карысць рэжыму.

– Добра, хопіць пра гэта. Хопіць пра палітыку.

– Добра. Тым больш кажы, не кажы – нічога ўсё адно не зменіцца. Ні тут, ні ў Расіі.

*

Я ўзнімаю куфаль піва. Мы чокаемся. Я кажу:

– Памятаеш, тут і тады, адзінаццаць гадоў таму, была кавярня з верандай... Дакладней, дванаццаць. І мы таксама з табой пілі піва...

– Памятаю. Толькі куфлі былі пластыкавымі.

– Сапраўды.

Яна адпівае, ставіць куфаль на драўляны стол. Глядзіць на мяне.

– Няўжо табе гэта было патрэбна?

– Што?

– Ну, варушыць, як кажуць, старое. Корпацца ў мінулым... А калі мне гэтага не хочацца, калі мне гэта цяжка?

– Тады б ты проста адмовілася сустрэцца. І не адказала б “вконтакте”. Хіба не?

Яна паціскае плячамі. Кажа:

– Ведаеш, усё гэта так дзіўна. Цяпер, калі цябе бачу, я, як бы гэта сказаць... разумею, што прайшло столькі гадоў. І мне неяк сумна...

– Сумна таму, што калісьці ўсё магло быць па-іншаму?

– Не. Таму, што прайшло столькі гадоў, што ўсё гэта недзе далёка. Юнацтва недзе далёка... Не ведаю...

Яна бярэ куфаль, робіць доўгі глыток.

– Ты выходзіла на плошчу? У сэнсе дзевятнаццатага снежня, пасля выбараў. Тады ж шмат народу выйшла. Як я разумею, і тыя, каго ўсё ў прынцыпе задавальняла. Але проста надакучыла. Ці не?

– Увогуле, так. Але я не выходзіла. І наогул, ведаеш што? Я зараз табе штосьці скажу і ты, магчыма, пачнеш мяне ненавідзець... – яна глядзіць на мяне. – Я на выбарах галасавала за Лукашэнку. Проста таму, што хочацца стабільнасці. У мяне дачка... Ты разумееш, што калі б ён сышоў, пачалася б сапраўдная ломка ўсяго, усёй сістэмы... Я гэтага ўжо не хачу. Я разумею, што, відаць, станаўлюся старой, ці як гэта патлумачыць, але... Увогуле, ты разумееш...

– Разумею...

Міма па вуліцы праязджае трамвай. Афіцыянтка падыходзіць да суседняга стала, здымае з падноса тры куфлі піва, ставіць на стол, сыходзіць.

Я пытаюся:

– А калі б я прапанаваў табе сысці да мяне – кінуць мужа, узяць дзіця і пераехаць да мяне ў Маскву, ты б гэта зрабіла?

– Ну вось, ты зноў за сваё. Усё спрабуеш мяне вывесці з сябе... Добра, мне трэба ісці, – яна пачынае корпацца ў торбе, дастае гаманец. Я кажу:

– Схавай, ты што?

Яна засоўвае гаманец зноў у торбу, зашпільвае маланку. Устае.

– Ну, карацей, рада была пабачыцца... Праз столькі гадоў... Пакуль.

– Пакуль.

Яна сыходзіць. Я гляджу ўслед. Тры хлопцы за суседнім сталом расслаблена пацягваюць піва. Па вуліцы праязджае трамвай.